№ 14 (420) 15 красавіка 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Пётар Марцаў**

«Да канца году зачыняць усіх».

старонка 3

**Аляксандар Казулін**

«Жыве Беларусь!»

старонка 2

**Лявон Вольскі**

Амэрыка — неабжыты край.

старонка 9

СТЫЛЬ ЖЫЦЬЦЯ

**Блогі**

Калісь дзёньнікі заводзілі, каб іх ніхто ня ўбачыў. Цяпер іх заводзяць, каб убачылі ўсе. У сеціве існуе ўжо не адна сотня беларускіх інтэрнэт-дзёньнікаў, па-ангельску — блогаў. **Старонка 13.**

ХРОНІКА

**Зубрыяда**

У Барысаве найлепшых вызначалі ў такіх конкурсах, як раздача газэт, расклейка ўлётак, маляваньне графіці, вывешваньне сьцягоў. Гэта ня жарты. **Старонка 6.**

З УСІХ СТАРОН

**Ня рвіцеся ў рэвалюцыю**

Харызматычныя лідэры добрыя тады, калі ёсьць посьпех. Гутарка з прэзыдэнтам украінскай піяр-асацыяцыі Георгіем Пачапцовым. **Старонка 10.**

ПРА-СЬВЕТ

**Мама, мама і я — швэдзкая сям'я**

Сучасная Швэцыя: раўнапраўе палоў і бэбі-бум. **Старонка 11.**

ГІСТОРЫЯ

**«Нацыянал-камунізм грунтаваўся на пяску»**

Тацяна Працька палемізуе з Алесем Аркушам і Анатолем Сідарэвічам. **Старонка 15.**

БІБЛІЯТЭКА

**Манэргейм**

Генэрал, які ўратаваў незалежнасьць. **Старонка 8.**

# Завадзкі: новая справа



PHOTO.BYMEDIA.NET

Старонка 2

# Белпоп: мутацыі голасу

У суботу на Кастрычніцкай было тлумна. Па ўсёй плошчы — АМОН і моладзь. Толькі моладзь гэтым разам нічога не скандавала, а ў міліцыянтаў былі вясёлыя твары. Асноўная маса народу сабралася ля Палацу прафсаюзаў. Міма крочыць кабета сталага веку: «Куды стаіцё?» — «Тут наш «Народны артыст» праходзіць, сьпевакоў выбіраюць!» — хорам адказваюць дзьве дзяўчынкі гадоў шаснаццаці — у іх кароценькія спаднічкі, старанна адпрасаваныя кашулі, акуратна ўкладзеныя гелем валасы. Яны прыйшлі, каб скарыць журы тэлепраекту «Зорны дыліжанс» і трапіць у беларускі шоў-бізнэс.

**Тэрмас, гітара і тэлефон**

Аднаго жаданьня мала. Варта яшчэ мець добрую долю нахабства і быць цярплівым. Каб трапіць на праслухоўваньне, трэба адстаяць у чарзе некалькі гадзін. Калі пашанцуе і трапіш на менскі фінал (ён праходзіць у гэты ж дзень), у чаргу становішся па новай. Наступны дзень — тамсама зьбіраюцца фіналісты з усіх абласьцей.

**Працяг на старонцы 12.**

**Дык падпісвайся!**

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску на «НН» прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

# Завадзкі: новая справа

Сьледчы Бранчэль: будзем шукаць падсьнежніка. Павал Шарамет: справу Завадзкага хочуць павесіць на банду крымінальнікаў. Сьвятлана Завадзкая: Я выключаю толькі тое, што хтосьці рэальна хоча некага знайсьці.

Пракуратура Рэспублікі Беларусі аднавіла расьсьледаваньне па справе зьніклага апэратара ОРТ Зьмітра Завадзкага. Маці журналіста Вольга Завадзкая атрымала дакумэнт, дзе зазначаецца, што расьсьледаваньне адноўлена 4 красавіка ў сувязі зь неабходнасьцю «правядзеньня сьледчых дзеяньняў» па гэтай справе.

Спадарыня Вольга ня верыць у тое, што зьявілася новая інфармацыя ў лёсе сына. Справа, хутчэй за ўсё, адноўлена «для птушачкі», кажа яна. Жонка зьніклага журналіста Сьвятлана ў сваю чаргу лічыць, што аднаўленьне расьсьледаваньня зьвязана з рэзалюцыяй па Беларусі, якая будзе разглядацца найбліжэйшым часам на сэсіі камісіі ААН па правах чалавека. «Спадар Бранчэль, які ўзначальвае сьледчую групу, сказаў мне: «Сьнег сышоў, мы пашукаем». Таксама ён паведаміў, што будзе прызначаны новы сьледчы, які паглядзіць на справу «сьвежым вокам». Справа распачатая для таго, каб сталая беларуская місія ў ААН у Жэнэве магла б хоць якнебудзь давесьці, што расьсьледаваньне вядзецца. Такая ж самая сытуацыя была ў студзені 2003 г., калі павінна было праводзіцца папярэдняе слуханьне па дакладзе Пургурыдзэса. Яны думалі, што, распачаўшы справу, змусяць яго зьмякчыць свой даклад».

У самой пракуратуры ад камэнтароў адмаўляюцца.

Журналіст зьнік 7 ліпеня 2000 г. У гэты дзень ён мусіў сустрэць у Нацыянальным аэрапорце «Менск» свайго калегу Паўла Шарамета. Аднак на аўтастаянцы быў знойдзены толькі аўтамабіль Зьмітра.

14 сакавіка 2002 г. суд прызнаў былых спэцназаўцаў Валера Ігнатовіча і Максіма Маліка вінаватымі ў выкраданьні журналіста, прысудзіўшы іх да вялікіх тэрмінаў зьняволеньня. Паводле афіцыйнай вэрсіі прычынай выкраданьня была помста: журналіст агучыў інфармацыю, згодна зь якой Ігнатовіч ваяваў у Чачэніі на баку паўстанцаў. Супрацоўнікі ОРТ заняліся незалежным расьсьледаваньнем, а 1 сьнежня 2003 г. Зьміцер Завадзкі судом Фрунзэнскага раёну Менску быў прызнаны памерлым.

20 ліпеня 2004 году Аляксандар Лукашэнка падчас прэс-канфэрэнцыі заявіў, што ў справе Завадзкага ёсьць некаторыя дакумэнты, якія, калі іх абнародаваць,ператвораць «справу» ў «антысправу». 4 жніўня маці журналіста накіравала ў пракуратуру заяву з патрабаваньнем аднавіць справу «па зноў адкрытых абставінах» і дапытаць А.Лукашэнку ў якасьці сьведкі.

Павал Шарамет у інтэрвію «Газеце.ру» мяркуе, што справу Завадзкага маглі зноў адчыніць і для таго, каб павесіць усе палітычныя забойствы на банду крымінальнікаў, якую сёлета злавілі ў Гомелі. «Можа быць, — кажа жонка зьніклага тэлеапэратара. — Я не выключаю любыя варыянты гэтага фарсу. Я выключаю толькі тое, што хтосьці рэальна хоча некага знайсьці».

**АК**




# Выбралі з аднаго

Сацыял-дэмакраты аб'ядналіся, выбраўшы лідэрам Аляксандра Казуліна.

Як і першая, другая спроба аб'яднаньня сацыял-дэмакратаў пачалася ў Менску на станцыі Дружная. Аўтобус, на якім дэлегаты меліся ехаць на месца зьезду, не зьявіўся, таму быў дадзены сыгнал ехаць на мэтро, не прыцягваючы да сябе залішняй увагі. Уся грамада дабралася да станцыі мэтро «Пушкінская» на захадзе сталіцы, а адтуль на 25 таксоўках паехала ўскладаць кветкі да мэмарыялу ў Трасьцянцы. Адтуль — у Сеньніцу, вёску на самым ускрайку гораду. Лявон Дзейка, прэс-сакратар «Народнай грамады», сустракаў журналістаў, паказваючы на свае запыленыя чаравікі: «Во, паглядзіце на боты! Нібы Майсей у пустыні».

У Дом культуры дэлегатаў не пусьцілі — дзьверы зачыненыя, дырэктар зьнік. Таму зьезд распачаўся літаральна на прыступках. Пакрысе сябры БСДП (НГ) разьмеркаваліся па ўсім пляцы, а дэлегаты ад БСДГ скучкаваліся ля правага крыла ДК. Гэты, шосты па ліку, зьезд стаўся для партыі апошнім — пасьля адхіленьня Станіслава Шушкевіча ад пасады кіраўніка БСДГ партыя самаліквідавалася. Сам Шушкевіч на зьезьдзе не прысутнічаў і ягоных рашэньняў не прызнаў. «А цяпер усе — на аб'яднаўчы сход!» — заклікаў намесьнік старшыні Аляксей Кароль.

Аляксандар Казулін, у непрыметных крэмавых джынсах ды просьценькай курткачы, то зьнікаў, то зьяўляўся, магнэтызуючы сваёй прысутнасьцю сацыял-дэмакратаў. «Дык нічога ж не адбываецца! Людзі адпачываюць!» — пераконваў ён ахоўнікаў парадку, якія нэрвова сачылі за натоўпам. У гэты час лідэры абласных суполак спрытна прымалі заявы былых бэсдэгоўцаў на пераход у БСДП (НГ). Новая аб'яднаная партыя, утвораная пасьля пераходу, будзе мець назву БСДП («Грамада»).

Нарэшце, падліковая камісія пачала выдаваць бюлетэні для выбараў старшыні. Адзін радок, адно прозьвішча, «за» ці «супраць». Некаторыя абласныя лідэры яшчэ ня скончылі атрымліваць бюлетэні, а побач ужо распачалося галасаваньне. Дэлегаты апускалі складзеныя ўдвая папяровыя стужачкі ў вялікую кардонную скрыню з-пад вафэльных тартоў.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**САМЫ ПІЛЬНЫ ПАЛІТЫК. Калі сацыял-дэмакраты спрабавалі яднацца першы раз, Аляксандар Казулін выкрыў замаскаванага міліцыянта. Гэтым разам ад яго ня змог схавацца апэратар БТ.**

Вынік: са 160 бюлетэняў «за» — 143, «супраць» — 12, несапраўдных — 5. «Вялікі дзякуй! — зьвярнуўся да новааб'яднаных дэмакратаў іх новаабраны лідэр. — Я магу вам толькі сказаць, што супраць адзінства ніхто нідзе нічога ня зможа зрабіць. І ў нас з вамі іншых мэтаў няма — толькі наша любімая дарагая Беларусь. А сонейка ўжо сьвеціць. Вышэйшыя сілы нам дапамагаюць. Супраць сонца, сьвятла змрок бясьсільны. Толькі наперад! Жыве Беларусь!» «Жыве!» — радасна адказала грамада, якая даўно чакала гэтага моманту, стоячы пад ветрам ды даволі пахмурным небам.

«Бачыце, не аднагалосна, але абсалютнай большасьцю Казулін стаў лідэрам — тым лідэрам, якога сапраўды баіцца Лукашэнка, баіцца шалёна, — кажа дасьведчаны сацыял-дэмакрат Павал Знавец. — Я задаволены вынікамі галасаваньня. А далей час пакажа».

Праўда, не пакідае ўражаньне, што дзесьці нешта падобнае ўжо было… Ну так — падчас абраньня Казуліна рэктарам БДУ Аб'яднаным саветам унівэрсытэту ў 2000 г. Там таксама былі бюлетэні з адным прозьвішчам, і таксама была перамога Казуліна. Ні тады, ні цяпер ахвотнікаў супернічаць не было.

**Алесь Кудрыцкі**

# Рэдактар «БДГ»: «Газэты паміраюць не тады, калі іх зачыняюць, а калі іх больш не чытаюць і ня робяць»

Пётар Марцаў: Каб зьнішчыць газэту, трэба зьнішчыць яе аўдыторыю. У выпадку з «БДГ» зрабіць гэта будзе цяжка: ня будуць жа чыноўнікі самі сябе зьнішчаць.

**«НН»: Як Вы можаце патлумачыць такі шалёны наступ на недзяржаўную прэсу ды «трэці сэктар»?**

**Пётар Марцаў:** На маю думку, два гады таму была пастаўлена задача канчаткова зачысьціць інфармацыйную прастору. За гэты час была паралізаваная дзейнасьць многіх газэтаў. Было канчаткова адрэгуляванае права мэдыяў друкавацца на тэрыторыі Беларусі. Цяпер друкарня любой формы ўласнасьці можа прыняць да друку недзяржаўную газэту толькі пасьля ўзгадненьня з адпаведнымі ідэалягічнымі структурамі. Манапалізаваны распаўсюд мэдыяў — цяпер для гэтага патрэбна мець ліцэнзію.

Калі казаць пра «БДГ», дык нам забаронена друкавацца на тэрыторыі краіны, забаронена распаўсюджваць газэту церазь «Белсаюздрук» ды «Белпошту». Ужо і ад звычайных крамаў патрабуюць узгадняць з уладамі свой асартымэнт і адмаўляцца браць на продаж «БДГ». Усё гэта ставіць любое выдавецкае прадпрыемства ва ўмовы, калі працаваць немагчыма. Суды ідуць толькі як дадатак да ўсіх папярэдніх захадаў.

**«НН»: Ваш прагноз на будучыню?**

**ПМ:** Ідзе канвэртацыя ўлады з напаўдэмакратычнай у аўтарытарную. Я ведаю, што сёлета пастаўлена задача зачыніць тыя недзяржаўныя выданьні, якія яшчэ засталіся.

**«НН»: А ці не страляе дзяржава з гарматы па вераб'ях? Нашто зьнішчаць незалежныя мэдыі, якія і так ледзьве могуць дыхаць пад яе прэсам?**

**ПМ:** А які сэнс у тым, каб дазваляць ім існаваць? Гэта такая псыхалягічная пастка: мы такія маленькія, нас ніхто не чытае, навошта нас душыць. Але чытаюць! Ніхто ня можа дакладна сказаць, колькі людзей чытае тую ці іншую недзяржаўную газэту. Наклад зусім не зьяўляецца паказчыкам. Урэшце, можа, вас ніхто і не чытае – але ж *яны* чытаюць! І як ім «па доўгу службы» чытаць кожны дзень праўду? Ёсьць лёгіка любога аўтарытарнага рэжыму. Які сэнс пасьля рэфэрэндуму рабіць выгляд, што ты дэмакратычны? Ніякага.

**«НН»: Два гады таму мне даводзілася чуць, як Вы пакеплівалі з жаданьня асобных энтузіястаў выпускаць нерэгістраваныя выданьні замест рэгістраваных. Ці не разглядаеце цяпер Вы самі магчымасьць нейкага, так сказаць, альтэрнатыўнага выхаду?**

**ПМ:** Я нармальна стаўлюся да ўсіх мэдыяў, але трэба захоўваць чыстату жанру. Калі ёсьць магчымасьць набываць легальныя выданьні, то наўрад ці людзі будуць чытаць нелегальныя газэты. Напэўна, каб яны зьвярнулі ўвагу на падпольную прэсу, патрэбная абсалютна поўная інфармацыйная блякада. Цяпер усё часьцей праводзяць аналёгію з Польшчай 1980-х. Але ўзгадайце: там вольных мэдыяў сапраўды не было. Цяпер сытуацыя з каналамі распаўсюду інфармацыі нашмат лепшая. Я ня ўпэўнены, ці прыйшоў ужо час падпольнай прэсы. Так, падпольныя выданьні могуць і зараз існаваць, але не як крыніца інфармацыі, а як яе інтэрпрэтатар. Гэта можа быць прэса жанравая, крэатыўная, напрыклад — сатырычная. Дый «БДГ» ж не зачынілі яшчэ, што вы па нас заўчасна хаўтуры спраўляеце?

**«НН»: А ці няма ў Вас у кішэні запасной газэты?**

**ПМ:** Нашто мне яна? У 2003 г., калі нас прыпынілі на тры месяцы, мы пачалі друкаваць макет «БДГ» пад шапкамі іншых газэтаў. Думаеце, гэта некага ўвяло ў зман? Усе выдатна ведалі, што чытаюць менавіта «БДГ», а ня іншае выданьне.

**«НН»: Суд жа адбыўся, што цяпер рабіць?**

**ПМ:** Журналістам трэба будзе глыбей раскапаць гэтую гісторыю. Мы пісалі не пра Мара, мы пісалі пра дрэнны піяр. Мар быў толькі ўзгаданы як пэрсанаж. Можа быць, гэта было няправільна, магчыма, трэба было адразу падрабязна распавесьці пра гэтага чалавека, каб не даваць яму магчымасьці судзіцца з намі. Задача журналістаў — скончыць гэтае дасьледаваньне, чым яны цяпер і займаюцца. Але каб ня гэтая гісторыя, дык знайшлася б іншая.

**«НН»: Значыцца, лёс газэты быў прадвызначаны?**

**ПМ:** Заўважце: я не сказаў, што газэту зачыняць. Яе хочуць зачыніць, але гэта ня тое самае. У газэтаў высокая здольнасьць супраціўляцца. І «БДГ», і «Народная Воля», і «Наша Ніва» — усё гэта стойкія алавяныя салдацікі. Вось, напрыклад, мы: друкавацца нельга, распаўсюджваць газэту нельга — у нармальнай сытуацыі я б сказаў: сьмерць газэце. Але яна жыве! Газэты паміраюць не тады, калі іх зачыняюць, а калі іх больш не чытаюць і ня робяць. Калі ёсьць тыя, хто хоча газэту чытаць — гэта ўжо 50% справы, калі ёсьць тыя, хто мае жаданьне яе рабіць — гэта ўжо 100%. Астатняе можна прыдумаць. Каб зьнішчыць газэту, трэба зьнішчыць яе аўдыторыю. У выпадку з «БДГ» зрабіць гэта будзе цяжка: ня будуць жа чыноўнікі самі сябе зьнішчаць.

**«НН»: Што Вы можаце сказаць пра намеры ліквідаваць НІСЭПД?**

**ПМ:** Не зусім правільна казаць толькі пра тыя праблемы, якія маюць цяпер мэдыі. Паралельна з гэтым ідзе ціск на ўсё астатняе грамадзтва. Ужо разабраліся з адукацыяй, з палітычнымі партыямі, разьбіраюцца з навуковымі інстытутамі, сацыялягічнымі лябараторыямі. 2004 г. паказаў, што можна рабіць паралельныя дасьледаваньні. Ідзе масавая зачыстка. Проста ў дачыненьні да мэдыяў усё адбываецца больш ярка.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**




**Пётар Марцаў: Які сэнс пасьля рэфэрэндуму рабіць выгляд, што ты дэмакратычны? Ніякага.**

Гайдукевіч хоча спагнаць з «Народнай волі» 200 мільёнаў рублёў, у «Згоды» канфіскаванае абсталяваньне, Міністэрства юстыцыі падало ў Вярхоўны суд пазоў на ліквідацыю найбуйнейшага сацыялягічнага інстытуту НІСЭПД. Нарэшце, суд пастанавіў спагнаць з УП «Марат» ды Ірыны Халіп 60 мільёнаў рублёў на карысьць рэдактара «Русской Америки» Аркадзя Мара. Гэта спроба «канчатковага вырашэньня пытаньня незалежнага грамадзтва». Ці выстаіць грамадзтва? На пытаньні карэспандэнта «НН» адказвае Пётар Марцаў, галоўны рэдактар «Белорусской деловой газеты».

Журналістка «БДГ» Ірына Халіп і выдавец газэты, прыватнае ўнітарнае выдавецтва «Марат» прызнаны вінаватымі ў зьнявазе гонару і годнасьці грамадзяніна ЗША Аркадзя Мара — рэдактара «Русской Америки». Падстава — выказваньні, што ўтрымліваліся ў артыкуле карэспандэнткі «Ў Аклахоме так і не дазнаюцца пра Лукашэнку». Ірына Халіп мае выплаціць А.Мару кампэнсацыю ў памеры 10 млн руб. (каля $4,5 тыс.), а УП «Марат» — 50 млн руб. (каля $23 тыс.). Пазоўшчык патрабаваў суму кампэнсацыі ў памеры аднаго мільёна даляраў.

## СЬЦІСЛА

### Менск вылучыў чатырох прэтэндэнтаў

Увечары 13 красавіка на сядзібе БНФ прайшла Менская канфэрэнцыя прадстаўнікоў дэмсілаў. Абіралі прэтэндэнта на адзінага кандыдата на выбары-2006. Уладзімеру Коласу прапанавалі згадзіцца з умовамі пагадненьня аб супрацы, якія падпісалі С.Калякін, А.Лябедзька, А.Мілінкевіч і С.Шушкевіч. У.Колас «быў не гатовы», і яго не ўключылі ў сьпіс прэтэндэнтаў. Усіх чатырох падпісантаў вылучылі ў «наступны тур». Найбольш галасоў (61 з 73) набраў С.Калякін. Мілінкевіч — найменш (51 голас).

### Лёгкі абвяргае Фэльгенгаўэра

Кіраўнік прэс-службы прэзыдэнта Павал Лёгкі абверг выказваньні маскоўскага аналітыка Паўла Фэльгенгаўэра пра магчымую дамоўленасьць А.Лукашэнкі і У.Пуціна наконт аб'яднаньня Беларусі і Расеі — з мэтай супрацьстаяньня аксамітавым рэвалюцыям. «На прэс-канфэрэнцыі пасьля сочынскай сустрэчы прэзыдэнты вычарпальна распавялі, аб чым ішла гутарка, і пра падобныя праекты ці пражэкты размова наагул не вялася», — рэзюмаваў сп.Лёгкі.

### Чарнобыльскі шлях – 2005

Шэсьця 26 красавіка ня будзе. Замест яго аргкамітэт «Чарнобыльскага шляху» падрыхтаваў тысячу асобнікаў заявы-звароту да прэзыдэнта, у якой патрабуецца спыніць вытворчасьць сельгаспрадукцыі на забруджаных тэрыторыях, скасаваць абмежаваньне на вываз дзяцей за мяжу для аздараўленьня і адмяніць прымусовае разьмеркаваньне студэнтаў у чарнобыльскія раёны. Аргкамітэт заклікае людзей прынесьці заявы а 18-й на вул.Маркса, 38 ды ўкінуць у скрыні для зваротаў грамадзян. Плянуецца таксама мітынг ля Чарнобыльскай капліцы ў раёне вул.Карастаянавай.

### Рэформа ААН

Дэлегацыя Беларусі прадставіць сваё бачаньне рэфармаваньня Рады Бясьпекі ААН. Прапануецца захаваць у ААН Усходнеэўрапейскую групу дзяржаў і выдзеліць ёй дадатковае месца непастаяннага чальца ў Радзе Бясьпекі. Айчынны МЗС падкрэсьлівае, што беларуская схема засноўваецца на ўзгодненай пазыцыі краін-удзельніц Руху недалучэньня аб неабходнасьці пашырэньня Рады бясьпекі з 15 да 26 сяброў.

### «Газпром» пагадзіўся

Пастаўка расейскага газу ў Беларусь і яго транзыт цераз тэрыторыю краіны ў 2006 г. будзе адпавядаць сёлетнім умовам. Аб гэтым дамовіліся ў Маскве гендырэктар «Белтрансгазу» Дзьмітры Казакоў і старшыня праўленьня АТ «Газпром» Аляксей Мілер.

**АГ, БелаПАН, interfax.by, svaboda.org**

# Жэнэўскі тупік, або Страсьці ў кулюарах ААН на тле альпійскага краявіду

Афіцыйная дэлегацыя пільна сачыла за ўсімі кантактамі беларускіх праваабаронцаў, але ніхто зь яе нават не падышоў да суайчыньнікаў. Нават тут, удалечыні ад Менску, адчувалася стаўленьне лукашэнкаўскіх чыноўнікаў да ўсіх іншадумцаў як да ворагаў, зь якімі побач нават стаяць небясьпечна. — **Віталь Тарас** з Жэнэвы.

## Мяжа на замку

У аэрапорце Жэнэвы шукалі бомбу. Паліцыянты жэстамі паказвалі, што далей ісьці нельга, і ачаплялі памяшканьне стракатай стужкай — квадрат за квадратам, выціскаючы натоўп. Паводзілі яны сябе бесцырымонна, нічога не тлумачачы і не ўступаючы ў размовы з пасажырамі. Пасажыры напаўголасу абураліся й спрабавалі ўгадаць, ці пасьпеюць яны патрапіць на свой рэйс. Я, хоць і прыбыў у порт задоўга да вылету, таксама хваляваўся, бо бачыў даўжэзныя чэргі на рэгістрацыю. І тут праз гучную сувязь чую аб'яву — пасажыры швайцарскіх авіяліній могуць прайсьці на пасадку праз францускі сэктар аэрапорту. Паколькі я ляцеў самалётам швайцарскай авіякампаніі церазь Цюрых, вырашыў скарыстаць сытуацыю. Памежнік на пашпартным кантролі нават не паглядзеў дакумэнтаў, толькі зірнуў на квіток ды махнуў рукой, паказваючы, куды ісьці. На свой «гейт» я прыйшоў першым…

Такім чынам мне ўдалося ступіць на тэрыторыю Францыі, не выходзячы са швайцарскага аэрапорту. І гэта не адзіны выпадак.

Вывучаючы турыстычную мапу, я зьвярнуў увагу на рэкляму мястэчка Салеў у прыгарадзе Жэнэвы і вырашыў туды зьезьдзіць. Аўтобус едзе туды з цэнтральнага вакзалу Карнавін хвілін дваццаць. Ад канцавога прыпынку — яшчэ хвілін дзесяць пешкі да месца, дзе знаходзіцца «тэлефэрык». Так на францускі манер завецца канатная дарога. З аглядная пляцоўкі на вышыні 1080 мэтраў адкрываецца маляўнічая панарама Жэнэвы з возерам, а з другога — манумэнтальны від на славуты Манблян. (У сонечны дзень ён добра відаць і ў цэнтры гораду.)

Паблукаўшы крыху па горных камяністых сьцежках, пазьбіраўшы пралескі — акурат такія растуць на Лысай гары пад Менскам — ды адчуўшы сябе на хвіліну ў ролі Леніна ў выгнаньні, я пасьпяшаўся назад. І толькі вяртаючыся на аўтобусны прыпынак, прыгледзеўся ўважліва да дзіўнаватай, казённага выгляду будыніны са шкла й бэтону ля шашы. Гэта быў КПП — інакш кажучы, пункт пропуску на швайцарска-французкай мяжы. Праўда, будынак быў зачынены на замок…Так бы мовіць, мяжа на замку. Магчыма, увесну, калі сьнег застаецца толькі на альпійскіх вяршынях, а паўсюль на газонах цьвітуць стакроткі, тутэйшыя памежнікі адпраўляюцца куды-небудзь у адпачынак.

Не гістарычны цэнтар з саборам Сьвятога Пятра, зусім сьціплы паводле плошчы, а менавіта возера зьяўляецца геаграфічным, культурным ды сэнсавым цэнтрам Жэнэвы.

## Кальвін, Русо і флямінга

Глядзячы на гіганцкі ўтульны парк адпачынку, якім ёсьць на сёньня Жэнэва, цяжка ўявіць, што тут некалі Жан Кальвін закладаў рэфармацкі рух. Палымяны аскет-пратэстант Кальвін, калі б мог устаць з магілы і паглядзець навокал, моцна б зьдзівіўся. І яшчэ больш быў бы азадачаны, каб нехта сказаў яму, што ўбачанае — вынік Рэфармацыі, якая дала штуршок эўрапейскай цывілізацыі на шмат вякоў наперад. Шматлікія банкі, гатэлі й крамы на кожным кроку ён яшчэ мог бы зразумець. Але дух вольнасьці, бестурботнасьці й спакою нібы разьлітыя на гарадзкіх вуліцах напалам з водарам квітнеючых вішняў і рададэндронаў — хто яго ведае. Ці настолькі ён быў пурытанінам, каб не захапіцца?..

Мушу прызнаць, некаторыя рэчы становяцца адкрыцьцём. Уразіў той факт, што Жэнэўскае возера мае працяг у выглядзе ракі Роны — той легендарнай Роны, якую Ганібал фарсаваў на сланах на шляху з Галіі ў Рым. Бурлівыя воды ракі зусім не падобныя да водаў лагоднага пад вясновым сонцам возера.

Мяркуючы па вялікай колькасьці розных вадаплаўных птушак, вада ў возеры досыць чыстая, хоць і не празрыстая. Акрамя звыклых лебедзяў, чаек ды качак розных відаў, у батанічным садзе ля берагу возера можна ўбачыць ружовых флямінга. Канкурэнцыю чайкам складаюць арлы, іх тут процьма. Яны харчуюцца рыбай, а гняздуюцца на дрэвах у парках. Каля вады — надпісы з просьбай карміць птушак без залішняга фанатызму — ежы ў прыродным асяродзьдзі ім і так хапае, а дадатковае сьмецьце нікому не патрэбнае.

Швайцарцы вельмі заклапочаныя экалёгіяй. Улетку ў лясах тут паўсюдна забаронена паліць кастры й шумець пасьля дзявятай вечара — у гэты час кладуцца спаць мурашкі.

Францускі філёзаф Жан Жак Русо, які жыў у Жэнэве ў выгнаньні ды стаў яе ганаровым грамадзянінам, быў, можна сказаць, папярэднікам цяперашніх «зялёных». Ён першы загаварыў пра небясьпеку тэхнагеннай цывілізацыі для чалавечай маралі. Выспа паміж Ронай і Жэнэўскім возерам, на якой Русо некалі любіў бавіць час у самоце, названая яго імем. Тут, побач з папулярным у турыстаў рэстаранам, стаіць бронзавы бюст філёзафа, які ледзь прыметна іранічна ўсьміхаецца, пазіраючы на запоўненую транспартам і натоўпам грамадзян набярэжную ды мост Манблян.

Жэнэва, зацісьнутая з усіх бакоў Францыяй, — францускае места. Па-першае, тут размаўляюць па-французску. Адчуваецца францускі ўплыў і ў архітэктуры, манерах паводзінаў жыхароў. Кожны другі мінак на вуліцы з табой павітаецца нараспеў: «Банжу-ур». Гэтак прынята вітацца зь незнаёмымі ў беларускай вёсцы… Магчыма, галянтныя манеры сьведчаць аб нейкай долі правінцыялізму. Але яны вельмі пасуюць гэтаму някідкаму, некрыклівама, сьціпламу ў сваёй прыгажосьці месту.

Пры канцы красавіка ў Швайцарыі адбудзецца чарговая сэрыя нацыянальных і мясцовых рэфэрэндумаў (яны праводзяцца штогод, калі не часьцей). Пытаньні — самыя розныя: ад лёсу Жэнэўскага стадыёну да праблемы, ці даваць права голасу неграмадзянам Швайцарыі.



Мяккасьць беларускага дакладу Севярына, які пакідае кіраўніцтву Беларусі свайго роду апошнюю магчымасьць выбару на карысьць дэмакратыі, была ўспрынятая афіцыйным Менскам як слабасьць і сыгнал да атакі супраць рэзалюцыі ААН па Беларусі.

## Арлы над палацам нацый

Жэнэва жыве за кошт турызму. Цэнтры банкаўскага жыцьця — у Бэрне ці Цюрыху. А галоўны турыстычны аб'ект Жэнэвы (пасьля возера й знакамітага фантану на ім, які ўтварае свайго роду вадзяны вятраз альбо вэлюм 50-мэтровай вышыні) — гэта ААН. Ці дакладней — Палац нацый, дзе працуе Камісія ААН па правах чалавека. У Жэнэве шмат міжнародных арганізацый — галоўная сядзіба Міжнароднай арганізацыі Чырвонага Крыжа, Сусьветнае агенцтва па пытаньнях інтэлектуальнай уласнасьці, і Міжнародная арганізацыя працы, і офіс Генэральнага пагадненьня па тарыфах і гандлі. Але ААН па-за канкурэнцыяй. Менавіта Жэнэва была з 1919 да 1946 году штаб-кватэрай Лігі Нацый — папярэдніцы ААН. Дарэчы, пабудаваны да вайны палац, які мусіў служыць сымбалем міру, бясьпекі й дэмакратыі, стылем нагадвае тагачасныя ўрадавыя будынкі як Італіі Мусаліні, так і гітлераўскага Райху ды Савецкага Саюзу зь яго «сталінскім ампірам».

У Палацы нацый працуе і 61-я сэсія Камісіі ААН па правах чалавека. Прычым ня столькі ў залях пасяджэньняў, колькі ў кулюарах. На паверхах крыла «Е» Палацу нацый стаіць гармідар, як на вакзале. Сотні, тысячы людзей вядуць размовы ў фае, холах, калідорах, на лесьвіцах. Ну і, зразумела, у кавярні пад назвай «Сэрпанцін», зь якой адкрываецца від на Альпы й возера. Аднак на прыгажосьць пэйзажу з арламі ніхто не зьвяртае ўвагі. Тут за кавай вядуцца перамовы, вырашаюцца сусьветныя праблемы.

## Філіжанка кавы з Адрыянам Севярынам

Так за столікам у кавярні адбылася й сустрэча спэцдакладчыка ААН па правах чалавека ў Беларусі Адрыяна Севярына з прадстаўнікамі беларускіх няўрадавых арганізацый.

Адчувалася, што для дыпламата нефармальная сустрэча была ня менш важнай, чым непасрэдны выступ на сэсіі. Тут ён мог менш дыпляматычна і больш эмацыйна выказаць тое, што яго хвалюе, давесьці мэты дакладу да апазыцыі, частка якой успрыняла даклад ледзь не як здраду беларускай дэмакратыі. Няма сэнсу гаварыць пра аргумэнты Севярына і ягоных апанэнтаў. Гаворка пра тое, што камісія не зьяўляецца закрытай арганізацыяй, усе рашэньні даступныя ў Інтэрнэце, а сябры камісіі — для сустрэчы з праваабаронцамі ці іншымі грамадзкімі актывістамі, акрэдытаванымі на сэсіі. Усе дэлегаты адкрытыя для выслухоўваньня аргумэнтаў розных бакоў. Менавіта гэта не задавальняе афіцыйную дэлегацыю. Яна пільна сачыла за ўсімі кантактамі беларускіх праваабаронцаў, але ніхто зь яе ўдзельнікаў нават не падышоў да суайчыньнікаў, хаця б са звычайнай ветлівасьці. Нават тут, удалечыні ад Менску, адчувалася стаўленьне дзяржаўных чыноўнікаў да апанэнтаў рэжыму як да ворагаў ці ў найлепшым выпадку — ізгояў, зь якімі побач нават стаяць небясьпечна.

Але такое стаўленьне да праваабаронцаў уласьцівае ня толькі Беларусі. У Камісіі ААН ёсьць некалькі дзяржаў — Кітай, Куба, Зімбабвэ і да іх падобныя, — пра якія нават генэральны сакратар ААН Кофі Анан быў вымушаны сказаць, што яны дыскрэдытуюць сваёй прысутнасьцю гэтую арганізацыю. Дыскрэдытуюць пастаяннай манокй, фальшаваньнем фактаў, крывадушнасьцю, агрэсіўнымі нападкамі на іншыя краіны. Цяпер гэтыя краіны, адчуваючы непазьбежнасьць рэформы, якая абмяжуе вагу дыктатарскіх рэжымаў у прыняцьці рашэньняў па правах чалавека, фактычна выступілі адзіным фронтам супраць інстытуту спэцдакладчыкаў. У якасьці забойчага аргумэнту выкарыстоўваецца дзяржаўны сувэрэнітэт, які нібыта парушае крытыка становішча з правамі чалавека з боку ААН. Такі самы аргумэнт выкарыстоўваў некалі й СССР. Любая крытыка міжнароднай супольнасьці адразу абвяшчалася ўмяшаньнем ва ўнутраныя справы дзяржавы.

## Камень на шляху дыктатуры

Адрыян Севярын у выступе на сэсіі назваў спэцдаклады каменем, які ляжыць на шляху дыктатараў да беспакаранасьці. Між іншым, на аснове фактаў, сабраных праваабаронцамі і перададзеных у ААН, быў зроблены некалі даклад аб масавых парушэньнях правоў чалавека ў Чылі, і ўжо на падставе яго ўдалося распачаць крымінальны працэс супраць Пінахета. Дзіва што падобныя прэцэдэнты выклікаюць лютасьць у сучасных дыктатараў. Мяккасьць беларускага дакладу Севярына, які пакідае кіраўніцтву Беларусі свайго роду апошнюю магчымасьць выбару на карысьць дэмакратыі, была ўспрынятая афіцыйным Менскам як слабасьць і сыгнал да атакі супраць рэзалюцыі ААН па Беларусі.

У міжнародных праваабарончых арганізацыяў, што сабраліся днямі ў Жэнэве, ёсьць шмат пытаньняў як да самой Камісіі ААН у пляне эфэктыўнасьці яе дзейнасьці, так і да многіх яе сяброў. У тым ліку і да ЗША ці краін Эўразьвязу, непасьлядоўнасьць пазыцыі якіх прывяла да таго, што пытаньне Чачэніі другі год запар здымаецца з разгляду сэсіі ААН. Падобнае можа адбыцца і ў дачыненьні да Беларусі.

Аднак усё гэта ня мае непасрэднага дачыненьня да Жэнэвы, дзе воляю лёсу месьціцца Камісія па правох чалавека. Маляўнічы краявід Жэнэўскага возера, на тле якога кіпяць страсьці ў залях Палацу, дадае горычы ва ўсьведамленьне таго, што, хоць шчыгрынавая скура дыктатуры ва ўсім сьвеце сьціскаецца з кожным годам, эўрапейская краіна Беларусь усё яшчэ застаецца ў ліку самых зацятых ворагаў дэмакратыі. Тае самае дэмакратыі, якая толькі й дазваляе прадстаўнікам цяперашняга рэжыму засядаць у структурах ААН у Жэнэве ды цынічна заяўляць, нібыта Беларусь дасягнула ў галіне правоў чалавека нечуваных, можна сказаць, нечалавечых посьпехаў.

*Жэнэва—Менск,*
*красавік 2005 году*

# Апазыцыйны «Шчыт Айчыны»

У Кіеве прайшлі «командна-штабныя вучэньні» грамадзянскай апазыцыі. Група грамадзкіх аб'яднаньняў «Разам» праводзіла ў Кіеве з 28 сакавіка да 3 красавіка арганізацыйна-дзейнасную гульню «Распрацоўка пераможнай палітычнай стратэгіі для Беларусі: сцэнiраваньне, праектаваньне і праграмаваньне». Ідэя гульні: сабраць разам розных людзей, каб яны пакінулі вонкі свае звыклыя грамадзкія ролі і зірнулі на сябе збоку, а ў выніку выпрацавалі праграму дзеяньняў. «Сапраўднымі лідэрамі грамадзтва могуць быць толькі непалітычныя асобы», — мяркуе арганізатар гульні **Уладзімер Мацкевіч**.

**«НН»: Каму і калі прыйшла ідэя правесьці такую гульню?**

**Уладзімер Мацкевіч:** Пачалося ўсё ў сеціве. Перад кастрычніцкімі выбарамі й рэфэрэндумам на інтэрнэт-форумах склалася супольнасьць людзей, якія ўсьвядомілі немінучую паразу апазыцыі. Зь некаторымі зь іх у мяне завязалася актыўная перапіска. Паралельна з гэтым утварылася група прадстаўнікоў грамадзкіх аб'яднаньняў, якія вырашылі абмеркаваць свой удзел у будучых палітычных падзеях. Туды паклікалі мяне, а я прапанаваў правесьці такую гульню.

**«НН»: Што яна зь сябе ўяўляла?**

**УМ:** У пэўным сэнсе, гульню трэба разглядаць у тэрмінах вайсковых вучэньняў. Гэта штабныя гульні генэралаў. Гэта былі манэўры, якія праводзіла грамадзянская супольнасьць, каб праверыць сваю моц.

**«НН»: І якія праблемы вы спрабавалі вырашыць?**

**УМ:** У нашым грамадзтве ніхто ні з кім па-сапраўднаму не камунікуе. Усталяваць камунікацыю, зрабіць яе зьмястоўнай, доўгатэрміновай — гэта была адна з задачаў гульні. Па-другое, гэта праблема формы. У сучаснай Беларусі ўсе структуры не падобныя да сваіх прататыпаў. Мэдыі — гэта сродкі масавай прапаганды ды агітацыі, палітычныя партыі — маргінальныя грамадзкія арганізацыі, бізнэс — адміністратыўнае адгалінаваньне, якое задавальняе патрэбы чынавенства. Надаць форму, надаць камунікацыі зьмястоўнасьць і асэнсаванасьць — у гэтым быў сэнс гульні.

**«НН»: Групу «Разам» называюць ці то новай палітычнай сілай, ці то будучай партыяй… Гэта слушна?**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**УМ:** Абсалютна не. Група «Разам» скончыла сваё існаваньне на самой гульні — гэтая структура была патрэбная толькі для таго, каб гульню арганізаваць. А вось людзі абавязкова будуць нешта рабіць. У гульні ўдзельнічалі самыя розныя асобы — Марына Багдановіч, Васіль Лявонаў, Валянцін Акудовіч, многія іншыя. Яны сабраліся, каб ставіць праблемы і вырашаць іх, а не ствараць структуру. Я ўпэўнены, што большасьць беларускіх структураў існуюць дзеля самаісньнаваньня. Яны непрыдатныя для рашэньня актуальных задачаў. Калі людзі, зацікаўленыя ў пераменах, трапляюць у мёртвыя структуры, яны ня могуць самарэалізавацца. Такія арганізацыі адштурхоўваюць тым, што ня прадугледжваюць ратацыі лідэраў, што яны не зьвяртаюцца да людзей, якія лічаць сябе вартымі мець уласнае меркаваньне, а ня проста ісьці за лідэрамі.

**«НН»: Ці абмяркоўвалі вы праблему лідэрства?**

**УМ:** Рэвалюцыю робіць грамадзтва, а ня дзесяць палітыкаў. Калі ня будзе грамадзтва, аніякія рэвалюцыі немагчымыя. Сапраўднымі лідэрамі незалежнага грамадзтва сёньня могуць быць толькі непалітычныя асобы.

**«НН»: Ці можна нешта казаць пра канкрэтныя вынікі гульні?**

**УМ:** За сем дзён узаемадзеяньня людзі нечаму навучыліся. Нават Акудовіч на гульні хадзіў два дні з пальцам у ілба: зрабіў адкрыцьцё! Вынікам зьяўляецца таксама і матэрыял, назапашаны ў часе гульні. Канчатковыя высновы зробім на пачатку траўня, калі апрацуем увесь матэрыял.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

# Янка Запруднік: «Няма лепшай рэклямы для краіны»

Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» рыхтуе IV Зьезд беларусаў сьвету. Тэму форуму, што пройдзе ў Менску 16—17 ліпеня, акрэсьлілі як «Беларусь для дыяспары — дыяспара для Беларусі. Шляхі да кансалідацыі й разьвіцьця нацыі». У аргкамітэт зьезду ўвайшлі як жыхары Беларусі, так і прадстаўнікі дыяспары. На пытаньні «НН» адказвае сустаршыня аргкамітэту доктар **Янка Запруднік** (ЗША).



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Чаго чакае ад зьезду беларуская эміграцыя?**

**Янка Запруднік:** Пабыць на Бацькаўшчыне — тыя, хто прыедзе. А тыя, хто ня здолее прыехаць, — пачуць пра Бацькаўшчыну і зьезд. Зьезд беларусаў сьвету — рытуал, які мае і вялікае сымбалічнае значэньне, і практычнае. Людзі заўжды цікавяцца краем, дзе нарадзіліся. Зьезд, які адбываецца раз на чатыры гады, — гэта своеасаблівы барометр, які дазваляе ўбачыць, у які бок мы ідзём, куды рухаецца Беларусь.

**«НН»: Якія праблемы будуць узьнімаць на зьезьдзе прадстаўнікі амэрыканскай эміграцыі?**

**ЯЗ:** Бягучага дня. Тыя, якімі жыве і Беларусь, і сьвет. Беларуская праблема, як я чую, стаіць на парадку дня ў ААН: там будуць абмяркоўваць правы чалавека ў Беларусі, працэс дэмакратызацыі. Прадстаўніца нямецкага бундэстагу Ута Цапф таксама заявіла нядаўна, што Эўропа павінна працягваць дыялёг зь Беларусьсю. Таму я лічу, што зьезд — гэта яшчэ адна магчымасьць дыялёгу паміж дыяспарай і Бацькаўшчынай.

**«НН»: Пры якіх умовах — як з боку самой эміграцыі, так і з боку Радзімы — эміграцыя магла б аказваць больш уплыў на падзеі ўнутры Беларусі?**

**ЯЗ:** Цяжка рабіць нейкі ўплыў, бо ў гэтым не зацікаўленыя беларускія ўлады. Адзінае, што мы можам, — інфармаваць суайчыньнікаў, спрыяць прыезду сюды сваякоў, каб яны ўсё ўбачылі на свае вочы. Вось нядаўна мы паспрыялі, каб адна маладая асоба — яна цяпер настаўніца — прыехала ў Амэрыку, пажыла тут, павучылася.

Барджджэй мы можам уплываць на сваіх заканадаўцаў і органы выканаўчай улады, інфармуючы іх пра Беларусь і фармуючы іх стаўленьне.

**«НН»: Ці ёсьць прынцыповыя адрозьненьні паміж будучым зьездам і папярэднімі?**

**ЯЗ:** Папярэдні зьезд быў чатыры гады таму, у міжчасьсе шмат чаго здарылася. Кожнага разу, калі я прыяжджаю ў Менск, я бачу зьмены на лепшае: горад прыгажэе, разбудоўваецца. Ёсьць, праўда, і іншыя зьмены… Мяркую, удзельнікі зьезду разгледзяцца на месцы і змогуць сфармуляваць думку наконт усіх падзей.

Днямі я размаўляў з прадстаўніком беларускага пасольства і даведаўся, што ўрад Беларусі пачаў шукаць у Амэрыцы інвэстараў. Хоць ЗША крытыкуюць Беларусь, але Амэрыка ўсё ж на першым месцы па колькасьці капіталаўкладаньняў у беларускую эканоміку. Магчыма, удасца зацікавіць эмігрантаў, сярод якіх многія маюць беларускія карані і могуць быць патэнцыйнымі інвэстарамі.

Апошнім часам беларускія ўлады робяць стаўку на разьвіцьцё міжнароднага турызму, дзеля чаго ўпарадкоўваюць гарады, адбудоўваюць помнікі… Але ж няма лепшай рэклямы для краіны, як замежнікі, якія пабывалі ў ёй! Гэты зьезд будзе адной з такіх нагод: паказаць Беларусь зь лепшага боку, каб грамадзяне іншых краін маглі расказаць пра яе.

**«НН»: Ці ня будзе больш правільна ў цяперашніх умовах зьезд дыяспары праводзіць ня ў Менску, а ў правінцыі (напрыклад, Горадні) або нават за межамі краіны — у Вільні, у Беластоку?**

**ЯЗ:** Месца правядзеньня зьезду мае сваю сымболіку. Менск — галоўны горад краіны, таму месца вельмі лягічнае. Гэта візытоўка краіны. Для інвэстараў, для замежных турыстаў вельмі правільна паказваць Менск.

**Аркадзь Шанскі**

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### Апэратараў — пад кантроль

Прэзыдэнт Беларусі загадаў узмацніць дзяржаўны кантроль над усімі апэратарамі мабільнай сувязі. Падчас нарады аб разьвіцьці сотавай сувязі ён заклікаў зьмяніць кіраўніцтва Velcom ды МТС, а таксама запатрабаваў, каб сотавыя апэратары набывалі максымум айчыннага абсталяваньня. Дарэчы, наваствораны дзяржаўны апэратар сотавай сувязі «БеСТ» ужо аб'явіў тэндэр на закупку апаратуры для разгортваньня сеткі.

### Бурштынавы «Тампліер»

Маладэчанскі бровар займеў уласны брэнд — «Тампліер». Гэта будзе піва клясы «прэміюм». Варыць яго будуць на замову беларуска-расейскай кампаніі «Інтэрбір». Маладэчанскі бровар зусім невялічкі, таму будзе выпускаць ня больш за шэсьць млн пляшак у год. Прадаваць яго будуць у сталіцы ды яе ваколіцах, каштаваць пляшка будзе 1 700 руб.

### Каб ня вылецець у трубу

Урад падазрае Ўкраіну ў дэмпінгу. Кампанія «Ўпэка Індастрыз», адзіны ў Беларусі вытворца сталёвых труб, скардзіцца на тое, што ня можа спаборнічаць у цане з аналягічным украінскім таварам. Праз украінскіх канкурэнтаў, якія прадаюць трубы па заніжаных цэнах, кампанія загружаная толькі на 23%. Калі так пойдзе далей, «Упэка Індастрыз» можа збанкрутаваць. МЗС ужо распачаў антыдэмпінгавае расьсьледаваньне.

### Грошай паболела

Аб'ём шырокай грашовай масы (ШГМ) у Беларусі на 1 красавіка склаў 9,247 трлн руб. і павялічыўся за першы квартал на 4,6 адсотка. За сакавік аб'ём ШГМ павялічыўся на 3,5%, у лютым — на 3,4%. З агульнага памеру грашовай масы аб'ём гатоўкі ў абарачэньні (грашовы агрэгат М0) на 1 красавіка склаў 1,374 трлн.

**АК, АФН**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 14 красавіка:**

1 амэрыканскі даляр — 2 154 рублі
1 эўра — 2 790,08 рубля.
1 латвійскі лат — 4 007,44.
1 літоўскі літ — 808,07.
1 польскі злоты — 685,05.
1 расейскі рубель — 77,51.
1 украінская грыўна — 409,90.

**Паводле Нацбанку**

# Гульня як спосаб змаганьня

«Схватка зуброў» — так назвалі сваю экстрэмальную гульню чальцы барысаўскай філіі незарэгістраванай арганізацыі «Зубр». За ўзор была ўзятая папулярная менская гульня «Схватка», у часе якой аматары адрэналіну выконваюць рызыкоўныя заданьні. У барысаўскім варыянце рызыка набыла палітычную афарбоўку.

«Крыху «прыеліся» звычайныя акцыі. Таму вырашылі ўсё правесьці ў такой незвычайнай форме. Толькі ўнесьлі ў гульню свае асаблівасьці, наблізіўшы яе да нашых рэалій», — расказаў карэспандэнту «НН» актывіст руху Зьміцер Бародка.

Некалькі дзясяткаў удзельнікаў былі падзеленыя на каманды. Заданьне — прайсьці дзесяць этапаў, сярод якіх былі як чыста «вулічныя», так і «інтэлектуальныя». Так, найлепшых вызначалі ў такіх «конкурсах», як раздача газэт, расклейка ўлётак, маляваньне графіці, вывешваньне сьцягоў. Спаборніцтвы адбываліся ў натуральных умовах — з традыцыйнай пагрозай затрыманьня.

Сярод «інтэлектуальных» заданьняў было арыентаваньне па мапе, заданьні на веданьне гісторыі Барысава. Да фінішу не дайшла толькі адна каманда — ня здолела прайсьці тэст на пошук інфармацыі ў Інтэрнэце.

Прэс-сакратар арганізацыі Аляксандар Атрошчанкаў зазначыў, што надалей досьвед можа быць пашыраны і на іншыя рэгіёны. Была б ахвота!

**АШ**



WWW.ZUBR-BELARUS.COM

**ЯК ЗУБРОЎЦЫ ВЕШАЮЦЬ СЬЦЯГІ. «Зубровец»-канкурсант мацуе нацыянальны сьцяг на парэнчынах мосту праз раку Бярэзіну. Каб сьцяг не згортваўся, ён асаджваецца на нядоўгі тронак (калі сьцяг памерам 0,75X1,5 м, тронак бярэцца 80—90 см даўжынёю).Тронак мае быць дастаткова тоўстым, каб сьцяг зь яго не сасьлізнуў. Для пэўнасьці апошні часам прышпіляецца парай канцалярскіх кнопак. За адзін канец тронка мацуецца капронавы шнур. Калі другі канец шнура замацаваць на высокай кропцы (электралінія, парэнчыны мосту) і спусьціць сьцяг уніз, тронак стане вэртыкальна і сьцяг будзе прыгожа лунаць. Так увосень зуброўцы з дапамогай вуды з даху закінулі такую канструкцыю на электрадрот над менскай вул.Казлова. Яны выбіраюць цяжкадаступныя месцы — каб сьцяг доўга не маглі зьняць — і, натуральна, захоўваюць асьцярожнасьць на вышыні й з электрычнасьцю.**

## ХРОНІКА

Ад пачатку году ня маюць памяшканьня валянтэры Берасьцейскага Дому міласэрнасьці **«Божая ласка»**. У студзені мясцовыя ўлады выселілі іх з займанага прытулку, абяцалі вырашыць праблему ў лютым, але дагэтуль «Благадаць» застаецца бяздомнай.

30 сакавіка Менгарвыканкам вынес другое папярэджаньне царкве **«Новае жыцьцё»** Аб'яднаньня грамадаў хрысьціянаў поўнага Эвангельля за несанкцыяваны сход на агульную малітву.

На пачатку красавіка актывіста незарэгістраванага «Маладога фронту» **Сяргея Лісічонка** спрабавалі завэрбаваць супрацоўнікі КДБ. Актывісту незарэгістраванага руху «Лімон» з Гомелю **Валер'ю Сыляпухіну**, паводле яго словаў, за згоду супрацоўнічаць з КДБ абяцалі службу па кантракце ў элітных войсках на тэрыторыі Чачэніі. Яшчэ аднаму актывісту «Лімона» **Раману Аляніку** прапаноўвалі разьмяркоўвацца апэратыўным супрацоўнікам КДБ.

Ідэалягічны аддзел Барысаўскага гарвыканкаму на пачатку красавіка распаўсюдзіў на прадпрыемствах і ў арганізацыях гораду ліст з забаронай ведамаснай падпіскі на недзяржаўныя выданьні **«Курьер из Борисова»** і **«Борисовские новости»**.

Пракуратура Беларусі 4 красавіка аднавіла расьсьледаваньне ў справе зьнікненьня **Зьмітра Завадзкага**. Узнаўленьне тлумачыцца «неабходнасьцю правядзеньня сьледчых дзеяньняў па гэтай справе».

5 красавіка ў Менску пачаўся суд над актывістам Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Аляксандрам Бяспалым**, затрыманым за распаўсюд улётак з заклікам прыйсьці на ланцуг неабыякавых людзей у памяць Генадзя Карпенкі.

Ігар і Павал Марынічы наведалі 5 красавіка ў турэмным шпіталі бацьку **Міхаіла Марыніча**.

5 красавіка пачаўся судовы працэс **Партыі камуністаў Беларускай** супраць Мінюсту: партыя аспрэчвала папярэджаньне за няправільную рэгістрацыю юрадрасоў філіяў. 7-га папярэджаньне пакінутае ў сіле. 8 красавіка пачаўся аналягічны працэс супраць Мінюсту з боку **АГП**.

Лідэр Лібэральна-дэмакратычнай партыі Беларусі Сяргей Гайдукевіч 5 красавіка падаў судовы пазоў на недзяржаўную газэту **«Народная воля»**: ён патрабуе 200 млн руб. за абразу гонару й годнасьці. Падставай стала публікацыя ў «НВ», дзе ЛДПБ вінавацілі ў супрацоўніцтве з Садамам Хусэйнам і атрыманьні фінансавай дапамогі з-за мяжы.

Пракуратура Беларусі зьвярнулася 6 красавіка ў выканкам Партызанскага раёну Менску з патрабаваньнем пазбавіць рэгістрацыі **пярвічку Свабоднага прафсаюзу**, якая дзейнічае на Менскім заводзе аўтаматычных ліній. Пракуратура спасылаецца на п.3 прэзыдэнцкага дэкрэту №2 ад 1999 г., згодна зь якім для рэгістрацыі прафсаюзу трэба ня менш за 10% работнікаў прадпрыемства.

Суд над **Андрэем Клімавым**, які пачаўся 6 красавіка, перанесены на 25-га: абвінаваўчы бок заявіў, што яму неабходны час на падрыхтоўку да судовых спрэчак. Працэс абвешчаны закрытым.

Палітвязьня **Аляксандра Васільева** 6 красавіка перавялі ў рэспубліканскую бальніцу для зьняволеных.

Актывіст ГА «Пэрспэктыва» з Рэчыцы **Леанід Невар** 6 красавіка атрымаў дзьве штрафныя квітанцыі: за язду, нібыта, зь незашпіленымі рамянямі бясьпекі й за тое, што не спыніўся на патрабаваньне дарожнай міліцыі (пазбаўленьне права кіраваньня аўтамабілем на 36 месяцаў). ДАІ спыняла яго ў пачатку сакавіка, калі ён з калегамі кіраваўся ў Менск — браць удзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў.

7 красавіка ў Цэнтральны РУУС Менску выклікалі **Мікалая Статкевіча** з нагоды мітынгу прадпрымальнікаў 1 сакавіка, на якім ён выступаў. На Статкевіча склалі пратакол за ўдзел у несанкцыяваным мітынгу, завезьлі ў суд і аштрафавалі на 150 базавых велічыняў. Апрача таго, яму далі штраф у 5 б.в. за непавагу да суду: на пытаньні судзьдзі ён адказваў седзячы.

Юрыдычны адрас атрымала 7 красавіка гомельская філія ГА **«Беларуская асацыяцыя журналістаў»**: улады знайшлі для арэнды 3 м$^2$. У філіі налічваецца 31 сябар.

Вярхоўны суд 7 красавіка не задаволіў скаргу **Таварыства беларускай мовы** на папярэджаньне, вынесенае Мінюстам за рэгістрацыю суполак арганізацыі ў прыватным сэктары.

Мінюст 8 красавіка вынес папярэджаньне ГА **«Саюз палякаў Беларусі»**. Падставай называецца невыкананьне патрабаваньняў міністэрства: яно запатрабавала матэрыялы зьезду арганізацыі, які адбыўся ў сакавіку, але аб'яднаньне не падало іх у тэрмін.

Кастрычніцкі суд Менску 11 красавіка пастанавіў, што **Ірына Халіп** павінна заплаціць Аркадзю Мару штраф у 10 млн руб., а прадпрыемства **«Марат»** (выдавец **«Белорусской деловой газеты»**) — 50 млн руб. Сам Мар патрабаваў з журналісткі кампэнсацыю ў мільён даляраў.

8 красавіка пасьля паўгадавога перапынку выйшаў друкаваны орган ПКБ газэта **«Товарищ»**. Выданьне накладам у 3000 асобнікаў друкуецца ў Смаленску, бо беларускія друкарні адмовіліся.

Дэкан псыхоляга-пэдагагічнага факультэту Берасьцейскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту А.Астапук зьвярнуўся 8 красавіка да рэктара з просьбай зволіць актывіста Свабоднага прафсаюзу **Валянціна Лазарэнкава**. Ён кіруе адзінай у Беларусі пярвічкай незалежнага прафсаюзу, якая дзейнічае ў ВНУ.

У ноч на 9 красавіка ў Магілёве затрыманы актывіст «Зубра» **Павал Угрыновіч**: міліцыянты зьвінавацілі яго ў напісаньні графіці «Свабоду Марынічу!», але даказаць не змаглі, таму адпусьцілі без складаньня пратаколу.

Мінюст падаў 11 красавіка пазоў у Вярхоўны суд аб ліквідацыі РГА **«Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў»** (НІСЭПД). Падставай стала двайное папярэджаньне за адмову арганізацыі падаць Мінюсту ўзоры анкетаў.

Мастоўскі райвыканкам 11 красавіка адмовіў мясцовай суполцы **ТБМ** у дазволе на ўстаноўку памятнага знаку на месцы габрэйскага гета ў мястэчку Лунна.

**АШ**

## Мільён за кватэру

Запазычанасьць насельніцтва Воршы за камунальныя паслугі на сёньня складае звыш аднаго мільярда рублёў, а за кватэры сыстэматычна ня плацяць амаль 3,5 тысячы жыльцоў. Асобныя грамадзяне вінаватыя КУП «Воршкамгас» па аднаму мільёну рублёў і болей. Сьпіс іх надрукаваны нядаўна ў мясцовай газэце. Праўда, газэта не паведамляе, чаму гэтыя аршанцы не разьлічваюцца за камунальныя паслугі. Зразумела, большасьць іх беспрацоўныя, пэнсіянэры ды іншыя сацыяльна неабароненыя грамадзяне. Дарэчы, трапіў у гэты сумны сьпіс і вядомы ў Воршы паэт Анатоль П-ў, аўтар некалькіх кніжак для дзяцей. Каб выплаціць запазычанасьць у 1,2 млн рублёў, ён (інвалід працы) зьбіраецца прадаць кватэру ды зьехаць жыць у вёску. За 2004 г. на неплацельшчыкаў было афармлена 807 выканаўчых надпісаў, сума дзяржпошліны за гэта склала для «Воршкамгасу» звыш 22 млн руб. Праз суд адну сям'ю ўжо выселілі з кватэры. Безумоўна, ёсьць сярод іх лайдакі ды алькаголікі. Але шмат для каго з аршанцаў камунальныя плацяжы апошнім часам сталі непасільнымі, бо заробкі большасьці месячыаў невялікія.

## Ідэоляг Якім Сарока

Ворша, бадай, адзіны буйны горад Беларусі, дзе няма прафэсійнага тэатру. А вось самадзейнымі артыстамі горад можа ганарыцца. Так, нядаўна стогадовы юбілей адзначыў народны тэатар ДК чыгуначнікаў. Набывае папулярнасьць сярод гледачоў і тэатар творчай інтэлігенцыі аршанскага гарадзкога аддзелу адукацыі. І калі раней свае спэктаклі яго ўдзельнікі ставілі выключна ў дзіцячых садках ды школках, дык цяпер штомесяц выступаюць на вялікіх сцэнах. Апошняй пастаноўкай калектыву стала славутая «Паўлінка» Янкі Купалы. Кожны паказ зьбірае поўныя залі. Прыемна адзначыць, што ролю Якіма Сарокі выконвае галоўны спэцыяліст ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму Ігар Шарай. Ды няблага іграе.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## ТБМ бяз сродкаў

Суполка ТБМ у Асіповічах апынулася пад пагрозай зьнікненьня. Прычына — рэгістрацыя арганізацыі на прыватнай кватэры ейнай старшыні Таццяны Барэль, што забаронена заканадаўствам. Гарадзкія ўлады прапанавалі ТБМаўцам памяшканьні ў нежылым сэктары на агульных умовах арэнды, як для камэрцыйных арганізацыяў. Але такіх грошай арганізацыя ня мае.

## У пастара Сабілы праблемы

Беларуская Эвангельская Царква, якую ачольвае пастар Эрнст Сабіла, сутыкнулася са значнымі цяжкасьцямі. У Менску яна была зарэгістравана на кватэры сьвятара, што супярэчыць заканадаўству. Апроч таго сп.Сабіла будуе бажніцу ў Асіповічах, аднак для заснаваньня прыходу ў населеным пункце мае быць ня менш за дваццаць прыхаджанаў. А ў саміх Асіповічах ахвотных маліцца па-беларуску ня больш за дзесяць чалавек.

## П'юць усе

За першы квартал асіповіцкі мэдвыцьвярэзьнік «наведалі» 532 чалавекі. Мясцовы РАУС зазначае, што лічбы супадаюць са статыстыкай па Магілёве й Бабруйску. Аднак трэба браць пад увагу наступны факт: у Асіповічах пражывае ў дзесяць разоў меней людзей, чым у абласным цэнтры, і ў восем разоў менш, чым у Бабруйску.

**Рыгор Латышэвіч, Асіповічы**

## Палачане — найлепшыя беларусазнаўцы

У Полацку завершылася XXI Рэспубліканская алімпіяда па беларускай мове. У ёй узялі ўдзел 122 удзельнікі з васьмі камандаў — шэсьць зь іх прадстаўлялі вобласьці Беларусі, адна — горад Менск і другая — ліцэй БДУ ды віленскую беларускую гімназію. Цырымонія адкрыцьця алімпіяды адбылася ў гарадзкім Палацы культуры, удзельнікаў вітаў старшыня Полацкага гарвыканкаму Ўладзімер Тачыла, які акрамя прывітальнага слова прачытаў свой першы верш, які напісаў у трэцяй клясе, — вядома, па-беларуску. Спаборніцтвы працягваліся амаль тыдзень. Такога посьпеху палачане яшчэ ніколі ня мелі: шэсьць дзяўчат, якія прадстаўлялі Полацак і Віцебскую вобласьць, атрымалі пяць дыплёмаў і адну падзяку! Варта адзначыць, што дыплём рэспубліканскай алімпіяды дазваляе таму, хто атрымаў яго ў 11 клясе, стаць студэнтам вышэйшай навучальнай установы без уступных іспытаў. Вось імёны полацкіх дыпляманткаў: Вераніка Сташулёнак (школа-інтэрнат-гімназія, 9 кляса) — дыплём першай ступені; Вольга Шкалёнак (школа-інтэрнат-гімназія, 9 кляса) і Кацярына Кузьміцкая (нацыянальная гімназія, 10 кляса) — дыплёмы другой ступені; Яна Прыстаўка (СШ №15, 9 кляса) і Алена Ласоўская (пэдагагічны каледж) — дыплёмы трэцяй ступені. Чым ня доказ таго, што ў Полацку насамрэч рупяцца пра нацыянальную культуру?

## Полацкія сустрэчы

7—9 красавіка ў Полацкім дзяржаўным унівэрсытэце прайшла IV Міжнародная літаратуразнаўчая канфэрэнцыя «Расейская, беларуская і сусьветная літаратура: гісторыя, сучаснасьць, узаемасувязі». Ініцыятарам і арганізатарам навуковага форуму, на які сабралося каля 130 дасьледчыкаў, быў загадчык катэдры сусьветнай літаратуры і культуралёгіі ПДУ, вядомы германіст Аляксандар Гугнін. Так, на пленарным пасяджэньні менская літаратуразнаўца Ева Лявонава прачытала паведамленьне пра нобэлеўскую ляўрэатку-2004 Эльфрыду Елінэк. А поруч прагучаў даклад пра наваполацкае літаб'яданьне «Крыніца», якім у свой час кіраваў Уладзімер Арлоў. На другі дзень у рамках канфэрэнцыі адбылася прэзэнтацыя зборніка пераможцаў конкурсу імя Ф.Пэтраркі на найлепшы твор пра каханьне «Формула каханьня», які летась ладзіў ПЭН-цэнтар. Зборнік прадстаўлялі сябры журы конкурсу Андрэй Хадановіч і Ганна Кісьліцына ды аўтары — Глеб Лабадзенка, Уладзімер Лянкевіч, Павал Сьвярдлоў, Кацярына Марголь, Марыйка Мартысевіч ды інш.

**Васіль Кроква, Полацак**



PHOTO:BYMEDIA.NET

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЗАБАВА. Ну які беларус ня любіць, калі сыйдзе з палёў сьнег і сонца падсушыць зямельку, запаліць леташнюю траву воддаль хаты? Колькі не палохаюць яго статыстыкай зь дзясяткамі спаленых такім чынам будынкаў, колькі не даводзяць, што ад гэтага выгарае маладзенькая травічка, гінуць кузуркі, прачынаюцца пажарныя — ня дзейнічае. Такую ўпартасьць можна патлумачыць хіба генэтычна: сотні гадоў продкі абраблялі зямлю падсечна-агнявым спосабам. На фота: пажарныя тушаць траву ў менскім мікраранёне Паўднёвы Захад 9 красавіка. Паводле зьвестак МНС, летась было зафіксавана 2219 фактаў падпалу травы.**

## Шанец для прастытутак

У сакавіку ў Магілёве на базе Жаночага цэнтру падтрымкі і самаадукацыі адкрыўся кансультацыйны пункт «Шанец», які дзейнічае ў рамках агульнанацыянальнага праекту «Прафіляктыка і лячэньне ВІЧ/СНІД». «Шанец», дзе працуюць псыхоляг, урач, сацыяльны работнікі, будзе праводзіць інфармацыйна-асьветніцкую і прафіляктычную работу сярод жанчын, занятых у сфэры сэкс-паслуг. Мэта праекту — прадухіленьне распаўсюджваньня інфэкцыйных хваробаў і СНІДу.

## Імша па Яну Паўлу ІІ

У мінулую пятніцу ў Магілёўскім архікатэдральным саборы Ўнебаўзяцьця Найсьвяцейшай Панны Марыі прайшла жалобная імша па Яну Паўлу ІІ. У касьцёл прыйшло шмат людзей, што жадалі аддаць даніну памяці пантыфіку ды памаліцца за супакой яго душы. Пробашч сабору, магілёўскі дэкан Раман Факсінскі прыгадаў словы Яна Паўла ІІ, зьвернутыя да беларускіх пілігрымаў у Рыме: «Вы атрымалі свабоду, вольнасьць, і імкніцеся ня толькі захоўваць яе, але і будаваць». Увесь мінулы тыдзень магілёўцы запісвалі словы сьветлай памяці пра Яна Паўла ІІ у адмысловую кнігу, якая будзе перададзена ў нунцыятуру Ватыкану ў Менску.

## Канадзкая дапамога

Прадстаўнікі канадзкай дабрачыннай арганізацыі «Дапамога ахвярам Чарнобылю» з гораду Броквіль даставілі ў Магілёў восем вялікагрузных марскіх кантэйнэраў з гуманітарным грузам на 50 тыс. даляраў. Гэтае мэдычнае абсталяваньне, спартовы інвэнтар, вопратка, абутак, прадукты будуць разьмеркаваныя між сацыяльнымі ўстановамі вобласьці, малазабясьпечанымі сем'ямі і інвалідамі. Дабрачынная арганізацыя на чале з дырэктарам Дэвідам Шо супрацоўнічае з Магілёўшчынай цягам васьмі гадоў. За гэты час у вобласьць было дастаўлена больш за шэсьцьдзесят вялікагрузных марскіх кантэйнэраў з гуманітарнай дапамогай.

## Магілёўская экспансія на ўсход

Першую партыю сваёй прадукцыі пад гандлёвымі маркамі расейскіх кампаній «Вім-Біль-Дан» і ААТ «Ачакава» накіраваў у Маскву Магілёўскі малочны камбінат. Каб пастаўкі былі пастаяннымі, трэба ўзгадніць тэхналягічныя ўмовы, бо беларускія стандарты розьняцца ад расейскіх. Апроч малака, у хуткім часе магілёўцы плянуюць пастаўляць у Расею тварог, масла, сухое малако.

**Алеся Чыж, Магілёў**

## Курс маладой сям'і

27 адзінаццацікласьнікаў Крычаўскага ліцэю бяруць актыўны ўдзел у мерапрыемствах па выхаваньні маладой сям'і, якія ладзіць раённы аддзел ЗАГС. Так, ужо прайшоў вечар «Усё пачынаецца з каханьня»: супрацоўнікі ЗАГС захапляльна апавядалі пра ўзаемаадносіны юнакоў і дзяўчат, сфакусаваўшы ўвагу на палавым жыцьці і сродках кантрацэпцыі. Яшчэ вучням паказвалі абрад выпяканьня караваю, расказвалі, як правільна сватацца, рабіць заручыны і шмат іншых цікавостак. Для нагляднасьці ў раённай бібліятэцы арганізавалі абрад «Рэгістрацыя шлюбу», дзе ліцэістаў знаёмілі зь вясельнымі атрыбутамі — вэлюмам, вянком, ручніком і караваем.

## Ноў-хаў крычаўскіх даішнікаў

Арыгінальныя мэтады ўзьдзеяньня на парушальнікаў правілаў дарожнага руху практыкуюць супрацоўнікі Крычаўскай ДАІ. Інспэктары прапануюць кіроўцам, што «праштрафіліся», набыць стос лятарэйных білетаў або падпісацца на «Советскую Белоруссию».

**Андрэй Пархоменка, Крычаў**

## Каханьне па-бялыніцку

Рэдакцыя радыё «Бялынічы» сумесна з райвыканкамам абвясьціла конкурс на найлепшае прызнаньне ў любові да роднага краю. Мэта конкурсу — спрыяньне папулярызацыі ведаў пра гістарычнае мінулае і сёньняшні дзень раёну. Пераможцаў чакаюць каштоўныя падарункі — складаная бытавая тэхніка і аўдыёапаратура.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

# З слугі імпэрыі ў збаўцы незалежнасьці

Дзьве адметныя рысы адрозьнівалі Манэргейма ад іншых расейскіх афіцэраў: ён паліў цыгары і нават на вайне аддаваў загады, пачынаючы зь ветлівай формулы накшталт: «Ці не зрабілі б вы мне паслугу...» — што было не прынята ў расейскай арміі.




Мэры В. Маршал Фінляндыі Карл Густаў Манэргейм. — Менск: ІП «Колас», 2004.

Вэё Мэры піша, што на ўсіх здымках маршала можна заўважыць, што ў яго былі сумныя вочы. Гэта позірк чалавека, які ўсьведамляе наканаванасьць людзкога існаваньня, таямніцу жыцьця ды непазьбежнасьць сьмерці і ведае, што такое самота. Таму гэтая кніга ня толькі пра «бацьку» фінскае дзяржавы ды адзінага ў гісторыі Фінляндыі маршала, але і пра заваёўніка жаночых сэрцаў, конезаводчыка, дасьледчыка Ўсходу, фатографа, выдатнага наезьніка, удзельніка першага ў Расеі матчу па пола. Нават пасьля безьлічы агучаных падрабязнасьцяў зь сямейнага жыцьця ягоны вобраз — стваральніка незалежнай Фінляндыі — нікольki не паблякне.

Карл Густаў Эміль Манэргейм (1868—1951) быў нашчадкам старадаўняга купецкага роду, што трапіў у XVI ст. у Швэцыю праз Галяндыю. А ўжо прадзед маршала перабраўся ў Фінляндыю. Гэта ён узначальваў фінскую дэлегацыю на сустрэчы з Аляксандрам I у 1808 г. — калі вырашалася пытаньне аб далучэньні да Расеі і аўтаноміі. Карл Эрык заявіў тады, што дэлегацыя прадстаўляе законапаслухмяны народ, верны свайму валадару. Праўнук праз стагодзьдзе вярнуў фінам незалежнасьць.

Пачатак жыцьцёвага шляху Карла Густава Манэргейма нагадваў шлях бацькі: нешчасьлівы шлюб, разарэньне. Пасьля была служба ў гвардзейскім палку. Паехаў на расейска-японскую вайну, шукаючы сьмерці пасьля чарговых праблем у асабістым жыцьці. Але, некалькі разоў параненым, выжыў.

Фінскі генэрал ніколі не чытаў мастацкае літаратуры — лічыў гэта марнаваньнем часу. У ім загінуў добры празаік, але выгадаваўся выдатны палкаводзец.

У 1906—1908 г. Манэргейм вяртаецца на Ўсход, гэтым разам зьдзяйсьняючы дасьледчыцкае падарожжа па Цэнтральнай Азіі. Гэта была місія даведацца, у якой ступені тамтэйшыя народы схільныя да супрацоўніцтва з Расеяй. У ёй Манэргейм выявіўся як бліскучы апавядальнік і этнограф. В.Мэры параўноўвае Манэргейма зь песьняром Усходу Кіплінгам. Праўда, фінскі генэрал ніколі не чытаў мастацкае літаратуры — лічыў гэта марнаваньнем часу. У ім загінуў добры празаік, але выгадаваўся выдатны палкаводзец.

Потым была сусьветная вайна, чатыры Георгіеўскія крыжы. Тры дзесяцігодзьдзі Манэргейм служыў Расеі. Падпольная газэта пасіўнага супраціву «Фрыя орд» у 1906 г. нават надрукавала чорны сьпіс фінаў, якія працягвалі верай і праўдай служыць самадзяржаўю. Сярод іх было імя Манэргейма. Усё зьмяніў 1917 год. Манэргейма, які не прыняў ураду Керанскага, адпраўляюць у рэзэрв. 18 сьнежня 1917 г. ён вяртаецца ў Хельсынкі і за лічаныя месяцы праходзіць шлях ад манархічна настроенага афіцэра да барацьбіта за незалежнасьць Фінляндыі. І такой бяды, што фінскай мовы Манэргейма пакуль не разумелі памежнікі.

Прыехаўшы ў Хельсынкі, Манэргейм апынуўся ў патрэбным месцы ў патрэбны час. Двума тыднямі раней Фінляндыя абвясьціла незалежнасьць, аднак бараніць яе не было каму. Усе твары зьвярнуліся да будучага маршала. Створанае на захадзе дзяржавы войска пад ягоным умелым кіраўніцтвам ачысьціла Фінляндыю ад чырвоных. Але ажыцьцявіць яшчэ адну мару — вызваліць Петраград ад бальшавікоў — Манэргейм ня здолеў: умяшаліся немцы са сваім Берасьцейскім мірам. Нянавісьць да немцаў ён захаваў на ўсё астатняе жыцьцё, нават калі ў часе Другое сусьветнае вайны давялося зь імі цесна супрацоўнічаць.

А ў 1918-м за нейкія паўгоду Манэргейм стаў сусьветнавядомым, і ў сьнежні яго выбралі рэгентам Фінляндыі. На гэтай пасадзе ён кіраваўся прынцыпам маладой дзяржавы: дзьве мовы — адна душа. Швэды адыгралі немалую ролю ў адваёе незалежнасьці.

Але першыя прэзыдэнцкія выбары (1919) Манэргейм прайграў Стольбэргу і адышоў ад спраў. Праўда, былі прыняты адмысловы закон, паводле якога ў выпадку новай вайны Манэргейм аўтаматычна вяртаўся на месца галоўнакамандуючага. Гэта і адбылося 30 лістапада 1939 году, калі саветы разьвязалі вайну супраць маленькай дзяржавы. Манэргейм энэргічна ўзяўся за справу. Выехаў ва Ўсходнюю Карэлію (горад Мікелі) і ўзяў на сябе камандаваньне войскамі. Сваіх падначаленых ён даводзіў да шаленства: шпацыраваў па Мікелях без ахоўнікаў, а ў цырульні цярпліва чакаў сваёй чаргі.

Манэргейм уратаваў краіну ў 1940 годзе, уратаваў яе і ў 1944-м. Ён разарваў дамову з Гітлерам і заключыў мірную дамову з СССР, тым самым ня даўшы савецкім войскам акупаваць Фінляндыі. Двума гадамі раней, у 1942 г., маршал наадрэз адмовіўся ад апэрацыі па блякадзе чыгункі Ленінград—Мурманск, якая б азначала галодную сьмерць Ленінграду.

У 1944-м парлямэнт абраў Манэргейма прэзыдэнтам. Манэргейм баяўся, што па вайне яго чакае суд. Усё ж ён быў цягам чатырох гадоў па адзін бок барыкадаў з Нямеччынай. Але абышлося. СССР і ня думаў перасьледаваць маршала. На лаву падсудных сеў прэзыдэнт Рыста Руці, які прымаў рашэньне аб саюзе зь Нямеччынай.

У 1946 г. Манэргейм канчаткова пакінуў справы. Запаветам было пахаваць яго ў маршальскім мундзіры. Труну загарнулі ў фінскі вайсковы сьцяг.

**Алег Гардзіенка**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Contrabанда




«Contrabанда». Група «Zygimont Vaza». (p) «Zygimont Vaza», 2004

Калі паспрабаваць згадаць, ці былі ў гісторыі айчыннага гуказапісу выданьні музыкі, напісанай для кіно, на памяць прыходзіць толькі саўндтрэк да фільму «Blasted», створаны ў пачатку 1990-х на студыі «Фобас» М.Грабёнкіным. Музыку да няпоўнамэтражнай мастацкай стужкі напісаў тады гітарыст «Песьняроў» Алекс Растопчын, у запісе ўдзельнічалі іншыя музыкі калектыву — Валеры Дайнэка, Уладзімер Бяляеў. Бадай і ўсё, што калісьці хоць нейкім чынам тыражавалася ў Беларусі ў жанры кінамузыкі.

Што самае цікавае — музыка «Жыгімонтаў» па часе напісаньня амаль супадае з музыкай Растопчына. Прыдумана яна была ў 1989—1991 г., калі лідэр групы Скрыпа цярпеў часовыя «тяготы и лишения» ў шэрагах Чырвонай Арміі. Тады ўжо салдацікі маглі глядзець сякую-такую галівудзкую прадукцыю, і Скрыпа, адклаўшы ўбок каравульны статут, мог па начах цягам некалькіх гадзін адчуць сябе якім-небудзь Эніё Марыконэ у пагонах. Прайшлі гады, і таемна вынесенае з вайсковае часьці ўвасобілася ў запісе. Праўда, фільму дагэтуль няма, у адрозьненьне ад музыкі.

Доўгая валасатая рука Галівуду адчуваецца. Бо Скрыпа ў сэнсе структуры музыкі не прыдумваў нічога новага. Можна нават казаць пра насьледаваньне пэўнаму стандарту таго, што мы чуем з амэрыканскага экрану. Іншая рэч — зьмест. Падчас запісу «Жыгімонты» абышліся бяз клявішных (во як!), гучыць выключна гітарная музыка, але яна істотна розьніцца ад эпізоду да эпізоду. Эпізоды называюцца вельмі проста: «Тэма «Кіеў», «Тэма «Кантрабанда-2», частка 1», «Тэма «Пагоня» (за кантрабандыстамі). Часткі асноўных тэм паўтараюцца з варыяцыямі, але згодна са стандартамі, кожная з тэм вызначаецца ўласнай мэлёдыяй, распрацаванай з дапамогай адметных тэмбраў і рытмікі. Лепшай жа, найбольш выразнай зьяўляецца тэма «Дождж у Вільні», а таксама «Беларус у Маскве».

Я вельмі высока ацэньваю зробленае, хоць анэкдатычнасьць сытуацыі мае месца: наяўнасьць саўндтрэку пры адсутнасьці фільму. Мо хто на беларускай «фабрыцы мрояў» зацікавіцца зробленым? Дальбог, які-небудзь «Слуцкі пацыент» ці «Настасься ў чорным» аніяк не страцяць!

**Контра-СЛУХАЧ**

## 3000 крокаў. Балады

Стылістыку альбому самі музыкі вызначылі як своеасаблівае сучаснае прачытаньне музыкі для даўняга савецкага кіно.



«3000 шагов. Баллады». Група «Цягні-штурхай». (p) «Вэст Рэкардс-плюс», 2005

Такая іх адкрытасьць, шчырасьць ня могуць не выклікаць павагі і многае адразу ставяць на свае месца.

Такім чынам, у тым, што робяць гэтыя звычайныя, вясёлыя менскія хлопцы, няма асаблівай інтрыгі, нейкіх загадак і прэтэнзій на нешта незвычайнае-асаблівае. Простыя мэлядычныя песенькі, ня надта арыгінальныя, але расьпеўныя, у нечым нават застольныя, якія, безумоўна, не «завядуць» дансінгавую аўдыторыю, але пры гэтым будуць вельмі да месца, скажам, у кампаніі, якая, прасьветленачыстая, выйшла з лазьні да накрытай паляны, ці за сямейным сталом, дзе пасьля ўжываньня смачных страў ды розных напояў душа просіць песьні. Той песьні, якую могуць разам засьпяваць як маладыя, так і тыя, хто выхаваны на «Кубанских казаках» і іншых «Волгах-Волгах».

У тым, што «Цягні-Штурхай» не хавае вытокаў сваёй творчай крыніцы, канечне ж, прысутнічае адна хітрынка. Нездарма ж такія песьні групы, як «Даль-чужына», адразу пачалі параўноўваць з тым сьлязьліва-патрыятычным попам, на якім яшчэ доўга будзе трымацца расейскае «Любэ». Цалкам магчыма, што па розных прычынах менскія «цягнікі» ня могуць выйсьці за межы стылістыкі, якая сама, няпрошаная, лезе ў вушы з кожнага, як сказаў галоўны музыколяг краіны, праса. Пры гэтым прыхільнасьць музыкаў, чые аднагодкі, здаецца, збольшага прыхільныя да куды больш сучаснай, агрэсіўнай нават стылістыкі, выклікае, прынамсі, пытаньні. Калі гэта проста стылізацыя таго, «што раньш было», дык гатовы скінуць капялюш. Калі гэта гульні падсьвядомасьці (скажу больш — вынік прапаганды «здаровага» савецкага побыту), дык прабачце, хлопцы, ад рэцэдываў варта пазбаўляцца радыкальным хірургічным чынам. Не цыганінай за мінулым, а рашучым ад яго адштурхоўваньнем.

«Цягні-Штурхай» сёньня — пэўная альтэрнатыва Сярогу, які прапагандуе, у прынцыпе, тую ж дваровую гарадзкую культуру, адно што ў рэпавай стылістыцы. Рэп, як вядома, пад акустычную гітару коштам савецкіх 6 р. 50 кап. ня выканаеш. Закранаючы адзін і той жа сацыяльна-музычны арэал, і «Цягні-Штурхай», і Сярога ствараюць гарадзкі фальклёр пачатку XXI ст. Можа, гэта дзіка прагучыць, але хто ведае: верагодна, у канцы стагодзьдзя навукоўцы будуць запісваць у старых менчукоў тэксты і мэлёдыі песень, імёны аўтараў якіх даўно згубіліся ў глыбінях шоў-бізнэсу. А сярод іх, напэўна, трапяцца і песьні «Цягні-Штурхая». І паставяць іх на палічку, якая знаходзіцца побач з той, на якой сёньня ёсьць запісы «Надзенькі» і да яе падобных твораў.

Хоць, прызнацца, да «Надзенькі» як найбольш яркага прыкладу жанру «Цягні-Штурхаю» трэба яшчэ дацягнуцца…

**Талкіенуты СЛУХАЧ**

# Амэрыка — неабжыты край

Лявон Вольскі з жонкай і прадусарам Ганнай вярнуўся са Злучаных Штатаў. Пра замежныя канцэрты, амэрыканскі лад жыцьця, справы беларускай эміграцыі ён расказаў «НН».

### Ламаньне стэрэатыпаў

У ЗША Вольскія трапілі толькі з другой спробы: пры канцы году ім не далі візы, і канцэрт прыйшлося адмяніць. Праз некалькі месяцаў пасольства перагледзела рашэньне і Лявон з Ганнай ізноў пачалі пакаваць валізкі. Тым ня менш, у Нью-Ёрк яны прыляцелі без багажу, і першым, што набылі, сталі зубныя шчоткі. «Прамежкавы» самалёт Варшава—Амстэрдам спазьніўся, і заставалася некалькі хвілін, каб прабегчы цераз тэрмінал і сесьці на самалёт да Нью-Ёрку. Багаж зьявіўся толькі праз пяць дзён.

Лявон за акіянам быў упершыню і меў, паводле ўласнага прызнаньня, стэрэатыпнае ўяўленьне пра ЗША: «Злыя палісмэны, нахабныя афраамэрыканцы, тлустыя людзі, вялікія машыны і агрэсіўная замежная палітыка». Але праведзеныя ў Штатах некалькі тыдняў змусілі беларускага музыку зьмяніць меркаваньне. «Ня думаў, што мне настолькі там спадабаецца. Па сутнасьці, Амэрыка — неабжыты край. Гэта я зразумеў, калі мы ехалі па Пэнсыльваніі — на дзясяткі кілямэтраў няма ні хаціны. І людзі ветлівыя ды карэктныя. Ганначка нават ноч правяла з афраамэрыканцам — на суседнім сядзеньні. Ехалі на звычайным рэйсавым аўтобусе чатырнаццаць гадзін разам зь небагатымі амэрыканцамі і мэксыканскімі рабочымі — усе выхаваныя і культурныя людзі», — апавядае Вольскі.

Лідэра «N.R.M.» зьдзівіла баязьлівасьць амэрыканцаў: «Яны баяцца, калі паўстаюць праблемы ў сувязі з рэлігійнымі, расавымі пытаньнямі. Судовую справу, зьвязаную з уцiскам на гэтай глебе, выйграць проста. І на бытавым узроўні гэтым можна карыстацца. Гаспадар здымных катэджаў забараніў на Каляды жыхарам свайго кварталу ставіць натуральныя ялінкі. Адзін беларус давёў, што рэлігія не дазваляе яму ставіць штучную, і амэрыканец саступіў».

### Крамбамбуля за $200

Для Ганны Вольскай асноўнае ўражаньне ад вандроўкі — амэрыканскія беларусы: «Станоўчыя людзі, разумныя і сьвядомыя, добра дасьведчаныя ў тым, што адбываецца ў нас. Прымалі нас звышцудоўна! Нашы маладыя людзі занятыя збольшага ў сфэры абслугоўваньня, працуюць афіцыянтамі, будаўнікамі — нават беларуская будаўнічая кантора ёсьць». Аднак, кажуць Вольскія, многія з новага пакаленьня беларусаў не цікавяцца беларускім эміграцыйным жыцьцём і дзівіліся, калі натрапілі на асяродак беларускай культуры ў Нью-Ёрку, дзе выступаў Вольскі. «Пасяджэньні беларускай дыяспары з урачыстымі прамовамі, абедам і народнымі сьпевамі для маладых беларусаў падаюцца занадта афіцыёзнымі і патаснымі, хоць ніводнага «чырвона-зялёнага» ў Амэрыцы мы не напаткалі, усе толькі пад бел-чырвона-белымі сьцягамі! Моладзевых імпрэзаў для беларусаў амаль няма, таму яны існуюць самі па сабе, — тлумачыць Вольскі. — Паваенная беларуская эміграцыя, што пабудавала на ўласныя грошы гэтыя куточкі беларушчыны, пацíху памірае». Паводле назіраньняў музыкі, маладыя беларусы маюць праблемы псыхалягічнага кшталту. Шмат хто ня можа дазволіць сабе зьезьдзіць на Радзіму, бо назад вярнуцца будзе цяжка. Да таго ж — фармальнасьці: легальнасьць пражываньня, дазвол на працу (некаторыя так і застаюцца нелегаламі). А вось фінансавай праблемы як такой няма. Адна дзяўчына на канцэрце Вольскага набыла бутэльку «Крамбамбулі» з аўкцыёну за 200 даляраў. Сказала, што досыць танна, бо гэта яе заробак за дзень.



VOLSKI.DA.RU

**ВОЛЬСКІЯ сярод амэрыканскіх беларусаў. Зьлева ў капелюшы й акулярах — Ганна, побач у акулярах, але без капелюша — Лявон.**

### Мэксыканцы на канцэрце

Сваімі канцэртамі Вольскі крыху разнастаіў жыцьцё амэрыканскіх беларусаў. Шмат для каго канцэрт рок-музыкі стаў ці не галоўнай культурнай падзеяй у іх эмігранцкім жыцьці, таму рыхтаваліся загадзя — сьцягі зрабілі, песьні развучылі. Усе канцэрты Вольскага прайшлі ў эмацыйнараскаваным рэчышчы. Мала хто моўчкі сядзеў на месцы. У тым ліку ў Кліўлэндзе, дзе сабралася публіка больш паважнага ўзросту, — нават яны патрабавалі «штонебудзь гарачае». Пасьля кожнага канцэрту — неафіцыйная частка. Пасьля першага выступу яна прайшла ў ірляндзка-беларускім пабе, на даху якога лунаюць амэрыканскі, ірляндзкі і беларускі сьцягі. У пабе быў нават музычны аўтамат зь беларускай музыкай: за даляр можна праслухаць на выбар чатыры песьні беларускіх выканаўцаў.

Самым складаным, але і запамінальным быў першы выступ — у штаце Дэлавэр, што на Атлянтычным узьбярэжжы: «Хваляваўся як ніколі, бо перад такой колькасьцю публікі (пад 150 чалавек) выступаў бяз тылу за сьпінай», — прызнаецца Лявон.

На канцэрты заходзілі ня толькі беларусы — было шмат украінцаў, расейцаў, амэрыканцаў, нават мэксыканец, якога так запаліла крамбамбульная «Тэкіла», што ён нават падпеў у прыпеве. На адным з канцэртаў частку песень на гітары падыграў хлопец зь Бярозаўкі.

Вольскі зьезьдзіў у Амэрыку з карысьцю для сябе і астатніх. Зьяднаў сваімі канцэртамі беларусаў — яны перазнаёміліся між сабой на Лявонавых выступленьнях у штатах Дэлавэр, Агаё, Нью-Джэрзі і Нью-Ёрку. Беларускі музыка адпачыў, прадэгуставаў зь дзясятак гатункаў піва, паглядзеў упершыню фільм «Акупацыя. Містэрыі» і пакінуў вялікі надпіс на жвіры ля акіяну — «Жыве Беларусь!».

Ганна кажа, што цяпер яны могуць рабіць турнэ па ўсіх буйных гарадах ЗША — столькі знаёмых у іх зьявілася. Беларусы з радасьцю гатовы прымаць музыкаў.

А музыкі плянуюць наведваць часьцей, кажучы: «Штатаў шмат, за раз не аб'езьдзіш».

**Сяргей Будкін**

### Убачыць Вольскага

**22 красавіка** веснавое абуджэньне напаткае адзін з праектаў Лявона Вольскага — «Крамбамбулю». У Менску апошні раз праект паказваўся ў сьнежні. Цяпер «Крамбамбуля» дае канцэрт у Моладзевым тэатры эстрады (Маскоўская, 18а). Вольскі кажа, што ў канцэрце «Крамбамбулі» скарыстае асноўную фішку залі — асьвятленьне.

У чысты чацьвер — **28 красавіка** — Лявон Вольскі адыграе свой сэт на сустрэчы з чытачамі «Нашай Нівы» ў Доме літаратара.

# Дзеці галяктыкі ў Доме літаратара

Літаратары ўсё яшчэ могуць зьбіраць поўныя залі гледачоў і слухачоў. Прынамсі, ка(сь)мічная вечарына Андрэя Хадановіча «Землякі: погляд з космасу» 12 красавіка ў Доме літаратара засьведчыла менавіта гэта: сядзячых месцы скончыліся задоўга да пачатку.

Хаця пачатак, як гэта водзіцца на беларускіх вечарынах, запазьніўся на паўгадзіны, тэатар «Ай» з пэрформансам «Сны Юр'я Гагарына» пад джазавыя сынкопы гурту «Рацыянальная дыета» прымусіў гледачоў дараваць спазьненьне. Іншапляняцяне на хадулях нагадалі прысутным, што сабраліся яны ўсё ж такі ў Дзень касманаўтыкі.

Хадановіч шаўмэнстваваў — чытаў лімэрыкі з новай кнігі й старыя вершы, вёў канфэранс і нават прасьпяваў уласны рэмэйк слыннае «Песьні пра зайцоў». У перапынках паміж выступамі Хадановіча на сцэну пасьпелі выбрацца іншыя дзеці галяктыкі. Уладзімер Арлоў — з успамінамі пра тое, як тата адхадзіў яго дзягай у Дзень касманаўтыкі за непрыстойны верш пра Валянціну Церашкову. Шалёная апладысмэнты сарвала заява пра «Беларусь — краіну касманаўтаў», працьму якіх можна ўбачыць на менскіх вуліцах падчас разнастайных акцый. Вальжына Морт — зь вершамі, у якіх не было ніводнага нецэнзурнага слова. Дуэт «4х8» — з хуліганскімі блюзамі, агучанымі шыкоўным голасам Дзяніса Лісейчыкава. Глеб Лабадзенка — з пагервершамі. Чыталі свае творы пра іншаплянэцян Віктар Жыбуль і Джэці, песьню «касьмічнага настрою» сьпяваў Зьміцер Сідаровіч.

Пры канцы вечарыны зноў сьпяваў Хадановіч — пераклады песень Леанарда Коэна. Яму дапамагала салістка гурту «Indiga» Руся. Вакалы відавочна кантраставалі... Не бяры ў галаву, Андрэй, — мы цябе цэнім за літаратурныя таленты!

**Адам Воршыч**

# «Ня рвіцеся ў рэвалюцыю»

Летась Украіна ператварылася ў палігон па выпрабаваньні паліттэхналягічнай зброі, якую зараз будуць выкарыстоўваць і ў беларускай палітыцы. Сваім поглядам «знутры» на падзеі аранжавай рэвалюцыі, а таксама меркаваньнямі аб піяры з карэспандэнтам «НН» падзяліўся прэзыдэнт Украінскай асацыяцыі *public relations* Георгі Пачапцоў.

**«НН»: Сп. Пачапцоў, пра «піяр» кажуць часта. Ці не маглі б Вы патлумачыць, што такое *public relations*?**

**Георгі Пачапцоў:** Піяр, у адрозьненьне ад рэклямы, стварае кантэксты ўспрыманьня тых ці іншых аб'ектаў. На рэкляму мы рэагуем дрэнна, бо гэта сытуацыя адкрытага навязваньня, а піяр зьяўляецца мяккім мэтадам, які прыдумалі для працы з свабоднымі людзьмі. Гэта антыпод загаду.

**«НН»: Калі казаць пра трох украінскіх прэзыдэнтаў — Краўчука, Кучму, Ючшанку, — як адрозьніваўся іх стыль працы з грамадзкасьцю?**

**ГП:** Адрозьніваўся ня столькі сам стыль, колькі час, у які кожны з прэзыдэнтаў прыходзіў. Краўчук быў сакратаром ЦК і меў важны камунікатыўны досьвед — быў удзельнікам перамоў з «Рухам». Для ўлады гэта быў першы публічны досьвед зносінаў: улада зьявілася на тэлеэкране побач з апазыцыяй як раўнапраўны ўдзельнік. Краўчук больш моцны ў зносінах.

Кучма, наадварот, быў максымальна закрыты. Яму цяжка даваліся зносіны з прэсай, аднак у яго былі моцныя прэс-сакратары.

У Ючшанкі прэс-служба пакуль не разгорнута. Апошні прыклад: спачатку прэзыдэнт сам выходзіў і забіраў заявы ад людзей, што стаяць ля будынку яго Сакратарыяту, цяпер пачалі выходзіць яго супрацоўнікі. Але гэта першабытная форма зносінаў з народам — немагчыма, каб прэзыдэнт асабіста ва ўсіх забіраў заявы. Цяпер прыдумана цэлае ўпраўленьне, якое бярэ заявы ды кажа: «Усе вашы просьбы мы а палове на дзявятую раніцы перадаём прэзыдэнту».

**«НН»: Тым ня менш, гэта было важнай часткай іміджу Ючшанкі як народнага лідэра…**

**ГП:** Ючшанка прыйшоў на агромністым уздыме ды велізарных чаканьнях насельніцтва. А чаканьні — рэч небясьпечная. Бо Аранжавая рэвалюцыя пачалася не з прычыны матэрыяльных праблем. Нядаўна была надрукавана статыстыка, адпаведна якой летась дабрабыт украінцаў вырас больш чым на 20%. Дык што гэта было? Былі парушаныя чаканьні. Людзі чакалі, што пачнуць жыць лепей, але хуткасьць паляпшэньня не вытрымлівалася. Гэта аб'ектыўны паказчык, які раздражняе больш за пагаршэньне становішча. Спэцыялісты па рэвалюцыях ведаюць: калі дрэннае матэрыяльнае становішча захоўваецца два гады, дык людзі на яго ўжо не рэагуюць — яны звыкаюцца да яго. А спэцыялісты па тэрарызьме карыстаюцца тэрмінам «заблякаваныя чаканьні», якія ў выніку могуць прывесьці да гвалту.



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**ГЕОРГІ ПАЧАПЦОЎ** — доктар філялягічных навук, прафэсар, загадчык катэдры інфармацыйнай палітыкі Нацыянальнай акадэміі дзяржаўнага кіраваньня пры прэзыдэнту Ўкраіны, прэзыдэнт Украінскай асацыяцыі *public relations*. Да 1 сакавіка працаваў кіраўніком Упраўленьня стратэгічных ініцыятыў Адміністрацыі прэзыдэнта Ўкраіны. Аўтар больш як 40 кніжак, прысьвечаных пытаньням сувязяў з грамадзкасьцю. У вольны час піша кнігі для дзяцей у жанры «фэнтэзі».

**«НН»: Якая піяр-акцыя ў часе Аранжавай рэвалюцыі была самай пасьяховай і якая — самай правальнай?**

**ГП:** Вельмі ўдалася цырымонія Ючшанкавага вылучэньня ў прэзыдэнты. Яна адбывалася на Сьпеўным полі, выглядала яскрава і нова. Януковіча вылучалі па-старому, партыйна-гаспадарча. А ў Ючшанкі была сымбалічна прадэманстравана прысутнасьць прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў. З гледзішча драматургіі вельмі прыгожа — ён зь дзецьмі, у атачэньні вялікай колькасьці людзей. Асноўныя характарыстыкі посьпеху вылучэньня Ючшанкі — масавасьць, відовішчнасьць і эстэтычнасьць.

Што да няўдач, дык, калі ўжо распачаўся Майдан, было цяжка ўтрымліваць людзей на пэўным узроўні актыўнасьці. Ад самага пачатку стаяла задача актывізаваць людзей, а з другога боку — утрымаць актыўнасьць у пэўных межах. А зрабіць гэта складана, бо масы людзей вельмі адносна падпарадкоўваюцца кіраваньню. Сапраўды, працавалі групы псыхолягаў, якія выцягвалі людзей, што «адхіляліся». Але быў і іншы бок, арганізаваны слаба, — людзі, якія вярталіся з Майдану дадому. Зь імі таксама тэарэтычна павінны былі працаваць псыхолягі. Выходзіла, што чалавека ўводзілі ў стан актыўнасьці, але выводзіць адтуль яго не было каму. Таму Майдан працаваў у двух рэгістрах: то як палітычны мітынг, то як рок-канцэрт.

**«НН»: Як Вы ацэньваеце дзеяньні расейскіх паліттэхнолягаў падчас Аранжавай рэвалюцыі?**

**ГП:** Пачну з таго, што ў Расеі зь яе «кіраванай дэмакратыяй» палітычны рынак згорнуты. Таму расейскія піяр-спэцыялісты масава рыхтуюцца да канвэрсіі — пераходу з абслугоўваньня палітыкі да абслугоўваньня бізнэсу ці да працы на сумежных тэрыторыях. Часьцей за ўсё называюцца Ўкраіна і Казахстан. Беларусь у такіх дыскусіях нават ня згадваецца.

Што да Аранжавай рэвалюцыі, то ў расейскіх паліттэхнолягаў апраўданьне лёгкае: «нас ня слухалі». Выбары ва Ўкраіне чарговы раз прадэманстравалі, што ўжо паказалі выбары ў Казахстане: расейскія паліттэхналёгіі не даюць выніку. Першы складнік правалу — другаснасьць: яны карыстаюцца старым адпрацаваным інструмэнтарам. Другая прычына — ёсьць разыходжаньні ў мэнтальнасьці расейцаў ды іншых народаў, таму іх тэхналёгіі працуюць ня ў поўнай ступені. Трэці складнік — праз тое, што расейцы «чужыя», яны могуць падымаць тэмпэратуру ў грамадзтве да любога градусу. Уявіце сабе акварыюм, у якім рыбкі плаваюць. Расейскія паліттэхнолягі будуць падымаць тэмпэратуру ў акварыюме так, як жадаюць, — бо яны ў ім ня рыбкі. Гэта яшчэ раз паказвае небясьпеку прыцягненьня чужых гульцоў. Апошні прыклад — Кіргізія: парлямэнцкія выбары расейскія паліттэхнолягі выйгралі, але ў выніку разваліла краіну.

**«НН»: Як усё, што адбывалася, паўплывала на імідж Украіны?**

**ГП:** Адбылося рэзкае паляпшэньне іміджу. Асьвятленьне — заўжды плюс. А тут яно яшчэ было й станоўчым. Правядзеньне рэклямнай кампаніі такога маштабу каштавала б некалькі мільярдаў даляраў. І грамадзкую думку, якая склалася ў выніку, будзе складана зьбіць — бо яна вельмі інэрцыйная. Калі раней яна была інэрцыйна ўвагнаная ў «нэгатыўную Ўкраіну», дык цяпер — ва «Ўкраіну пазытыўную». Цяпер нэгатыўныя факты ня так моцна паўплываюць на ўспрыманьне Ўкраіны заходнім чалавекам. Краіна зрабілася пазнавальнай: раней для амэрыканцаў было ўсё адно — што Ўкраіна, што Ўганда. А пазнавальнасьць — гэта самае важнае. Убіты цьвік, на які цяпер можна павесіць любую карціну, калі ўмець яе маляваць.

**«НН»: Наколькі цяпер развіты ва Ўкраіне рынак піяру?**

**ГП:** Піяр-спэцыяліст — зарэгістраваная спэцыяльнасьць ў рэестры Мінпрацы, але няма спэцыяльнасьці ў ВНУ — толькі спэцыялізацыя. Піяр адлюстроўвае адмысловы ўзровень фінансавых патокаў у краіне. Калі яго няма — піяру таксама няма. Вясковая ашчадкаса ня мае патрэбы ў піяр-спэцыялісце. Калі грашовыя плыні ў краіне дасягаюць пэўнага ўзроўню, дык інфраструктура абслугоўваньня гэтых вялікіх грошай вырастае аўтаматычна.

**«НН»: Ці слушна, што піяр абслугоўвае ў першую чаргу палітыку?**

**ГП:** Ва Ўкраіне ёсьць палітычны перакос — бізнэс-піяр несувымерна малы. Асноўныя грошы — палітычныя. Таму і сыстэма журналістыкі ў нас асаблівая — дакладней, была такой, бо ўжо можна ўмоўна лічыць, што мы вядзём гутарку пра мінулую эпоху. Такая журналістыка не працуе на самаакупнасьці — у яе ўкладаюцца палітычныя грошы, якія трансфармуюцца ў інфармацыйныя грошы для таго, каб зноў прынесьці эканамічны эфэкт. У гэтым ланцужку адсутнічае сам гэты гаротны спажывец, у якога няма грошай.

**«НН»: Кажуць, што ўсе рэвалюцыі ідуць па адным сцэнары. Ці праўда гэта?**

**ГП:** Істотных адрозьненьняў паміж рэвалюцыямі апошняга часу сапраўды няма. Мадэль практычна паўсюль тая самая. Для гэтай мадэлі важныя дзьве рэчы. Першая — няма сувязі з матэрыяльным становішчам людзей, а ёсьць сувязь з ідэяй. Другая — вельмі магутную ролю адыгрывае моладзь, і ня толькі ў нас, але і, напрыклад, у Лацінскай Амэрыцы ці сёньня ў Іране. І трэцяе, што ўсіх аб'ядноўвае, — гэта новая прыдумка, мэтадалёгія негвалтоўных дзеяньняў, прыдуманая Джынам Шарпам. Ён дэталёва распісаў 198 варыянтаў такіх дзеяньняў. Напрыклад, каб дэманстранты не баяліся, калі міліцыя грукае палкамі па шчытах, ім трэба стварыць свой гук, які будзе гучнейшы за гук міліцыі. Замест таго каб трымаць адзін сьцяг сьпераду, ставяць людзей са сьцягамі паўсюль — каб візуальна зачыніць прастору. Кожны дэманстрант атрымлівае асобнае канкрэтнае заданьне — так ён менш баіцца. Напрыклад, адзін сочыць за чысьцінёй тэрыторыі, другі — за мэдыцынай, трэці назірае за тым, што робіць міліцыя. Гэтая мэтадалёгія заснавана на тым, што дзяржава ня ведае, як адказваць на негвалтоўныя мэтады. Яе ўжылі ў Польшчы, Прыбалтыцы, Югаславіі, Грузіі, ва Ўкраіне. Не ўдалося ў Бірме ды Вэнэсуэле.

Расея цяпер пачала актыўна абмяркоўваць магчымасьці па стварэньні «сустрэчнай рэвалюцыі», якая магла б зьбіваць хвалю. Для гэтага ўлады таксама будуць абапірацца на пасіянарную частку грамадзтва.

**«НН»: А што тады было ў Кіргізіі? Там дзеяньні дэманстрантаў не былі цалкам негвалтоўныя.**

**ГП:** У Кіргізіі ўвогуле была дзіўная сытуацыя: там міліцыя проста сыходзіла з адміністрацыйных будынкаў, пакідаючы ключы на сталах. Адпаведна адной з гіпотэз, была праведзена падкілімная перадача ўлады з апорай на сілавыя структуры. Ў Бішкек увогуле ўвайшла вельмі невялікая колькасьць людзей, якія не ўяўлялі ніякай небясьпекі для ўлады. На поўдні было разгорнута яскравае відовішча, а гледачы ў сталіцы павінны былі на гэта зрэагаваць адпаведным чынам. Крамы ж маглі граміць тыя, хто ўспрыняў гульню ўсур'ёз. Бо, калі ўлада захацела, пагромы адразу спыніліся.

**«НН»: Наколькі важная наяўнасьць лідэра?**

**ГП:** Лідэр сапраўды патрэбны: людзям на абстрактныя ідэі цяжка рэагаваць. Але калі пляніроўшчыкі гэтым займаюцца, яны блякуюць іншых лідэраў, маўляў, «будзе адзін лідэр, а вас фінансаваць ніхто больш не зьбіраецца». Ёсьць яшчэ адно правіла: харызматычныя лідэры добрыя толькі тады, калі ёсьць посьпех. У адваротным выпадку яны адразу «выцьвітаюць».

**«НН»: Што б Вы пажадалі беларусам?**

**ГП:** Ня рвіцеся пасьпешна ў рэвалюцыю. Чаканьні далёка не заўсёды спраўджваюцца, і эканамічныя праблемы не вырашаюцца імгненна. І не забывайцеся: усе навукі накшталт піяру створаны для кіраваньня свабодным чалавекам, для таго, каб умацоўваць у яго ілюзію, што рашэньні прымае ён сам, хоць насамрэч гэта робіць за яго іншы.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

Самай вялікай удачай Ючшанкавай кампаніі была цырымонія вылучэньня ў прэзыдэнты. Ня ў залі, а на Сьпеўным полі, сьветла і маштабна.

Самым складаным было ўтрымліваць людзей на пэўным узроўні актыўнасьці, калі ўжо распачаўся Майдан.

Расейскія паліттэхналёгіі не даюць выніку ў суседніх краінах. Прычына — разыходжаньні ў мэнтальнасьці расейцаў ды іншых народаў. Расейцы могуць безадказна падымаць тэмпэратуру ў грамадзтве да любога градусу.

Харызматычныя лідэры добрыя тады, калі ёсьць посьпех. У адваротным выпадку яны адразу «выцьвітаюць».

Навука піяру створаная, каб умацоўваць у чалавека ілюзію, што рашэньні прымае ён сам, хоць гэта робіць за яго іншыя.

# Мама, мама і я — швэдзкая сям’я

У апошнія гады інстытут сям’і перажывае ў Швэцыі такія перамены, што рэформы заканадаўства не пасьпяваюць за імі. Маці ўсё часьцей выконваюць ролю бацькаў і наадварот. Болей гомасэксуальных шлюбаў. І хоць швэдзкая сям’я значна адрозьніваецца ад беларускай, расейскай ці польскай, ёй ад гэтага зусім ня блага.



«Сьмерць сям’і!» — заявіла ў 2001 г. Гудрун Шыман, якая стаяла тады на чале Левай партыі. Новым праграмным лёзунгам яна выклікала абурэньне, нягледзячы на запэўніваньні, што мэтай зьяўляецца барацьба не з уласна сям’ёй, а толькі з імпэратывам манагамнай сям’і (так званай «асноватворнай ячэйкі грамадзтва», што складаецца з маці, бацькі і іх агульных дзяцей), які абмяжоўвае свабоду асобы.

Шыман хацела прыцягнуць увагу СМІ — і ёй гэта ўдалося. У 2003 г. яна тыднямі не сыходзіла зь першых палос газэт дзякуючы сваім падатковым махінацыям, а нядаўна праславілася прапанопай увесьці спэцыяльны падатак для мужчын «на гвалт» (паводле яе, усе мужчыны павінны плаціць дзяржаве, бо сярод іх трапляюцца гвалтаўнікі і нягоднікі, якія б’юць жанчын).

Здавалася, што вайна, якую Шыман абвясьціла традыцыйнай мадэлі швэдзкай сям’і, ужо была выйграна…

## Неразьбярыха і бэбі-бум

З дакладу Галоўнага статыстычнага бюро можна дазнацца, што большасьць маладых швэдаў па-ранейшаму выхоўваюцца ў традыцыйных сем’ях і жывуць з абаімі біялягічнымі бацькамі. Часта саюз гэтых бацькоў застаецца незарэгістраваным — больш як палова дзяцей-першынцаў нараджаюцца па-за шлюбам.

У так званай «сярэдняй» сям’і рэвалюцыйныя зьмены зьведалі ролі бацькі і маці. Швэдзкая сям’я зьяўляецца сёньня адной з самых раўнапраўных у сьвеце: швэдзкія бацькі ўсё больш часу аддаюць выхаваньню дзяцей, а мамы ўсё часьцей працуюць на поўную стаўку.

Рост раўнапраўя жанчын і мужчын у сфэры апекі дзяцей адыграў вырашальную ролю ў тармажэньні дэмаграфічнага спаду — сучасная Швэцыя перажывае сапраўдны бэбі-бум.

Раўнапраўе паўплывала таксама на спосаб, якім бацькі вырашаюць сёньня «дзіцячае пытаньне» ў выпадку разводу: 96 працэнтаў захоўваюць адно для аднаго права на супольнае выхаваньне, і гэта ня проста пустая пастанова. З году ў год расьце колькасьць дзяцей, бацькі якіх вельмі дасло́ўна выконваюць прынятае ў судзе рашэньне і ідуць на ажыцьцяўленьне мадэлі «зьменнага выхаваньня». Дзеці жывуць па чарзе то з мамай, то з татам, найчасьцей перасяляючыся з дому ў дом раз на тыдзень. Калі ж бацькі бяруць новы шлюб, можа здарыцца, што ў жыцьці іх дзяцей зьяўляюцца, па-першае, айчым, па-другое, мачыха, а таксама магчымыя сваякі з аднаго і другога бакоў (прычым як родныя па крыві, так і дзеці новых партнэраў бацькоў, што паходзяць зь іх папярэдніх шлюбаў!).

Каб трохі разабрацца ў такой заблытанай сытуацыі, у публічны дыскурс пры абмеркаваньні пытаньняў сям’і ўводзяцца новыя тэрміны, напрыклад, «несапраўдны тата» ці «бонуснае дзіця». Ва ўжытак увайшла таксама фармулёўка «мае, твае, нашы дзеці», якая падкрэсьлівае далучанасьць бацькоў да выхаваньня ўсіх дзяцей, што ўваходзяць у склад постіндустрыяльнай сям’і, якая пашыраецца ў розных кірунках.

## Два таты, дзьве мамы

Яшчэ адной новай сямейнай формай у Швэцыі зьяўляюцца розныя віды гомасэксуальных сем’яў. Калі ў лютым 2003 г. рыксдаг прызнаў за гомасэксуалістамі права на ўсынаўленьне, у краіне жыло ўжо пад сорак тысяч дзяцей, што мелі аднаго гомасэксуальнага бацьку ці маці. Першым дзіцем, якое згодна з законам набыло дваіх гомасэксуальных бацькоў, быў двухгадовы Сыкстэн з Умэо — яго ўсынавіла Ганна Маркусан, жонка Сыкстэнавай біялягічнай мамы. На ўсынаўленьне даў згоду біялягічны бацька хлопчыка (у дадзеным выпадку донар спэрмы).

У дапаможніку для гомасэксуальных сямей Мія Лядален сьцьвярджае, што неўзабаве гомасэксуальныя сем’і зробяцца зусім звыклай і ардынарнай рэччу: «Я ўпэўнена, што праз пятнаццаць ці, можа, дваццаць гадоў структура сям’і зазнае карэнныя зьмены. Ніхто ня будзе дзівіцца, чуючы, што нехта мае дзьвюх мам або двух тат».




**Гудрун Шыман, дзяячка левага руху, прапанавала ўвесьці падатак для мужчын «на гвалт»: усе мужчыны павінны плаціць дзяржаве, бо сярод іх трапляюцца гвалтаўнікі і нягоднікі, якія б’юць жанчын.**

Да таго ж існуе куды больш варыянтаў гомасэксуальнай сям’і. Усё часьцей здараецца, што за сумеснае нараджэньне і выхаваньне патомства бяруцца дзьве гомасэксуальныя пары. Папулярны швэдзкі пісьменьнік-гумарыст Ёнас Гардэль выхоўвае сына разам са сваім мужам, знаным вядучым Маркам Левэнгудам, і дзьвюма сяброўкамі — гомасэксуальнымі мамамі (адна зь іх зьяўляецца біялягічнай мамай хлопчыка). Усе адчуваюць сябе паўнапраўнымі бацькамі малога Амаса, але з гледзішча закону апекунамі сына могуць быць толькі два чалавекі. Некаторыя юрысты ўжо намякаюць на неабходнасьць унясеньня ў сямейнае заканадаўства зьмен, якія стасаваліся б са зьменамі ў структуры сучаснай сям’і. Ганна Сынгель, доктар сямейнага права з унівэрсытэту Упсалы, лічыць, што сучасныя швэдзкія законы павінны дапускаць магчымасьць прызнаньня апекунамі дзіцяці адначасова больш чым дзьвюх асоб.

## Сям’я ў крызісе, але квітнее

З пункту гледжаньня кансэрватара, трансфармацыя інстытуту сям’і ў Швэцыі, напэўна, будзе праявай глыбокага крызісу: тут і высокі працэнт разводаў, і дзеці, якіх «перакідваюць» з дому ў дом, і гомасэксуальныя сем’і… Аднак калі крызіс інстытуту сям’і разумець як крызіс сямейных вартасьцяў, крызіс эмацыянальнай повязі паміж бацькамі і дзецьмі, а таксама крызіс выхаваўчай функцыі сям’і, то акажацца, што швэдзкая сям’я ня толькі не знаходзіцца ў крызісе, але і някепска пачуваецца.

Пытаньні сям’і і выхаваньня дзяцей тут — пастаянная і надзвычай сур’ёзная тэма грамадзкага абмеркаваньня. У Швэцыі расьце колькасьць шматдзетных сямей, а журналісты і грамадзкія дзеячы ўдзяляюць у гарачых дэбатах на тэму таго, як навучыцца ставіць дзецям абмежаваньні і ці варта пашырыць на аплатныя дэкрэтныя водпускі пэўную квотную сыстэму (сёньня бацькі могуць адвольна дзяліць сабой 480 дзён аплатнага водпуску па догляде дзіцяці, зь якіх 60 дзён могуць быць выкарыстаны толькі бацькам).

## Бацькі ў авангардзе

Швэдзкія бацькі знаходзяцца ў сусьветным авангардзе чытачоў выхаваўчых і ўсялякіх іншых дапаможнікаў на тэму сямейнага жыцьця. Пэрыядычным выданьнем, якое летась дасягнула найбольшага росту накладу (43 адсоткі), быў… часопіс для мацярок «Мама». Швэды, якія заўсёды славіліся сваёй любоўю да дзяцей, апошнім часам проста ашалелі. Дзеці і іх справы знаходзяцца ў цэнтры грамадзкай увагі.

Не зьяўляецца ўвадовачнай рэччу і тое, што дзеці зь сямей, у той ці іншай ступені «ненармальных», напрыклад, няпоўных, адчуваюць сябе ў Швэцыі горш, чым дзеці з «правільных» сямей. У 2002 г. швэдзкія псыхолягі — дагэтуль скептычна настроеныя адносна мадэлі «зьменнай апекі» — былі ўражаны вынікамі дасьледаваньняў, праведзеных вядомымі сямейнымі тэрапэўтамі Гунарам і Бэнгтэ Обэргамі. На працягу дваццаці год яны адсочвалі лёсы пяцідзесяці дзяцей, чые бацькі разьвяліся; 27 зь іх пасьля разводу бацькоў пазьменна жылі то з татам, то з мамай. У кнізе «Дарослыя дзеці разьведзеных расказваюць» Обэргі даводзяць: нішто не паказвае на тое, што дзеці разьведзеных бацькоў сутыкаюцца зь нейкімі спэцыфічнымі праблемамі ў дарослым жыцьці. Тыя зь іх, хто па чарзе жыў то ў мамы, то ў таты, вылучаліся папросту значна лепшым кантактам з бацькам, чым тыя, хто сустракаўся зь ім толькі ў выхадныя.

Обэргі лічаць, што дзеці валодаюць велізарнымі адаптацыйнымі здольнасьцямі, а іх пачуцьцё бясьпекі залежыць не ад таго, ці пастаянна яны начуюць пад адным і тым дахам, а ад таго, ці маюць яны добры кантакт з абаімі бацькамі і ці аказваюцца здольнымі бацькі пасьля разводу дамовіцца паміж сабой наконт сумеснага выхаваньня.

Дагэтуль ніхто яшчэ не прадставіў вынікаў дасьледаваньняў самаадчуваньня дзяцей, якія выхоўваліся гомасэксуалістамі. Гэтая тэма наагул уяўляецца табуяванай для швэдаў. Швэдзкія СМІ часьцей засяроджваюцца на палітычна карэктным пытаньні наконт права гомасэксуалістаў утвараць сям’ю.

## Мама Швэцыя і дзядзька Ёран

У 1950-х гадах Швэцыя яшчэ была асяродкам традыцый і патрыярхату — тыповая швэдзкая сям’я складалася з мужа, які працуе, яго жонкі — хатняй гаспадыні і іх дваіх дзяцей. Чаму грамадзтва, у якім за пяцьдзясят год адбыліся такія радыкальныя зьмены, не перажывае глыбокай фрустрацыі? Чаму амаль ніхто ў Швэцыі (за выняткам малаўплывовай партыі хрысьціянскіх дэмакратаў) не галосіць па распадзе традыцыйнай сям’і, а зьяўленьне ўсё новых сямейных утварэньняў не выклікае радыкальных эмоцый?

Эльза Кляесан, фэльетаністка газэты «Svenska Dagbladet», напісала неяк, што швэды жывуць у вялікай сям’і сацыяльнай дзяржавы. Сярэдні швэд за межамі сям’і мае яшчэ аднаго гаранта бясьпекі — чулую сацыяльна арыентаваную дзяржаву. Пакаленьне сёньняшніх маладых бацькоў выхоўвалася на тактоўна-прапагандысцкіх падручніках, напісаных сацыял-дэмакратамі, і хоць сёньня швэдзкая сацыяльная сыстэма перажывае крызіс, большасьць швэдаў захоўваюць ілюзію, што жывуць у найлепшай з магчымых дзяржаў — «мама Швэцыя» дапамагае выхоўваць дзяцей.

Магчыма, сыны і дочкі «мамы Швэцыі», пра якіх клапоціцца дзядзька — прэм’ер-міністар Ёран Пэрсан, не баяцца трансфармацыі інстытуту сям’і, бо іх «сямейная» сацыяльная дзяржава, якой шмат гадоў кіруюць сацыял-дэмакраты, забясьпечвае неабходнае для жыцьця пачуцьцё стабільнасьці. Магчыма, пад маскай дамінуючага ў СМІ палітычнага кансэнсусу хаваюцца магутныя эмоцыі і нявыказаная нязгода на пераступленьне пэўных рамак. Фактам, аднак, застаецца тое, што швэдзкая сям’я хоць і не падобная да постсавецкай, але зусім не выглядае менш шчасьлівай за яе.

**Паводле «Gazety Wyborczej»**

# Белпоп: мутацыі голасу

Працяг са старонкі 1.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Ізноў чарга, праўда, удзясяцера карацейшая. Стандартны набор рэчаў удзельніка конкурсу — тэрмас, гітара і тэлефон. «Мама, я хутка ўжо буду Там!» — гаворыць у слухаўку бялявая дзяўчына з выгляду год трынаццаці, робячы такі акцэнт на апошнім слове, нібы спраўдзілася галоўная яе мара. Ва ўмовах конкурсу пазначана, што ўзрост удзельнікаў павінен быць ад 15 да 25 год. Некаторыя ідуць на падман і накідваюць год-два ў анкетах, каб толькі выступіць. З такімі старшыня журы Аляксандар Ціхановіч суворы: «У вас яшчэ мутацыі голасу не адбылося. Да пабачэньня!» Збольшага ж журы добразычлівае. Ціхановіч зьвяртаецца да кожнага канкурсанта падкрэсьлена на «вы», называючы імя і імя па бацьку. Тым, хто асабліва падабаецца, дае парады, адвёўшы ўбок. Аляксандар Патліс, лідэр групы «Новы Ерусалім», падпявае ўдзельнікам. Выканаць яготую «Любоў у далонях» — найвышэйшы пілятаж, ня ў кожнага атрымліваецца, але ўсе ведаюць гэтую песьню — настолькі часта яна гучыць па радыё і на тэлеэкране. Зь бел-попу сьпяваюць Хлястова, Афанасьеву і Алесю. Сама Алеся эмацыйна рэагуе, калі чуе сваю песьню, нават крыху чырванее.

## Ад гімну да шансону

Рэпэртуар у канкурсантаў разнастайны. На рэгіянальным адборы выконвалі нават гімн Беларусі — паспрабуй, журы, «зарэж» пасьля гэтага…

Калі сьпяваюць па-беларуску, то абавязкова што-небудзь тужліва-акадэмічнае — «Рэчанька», «Купалінка», «Па-над белым пухам вішняў». Відавочна, з рэпэртуару музычных студый пры палацах моладзі. Калі Ціхановіч просіць што-небудзь моднае, дзяўчынкі прыгадваюць песьні расейскіх «Сливок», хлопцы — «Зверей». Як лякмусавая паперка для журы — просьба прасьпяваць «Падмаскоўныя вечары» ці «Кацюшу». Маўляў, гэтыя творы ведаюць усе, па іх проста вызначыць галасавыя даныя.

Канкурсантаў з голасам — сотні, з голасам і артыстызмам — дзясяткі, з голасам, артыстызмам і харызмай — адзінкі. Сяргей зь Віцебскай вобласьці паміж куплетамі песьні «Касіў Ясь канюшыну» эмацыйна чытаў рэп уласнага аўтарства, прычым выходзіла «па тэме». Ціхановіч ажно ўзьняўся са свайго месца, усе сябры журы пляскаюць у далоні рэкардсмэну па колькасьці часу, праведзенага на сцэне. Звычайна канкурсанты не затрымліваюцца і на 30 сэкундаў. «Люди встречаются, люди влюбляются-а-а-а…» — заводзіць няпэўным голасам канкурсантка-клон Надзеі Мікуліч. Журы: «Дастаткова!» Хлопца з магутным голасам таксама не затрымліваюць. Ціхановіч пазнае ў канкурсанту саліста аркестру Фінберга: «Мы вас ведаем, вы — у фінале».

## Вы ў фінале!

Нават самі арганізатары не разьлічвалі на такую колькасьць удзельнікаў — у кожным абласным цэнтры іх чакалі сотні маладых, прагных да папулярнасьці. Таму прыйшлося крыху зьмяніць рэглямэнт і ўвесьці прамежкавы адборачны тур сярод пераможцаў ва ўсіх абласьцях, каб адабраць удзельнікаў фіналу. Хоць конкурс праводзіўся на дзяржаўным узроўні — за арганізацыю на месцах адказвала раённая адміністрацыя, — некаторыя пераможцы з абласных цэнтраў прыехалі ў Менск за свае грошы. Праз тое, што журы раілася перад абвяшчэньнем вынікаў дзьве гадзіны, шмат хто спазьніўся на цягнік. Але фіналісты — імёны іх агучыла Настасься Ціхановіч — забыліся на ўсё на сьвеце. Зь некалькіх тысяч удзельнікаў у фінал трапілі 32 чалавекі. Цяпер зь імі будуць працаваць тэлевізійнікі, прадусары, іміджмэйкеры.

Па заканчэньні сябры журы прызнаваліся, што адбіраць фіналістаў было вельмі складана: «Якія таленавітыя людзі засталіся па-за фіналам!.. — шкадуе адна з арганізатараў конкурсу Зоя Гарына. — Бо мы не разьлічвалі, што іх будзе настолькі шмат. У спрэчных момантах перавагу аддавалі выгляду, прывабнасьці, бо праект тэлевізійны». Завадатары праекту ўпэўнены, што беларуская эстрада пакрысе можа вярнуць песьняроўска-верасоўскую славу з дапамогай такога праекту. Толькі ці магчымы гэты рэванш праз калькаваньне невысокіх стандартаў, закладзеных расейскай поп-музыкай?

«Атрымаўся паўтор «Фабрыкі», толькі ў беларускім фармаце, — гаворыць Аляксандар Патліс. — Каб поп-артысты засьпявалі па-беларуску, патрэбна зьмена пакаленьняў. Магчыма, адлік можна будзе весьці ад пераможцаў «Зорнага дыліжансу». Пакуль на беларускай эстрадзе няма ніводнага беларускамоўнага поп-праекту — сапраўдная прадусарская ніша. Сябар журы, прадусар і кампазытар, у мінулым музыка «Новага Неба» Леанід Шырын кажа, што бачыць будучыню ў задуме з «Зорным дыліжансам»: «Беларускасьць праекту ў тым, што задумваўся ён у Беларусі для беларусаў і рэалізуецца нашымі сіламі. Песьні пераможцам будуць пісаць айчынныя аўтары, гаварылася і пра беларускамоўныя песьні».

**Сяргей Будкін**



# Легальны шансон — што ляяльны бандыт

Шансон — адно з самых папулярных увасабленьняў папсы. Калі беларускі ўрад намагаецца стварыць паўнавартасную музычную сцэну, яму прыйдзецца ствараць і беларускі шансон. Ці магчыма гэта? Інтэрвію з выканаўцам Лёшам Чыканасам, піянерам «беларускага тутэйшага шансону».

**«НН»: Па-першае, што такое шансон?**

**Лёша Чыканас:** Тэрмін «шансон» у нашых умовах зазвычай выкарыстоўваецца некарэктна. Песьні французскіх шансаньe (ад якіх і пайшоў тэрмін) вельмі адрозьніваюцца ад таго, што мы разумеем пад гэтай зьвай. У нас пад шансонам разумеюць песьню, зьвязаную з крымінальнай субкультурай. Да гэтай плыні адносіцца перш за ўсе клясыка — Уцёсаў, браты Жамчужныя, Аркадзь Северны, Алена Камбурава, Натальля Мядзьведзева. Спачатку гэта была жывая музыка. Аднак на пачатку 1980-х сытуацыя зьмянілася. Адбыўся пераход ад традыцыйнай жывой рэтаранай музыкі да сынтэзатараў. Тэндэнцыя працягваецца. Напрыклад, Сярога. Нягледзячы на прысутнасьць крымінальных матываў, яго цяжка назваць клясычным шансаньe. Ён працуе недзе на стыку крымінальнай музыкі і хіп-хопу.

**«НН»: Ці здольны мінкульт штучна стварыць мясцовы шансон, які б мог канкураваць з расейскім?**

**ЛЧ:** Улады не ўсьведамляюць: шансон — гэта музыка ізгояў, яна заўсёды антысыстэмная. Яна можа інтэгравацца ў маскультуру толькі ва ўмовах дэмакратычнага грамадзтва, якое спакойна прызнае наяўнасьць такога фэномэну, як злачыннасьць.

Працяг на старонцы 17.

# Пяцьдзясят кілябайтаў жыцьця

Калісь дзёньнікі заводзілі, каб іх ніхто ня ўбачыў. Цяпер іх заводзяць, каб убачылі ўсе. У сеціве існуе ўжо не адна сотня беларускіх інтэрнэт-дзёньнікаў (па-ангельску — блогаў), большасьць зь якіх гуртуецца на партале «Livejournal.com». Пяцьдзясят кілябайтаў — столькі ў сярэднім займае адна старонка блогу. У рэальным жыцьці гэта адпавядае цэламу тыдню.
Інтэрнэт-дзёньнікі – віртуальная забаўка для рэальных людзей.

## Balachon



Сяргей Балахонаў салодка пацягваецца — ажно косьці хрусьцяць. Сёньня адна з тых раніц, калі ня трэба сьпяшацца на працу. Ён усьміхаецца, і заспаны манітор, які атабарыўся на раскладным стале эпохі Машэрава, паволі расплюшчвае сваё электроннае вока. Мадэм верашчыць, спрабуючы прабіцца ў сеціва праз павуціньне гомельскага тэлефоннага дроту. Але «пан настаўнік» не нэрвуецца і не сьпяшаецца. Навокал — працоўны вэрхал. Справа — кубак з гарбатай, зьлева — сподачак з «вычварэнскімі бутэрбродамі» (белы хлеб з маслам, кілбасой, сырам і крабавымі палачкамі). А яшчэ чырвоны нататнік, дыск з антывіруснымі праграмамі, кніга Хадановіча «Старыя вершы», 18-ты выпуск «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы», нямецка-расейскі слоўнік, старонкі гомельскіх газэт, шпулька з капронавымі ніткамі, пустая піяла, бутэлечка з клеем ПВА. Давяршае карціну тоўсты сшытак зь незавершаным творам.

Нарэшце, злучэньне наладжана. Сяргей Балахонаў зьнікае — замест яго зьяўляецца Balachon, аўтар дзёньніку «Вяртаньне на крукі свая».

Папяровы дзёньнік Сяргей Балахонаў пачаў весьці яшчэ ў 1995 г. Летась даведаўся ад Тасі, сяброўкі па ліставаньні, пра інтэрнэт-дзёньнікі, якія можа прачытаць хоць мільён чалавек. «Гэтага немагчыма дасягнуць, ведучы дзёньнік папяровы», — скеміў Сяргей Балахонаў. Так нарадзіўся Balachon. Ён ідзе па жыцьці нясьпешна, прыглядаючыся. Убачыў, падумаў, запісаў. Вось, напрыклад, суботнік правялі. Чым не нагода для разваг? «Як на добры розум, талака магла б стаць часткай беларускага карнавалу: з ранку работы на карысьць дзяржавы, а пазьней — сьвяточныя шэсьці, гульні, карагоды».

Сталы аўтар «НН», Сяргей Балахонаў інтуітыўна падзяляе ўражаньні: «Гэта — для чарговага эсэ ў «Нашу Ніву», а гэта — у «Вяртаньне на крукі свая». Самацэнзура? Не — дыфэрэнцыяцыя.

## Марыйка



Летась, калі Марыйка стварала свой дзёньнік, за акном ішоў восеньскі дождж. Ёй захацелася сонца — так нарадзілся яе Мэсгана, Марыйчына інтэрнэт-пераўвасабленьне. Такім чынам, у жыцьці яна асьпірантка філфаку БДУ ды перакладчыца, а ў сеціве — афрыканка, якая жыве на старонцы з назвай «Маё Кіліманджара».

Пад дахам свайго дзёньніку Марыйка-Мэсгана стварыла яшчэ й жаночы інтэрнэт-клюб. «Чытаць гэтыя запісы могуць толькі паненкі або мужчыны, якія віртуальна «апранаюцца» ў кабет. Там я пішу і абмяркоўваю зь сяброўкамі ўсялякія бздуры пра касмэтыку, абноўкі і хлопцаў». Вядома, гэтыя тэмы падступна перапаўзаюць і на асноўныя старонкі дзёньніка: «22 сакавіка, 6:52 pm. Зім, а зім… А можа, пайшла б ты ўжо, га? Я сёньня купіла на ўсю стыпэндыю файны палітончык і хачу ў ім фарсіць! І бяз шапкі!!!»

Але ўсё-такі цэнтрам плянэтарнай сыстэмы Марыйчынага дзёньніка зьяўляецца зорка Літаратура — менавіта вакол яе, нібы чародка астэроідаў, круцяцца большасьць запісаў. «Беларускі народ — народ вельмі дзіўны і ў пэўным сэнсе першабытны. Гэта народ, які не разумее прозы. Калі хочаш данесьці да людзей ісьціну — напішы верш», — піша Марыйка ў дзёньніку. Тым творцам, якія ня могуць данесьці да нас праўду па-беларуску, Марыйка дапамагае — у дзёньніку стала зьяўляюцца яе пераклады.

«Кожнага разу, як выцягваю з шафы дарожную зялёную касмэтычку з аранжавай мыльніцай унутры, настрой паляпшаецца. А яшчэ чорны заплечнік», — занатоўвае Марыйка і марыць пра лета.

## Zmila



Зьміцер Лапцёнак — прагматыст, і кампутар для яго — галоўны інструмэнт. Праца не перашкаджае яму весьці інтэрнэт-дзёньнік, нават наадварот. Zmila піша паведамленьні перад працай, пасьля, у перапынках. Здараецца — і замест яе. Умовы ідэальныя: чысьцюткі офіс, ультрасучасны пляскаты манітор, падзеленая на дзьве часткі эрганамічная клявіятура, адмыслова падагнаная да ягоных рук. Акрамя тэхнікі, на стале нічагуткі.

Зьміцер нават і ня памятае, калі пачаў весьці першы дзёньнік — два гады таму, тры?.. «Для мяне гэта хобі, забаўка, вясёлае марнаваньне часу». Першы ягоны блог быў цалкам на эспэранта, цяперашні — дзьвюхмоўны.

Зьмітровы запісы — гэта караценькія бразготкі-цікавосткі, найчасьцей лінгвістычныя. Zmila любіць гульні са словам. «Раварушыя, пра якую так доўга казалі байкевікі, свелопедилась!» — такім моўным фаервэркам адсьвяткаваў ён набыцьцё новага ровара.

Але самыя элегантныя камбінацыі літар ды сэнсаў прыходзяць да Зьмітра на эспэранта. Але, каб іх належным чынам ацаніць, трэба мець адпаведныя веды. Таму, калі Zmila не жадае, каб ягоныя запісы чыталі выпадковыя людзі, ён пакідае іх безь перакладу. Пачытаўшы дзёньнік, нават той, каму раней да эспэранта не было ніякай справы, міжволі пачынае адчуваць цікавасьць да гэтай мовы. Ну хто з нас ведае, што ў новым блякбастэры «Блэйд: тройца» дзеяньне адбываецца ў невядомым горадзе, дзе ўжываюцца дзьве мовы — ангельская ды эспэранта? Праўда, Зьміцер заўважыў толькі адзін такі надпіс: «Policejo» (паліцыя). Хто пойдзе на фільм, хай прыглядаецца!

## Rydel



Ягоны першы сапраўдны французскі пацалунак надарыўся ў ЗША зь ВІЧ-інфікаванай дзяўчынай. Ягоны спорт — трапныя пляўкі на шыбы прэзыдэнцкіх мэрсэдэсаў ды боўлінг, ягоны ўлюбёны адпачынак — сядзець на даху дзевяціпавярховіку, зьвесіўшы ногі ўніз. Ён, бадай што, адзін зь першых грамадзян незалежнай Беларусі, які ажаніўся з альбанкай ды завёў сабе адрас электроннай пошты — у 1993 г. Гэта — Уладзімер Каткоўскі, вэб-рэдактар радыё «Свабода», у сеціве больш вядомы як Rydel — аўтар аднаго з найбольш рэйтынгавых беларускіх блогаў.

Запісы Ўладзімера — гэта ўжо не літаратура, а, хутчэй, журналістыка. Ён вядзе іх па-беларуску ды па-ангельску, пісьменна, цікава, вычарпальна. Тым з замежнікаў, хто цьмяна ўяўляе сабе, што такое Беларусь, варта сюды зазірнуць — англамоўныя развагі пра беларускае жыцьцё ў сеціве трапляюцца нячаста. Замежнікі чытаюць, зьдзіўляюцца, спрачаюцца, згаджаюцца.

Беларусам таксама ёсьць пра што паразважаць разам з Уладзімерам: «17 сакавіка, 8:19 pm. І калі беларуская мова была «знакам бяды», то расейская мова была і застаецца ў Беларусі мовай кантролю. І мовай рабоў, якіх кантралююць з дапамогай гэтай мовы. Толькі не кажэце пра гэта сваім расейскамоўным сябрам». А калі не паразважаць, дык хаця б падзівіцца на фота кветачкі-падбелу, што распусьцілася каля помніка Францішку Скарыну ў Празе.

## Снайпэрка



Вечар цяжкага дня. Снайпэрка едзе ў набітым вагоне мэтро. Адной рукой яна трымаецца за парэнчы, у другой — мабільнік. Снайпэрка набірае SMS-паведамленьне. Самой сабе. Памяць тэлефона захавае яе думку, пакуль сеціва недаступнае.

«Дзёньнік — мая зона камфорту», — гаворыць Снайпэрка. Яна прыходзіць дадому ды захінаецца ў любімы сіні плед, бярэ ў рукі кубачак матэ ці кілішак марціні (адпаведна настрою) ды сядае за кампутар у сваім пакоі. Гадзіньнікі — прэч! «Страшна падумаць, колькі насамрэч дзёньнік займае часу», — кажа яна. Аніякай музыкі: «Ад яе блытаецца сьвядомасьць».

Звычайна Снайпэрка робіць запісы ў дзёньнік тройчы на дзень: перад сьняданкам — думкі, што наведалі яе ўночы; падчас абеду — дзённыя меркаваньні пра сьвет; пасьля вячэры — абагульняльны роздум. «Гэта, канечне, калі не здараецца нічога звышардынарнага, як, скажам, падарожжа, імпрэза ці сварка з чарговым бойфрэндам». Калі чарговыя тэрміновыя сказы нарадзіліся ў цягніку ці кавярні, іх лёс няпэўны: сьпярша будуць запісаны на сурвэтцы, потым, ля найбліжэйшага кампутара, пройдуць жорсткую цэнзуру на актуальнасьць і, магчыма, патрапяць у сусьветнае павуціньне.

Першы Снайпэрчын інтэрнэт-дзёньнік ужо сышоў у нябыт, другі яшчэ «вісіць» у сеціве. «Як добра, калі можна наманіць усім, нібы «абанэнт часова застрэліўся», і прыйсьці ў пустую кватэру, няхай бэдламную — але сваю, праз адсутнасьць электрычнасьці запаліць сьвечкі, заваліцца на імправізаваны ложак і да адключкі размаўляць з кашаком, нібы ён нешта разумее».

Як і першыя два, трэці дзёньнік Снайпэркі — «Прыхаванае і падсьвядомае» — гэта «грошы, зэканомленыя на псыхааналітыку». Запісы ў дзёньніку — камячкі эмоцый, якія яна выкідае ў сьметніцу сеціва. «4 красавіка, 9:49 pm. Галоўнае ня ўдзел. Галоўнае — перамога», — піша Снайпэрка. І зь ёй міжволі згаджаешся.

**Алесь Кудрыцкі**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**МАРЫЙКА-МЭСГАНА пад дахам свайго дзёньніку стварыла жаночы інтэрнэт-клюб. Уваходзіць могуць толькі паненкі або мужчыны, якія віртуальна «апранаюцца» ў кабет.**

Адрасы інтэрнэт-дзёньнікаў:
Сяргей Балахонаў — http://www.livejournal.com/users/balachon;
Марыйка Мартысевіч — http://www.livejournal.com/userinfo.bml?user=maryjka_;
Зьміцер Лапцёнак — http://www.livejournal.com/userinfo.bml?user=zmila;
Уладзімер Каткоўскі — http://www.livejournal.com/userinfo.bml?user=rydel23;
Снайпэрка — http://www.livejournal.com/users/snajper.

# Pro publico bono

Што мы атрымалі ад «вяртаньня клясычнага правапісу»? Раскол у беларускай супольнасьці. Украінцы паступілі мудрэй, ня ставілі правапіснае пытаньне папярод цягніка. І прасунуліся нашмат далей у нацыятварэньні. Трэба спыніць раскол у беларускай супольнасьці, мяркуе наш чытач з Горадні **Юры Тарасевіч**.

Захапленьне «рэпрэсаваным» правапісам Тарашкевіча ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х было зразумелай рэакцыяй на вызваленьне ад таталітарызму, хоць і было зафарбавана нігілізмам. Аднак пазьней прынцыповае супрацьпастаўленьне «тарашкевіцы» і «нетарашкевіцы», якое тарнавалася часткаю адраджэнскага руху, учыніла дадатковы падзел у супольнасьці і не стварыла ніякіх пэрспэктыў, што маглі б «акупіць» шкоду.

Сапраўды, якія нацыянальныя беларускія праблемы разьвязвала б гіпатэтычнае ўвядзеньне «рэфармаванага клясычнага правапісу»? Што гэта наагул такое, па-за відавочнымі фармалізмамі «мяккага знаку» і «правапісу запазычаньняў»?

Само азначэньне «клясычны» — наваскаб, «укінуты» ва ўжытак ля 2000 г. Перад тым артаграфію называлі «тарашкевіцай», «дарэформавай» і нават «беларускай мовай... Купалы, Гарэцкага, Луцкевіча... без уліку пастановы СНК... 1933» («Свабода», студзень 1991).

Прыгадаем, што пасьля 1918 г. у нас не было іншых ліній разьвіцьця правапісу, апроч тарашкевічавай, што і 1933 г., і 1959 г., і апошні «праект» — усе выводзяцца з працы Карскага і афармленьня Тарашкевіча 1918 г., усе дастаткова блізкія да гэтай асновы.

Таму ўсе «нэатарашкевіцы», што зьяўляюцца цягам пятнаццаці гадоў, грунтуюцца на правапісе ўзору 1959 г. і што як што, а «мяккі знак» і «правапіс запазычаньняў» дадаюць абавязкова (рэшта — паводле густу галоўнага рэдактара або карэктара). Якраз такая сытуацыя мусіла б насьцярожыць, але не туды тое.

Але, можа, нам прапануюць нешта дужа **патрэбнае**? Калі і даюць нейкія **аргумэнты**, то, па-за ярлыкамі («русіфікацыі» і «камуністычнасьці»), заўсёды пачынаюць і канчаюць на «фанэтычнасьці».

* * *

О, сьвятая Фанэтычнасьць! Ці не зашмат «носяцца» ў нас зь ёю, ці не зашмат ёй пашаны, зважаючы, што ад самага 1918 г. гэта невычэрпная крыніца спрэчак і звадаў? Тады спрачаліся, як пісаць «не», і ў кожнага выходзіла правільна паводле фанэтыкі. У 1926-м ізноў спрачаліся, як пісаць «не», і кожны меў рацыю, зноўку паводле яе. Цяпер хочуць пісаць «мэдЫнстытут», і што б вы думалі? Гэта пацьвярджаецца беларускай фанэтыкай! А ці не зашмат правілаў, якія мелі б улічваць штосьці, што часта існуе выключна ў разуменьні таго, каму цікавае зацьвярджэньне «улюбёнага» правіла? Прытым што ўласна «фанэтычны прынцып» будовы правапісу ніхто ў нас не адбіраў; прытым што поўная фанэтычнасьць дасягальная хіба толькі ў Міжнародным фанэтычным альфабэце, усякі ж іншы запіс жывога маўленьня абавязкова трымаецца на ўмоўнасьцях, кампрамісах.

«Забываюцца», што ніяк не ўдаецца вымавіць «фанэтычна правільнае» слова, якое іншы мог бы пачуць і запісаць, без адзіных вывучаных правілаў вымаўленьня. І такім непатрэбным выглядае ўпісваць паўсюль кастыль — мяккі знак ці пісаць два гукі пяцьцю літарамі. Добрая фанэтычнасьць! А пра гэта ж казалі калісьці Ластоўскі і Лёсік (цяпер пра гэта «ня памятаюць»).

А няхай бы адкрыта казалі сёньняшнія рупліўцы «асыміляцыйнай мяккасьці» (і цьвёрдасьці) — маўляў, наша эстэтычнае пачуцьцё ёсьць мера ўсіх рэчаў, нам больш падабаецца пісаць запазычаныя словы як мага далей ад расейскага варыянту, нам маніцца хутчэй вярнуцца ў «культурнае ўлоньне Эўропы» (быццам туды ўваходзяць з дапамогаю правапісу).

* * *

Урэшце, час сказаць і пра вяроўку. Вымаўляюць ужо даўно — ня так. Гаворак, апісваных Карскім, — няма. Войны, акупацыі, пазьней — тэле-радыё-кіно. Калі «ісьці за народным маўленьнем», то напэўна ня можа быць ніякіх «мЭдЫнстытутаў».

І што тут за дзіва? 70 гадоў беларускае школьніцтва і вышэйшая адукацыя працуюць паводле «новага» правапісу — а гэта тры пакаленьні. Тое самае — беларуская літаратура (і Быкаў, і Караткевіч). Тое самае — беларускае кнігі і прэса (мо зьдзіўлю каго — «НН» далёка ня ўся беларуская прэса). Іначай кажучы, калі пераважная большасьць цяпер і ведае (ведала) які правапіс, то «новы», калі ў беларускай мове і літаратуры існуе хоць якая пасьлядоўнасьць, традыцыя, то яна аформлена ў «новым» правапісе.

Гэта можа не падабацца. Неразумна не лічыцца з гэтым. Урэшце, гэта трэба прымаць як факт. Змаганьне **з фактамі** — ці не найгоршае, што мы маглі б цяпер чыніць.

І вось што мы **ўжо цяпер**, яшчэ **да** ўсіх увядзеньняў, атрымліваем ад кампаніі па «рэстаўрацыі ісьціннага правапісу»? Раскол у беларускай супольнасьці.

Зрэшты, ніхто з прапагандуючых ня мае насамрэч намеру лічыцца зь нейкім там «народным выбарам», бо «важна тое, што выбіраюць **эліты**» (напрыклад, свабодаўская перадача за 18 верасьня).

Цікава, што аб'ектыўна тут супадаюць інтарэсы як актывістаў «вяртаньня клясычнага правапісу», так і тых сілаў цемры, зь якімі яны быццам змагаюцца. Схізма, аўтаркія і зьнікненьне беларускай супольнасьці цалкам задавальняюць як суседзяў зьлева і справа, так і ўласныя (баюся, самазваныя) «эліты». Цікава таксама, што ўсё, што пры гэтым патрабуецца ад «непрыяцеляў», — не замінаць, а нават трошкі заахвочваць.

І калі нашым правадырам заманаецца, што, «калі мы прыйдзем да ўлады, адразу паставім пытаньне правапісу на дзяржаўным узроўні», то гэта стала б апошняю саломінай, але ня той, за якую хапаецца тапелец, а тою, якая дарэшты ломіць сьпіну.

Урэшце, калі б менавіта ў **нашай** супольнасьці меліся здольнасьці чыніць дзяржаўны прымус у такіх маштабах, то мы сёньня не знаходзіліся б там, дзе знаходзімся. Але гэта тэма ўжо для іншай гутаркі.

* * *

Калі адхіліць «мяккі знак» і «правапіс запазычаньняў», то на цэлы «асобны правапіс» аніяк не набіраецца матэрыялу. Трэба адкінуць фанабэрыю й сыстэматычна працаваць над тымі праблемамі, якія сапраўды нас мучаць.

Бо вядома — такія праблемы ёсьць! Але тыя выйсьці, якія так ёміста акрэсьлены, напрыклад, у лісьце сп.Каляды ў адным са студзеньскіх нумароў «НН», вядуць у багну.

Калі гаворка пра выйсьці для ўсёй супольнасьці, то не абысьціся без прызнаньня легітымнасьці тройчы клятага Інстытуту мовазнаўства. І, магчыма, давядзецца абысьціся (о жах!) нават без пэрспэктывы займець «помнік самому сабе».

Што ж, як казалі нашы славутыя землякі, «pro publico bono»?

**Юры Тарасевіч, інжынэр-інфарматык, Горадня**

## Ад Рэдакцыі

Спадар Тарасевіч працягвае спрэчку, якая сваёю зацятасьцю дараўноўвае рэлігійным. Гэта трохі нагадвае Візантыю, дзе таксама працягвалі спрачацца над тонкасьцямі разуменьня Хрыстовае багасутнасьці, калі небясьпека навісла над самой артадаксальна-хрысьціянскай цывілізацыяй. Пазыцыя «НН» — не пара мяняць нешта ў правапісным статус-кво, а тым больш канчаткова вырашаць пытаньне правапісу. Гэта можа адбыцца толькі ў дэмакратычнай Беларусі, рашэньнем аўтарытэтаў, без палітычнага ціску. Пагатоў што ёсьць выданьні, дзе паралельна друкуюцца тэксты ў розных правапісах, і гэта нікому, здаецца, не абцяжарвае чытаньня.

Зь іншага боку, ці выстаяла б традыцыя грэцкай царквы калі б не адзінства ў пытаньнях веры? У нашым выпадку — калі мы ня вызначыліся, які правапіс «праваслаўны».

Нешматлікасьць выданьняў, якія трымаюцца клясычнага правапісу, адсутнасьць навучальных установаў, што перайшлі б на яго, дый непапраўная зацяжка з стварэньнем Зводу яго правілаў (патрэбны ён быў у сярэдзіне 1990-х) дадаюць козыраў скептыкам у дачыненьні да яго пэрспэктываў. Трэба гэта прызнаць. Сьціхлі ідэолягі «вяртаньня правапісу зьнізу» — маўчаць Вячорка, Дубавец. Даўно не выступалі яны з публікацыямі на правапісныя тэмы. А ідэалягічна блізкі да іх часопіс «Дзеяслоў» карыстаецца сваім наватворным, напаўклясычным правапісам.

Зь іншага боку, беларускамоўны Інтэрнэт масава карыстаецца клясычным правапісам (калі там увогуле трымаюцца нейкіх правілаў). Гэта факт, і важны факт. Выпадкаў, каб беларускамоўныя трымаліся, як за багасутнасьць, за наркамаўскі правапіс, дужа мала.

Для расейскамоўных беларусаў правапіс «зь мяккімі знакамі» застаецца — тут спадар Тарасевіч мае рацыю — нечым нязвыклым і нават чужым. Калі мы думаем пра нацыянальнае адзінства і нацыятварэньне, гэта таксама фактар, які мусім улічваць.

Урэшце, плюралізм абавязвае. Раз сп.інж.Тарасевіч лічыць важным актуалізаваць моўную праблему, мы друкуем ягоны ліст. Чакаем рацыянальных водгукаў. Просім: без заўзяцьця. Не дзялімася.

# 18 красавіка — зробім Беларусь чысьцейшай!

18 красавіка абвешчаны *UNESCO* Міжнародным днём аховы помнікаў і славутасьцяў.

У кожнай вобласьці, у кожным раёне абавязкова знойдуцца занядбаныя панскія сядзібы, руіны цэркваў і касьцёлаў, схаваныя ў кустоўі старыя могілкі… Усе тыя помнікі, якія, можа, і ўключаны ў дзяржаўны сьпіс, аднак праз сваю непэрспэктыўнасьць ці зь іншых прычынаў застаюцца па-за ўвагай грамадзкасьці.

Аднак мы можам зьмяніць сваімі сіламі гэтую сытуацыю. Усё, што патрабуецца, — даведацца, якія помнікі гісторыі і культуры ёсьць у вашым раёне, вызначыць, што карыснага вы можаце зрабіць на гэтым аб'екце, і выехаць на яго на выхадныя зь сябрамі. Вы цудоўна праведзяце час, падыхаеце сьвежым паветрам і зробіце добрую справу.

Ня трэба чакаць дапамогі і наракаць на кагосьці — захаваньне нашай спадчыны ў нашых руках.

Мы прапануем пералік аб'ектаў на Меншчыне, якія патрабуць догляду. Сьпіс няпоўны, аднак і ён дае магчымасьць выбару.

**«Парк камянёў»** у сталічным мікраёне Уручча. Унікальны музэй, у якім знаходзяцца дзясяткі валуноў, прывезеных з усёй краіны. На сёньня парк стаў месцам адпачынку і таму моцна забруджаны.

**Сёмкава.** На паўночны захад ад Менску. Сядзіба апошняга менскага ваяводы А.Хмары канца XVIII ст. Захаваліся руіны самой сядзібы і два флігелі. Каля комплексу разьмешчана школа-інтэрнат. Аб'ект трэба пачысьціць ад сьмецьця і кустоўя.

**Сьмілавічы (Ігуменскі раён).** Нэагатычны палац XIX ст. У адной палове будынку разьмяшчаецца каледж, другая палова паступова разбураецца. З гэтым палацам зьвязаны лёс знакамітага кампазытара С.Манюшкі і мастака В.Ваньковіча.

**Ракаў**. Каталіцкія могілкі (XIX ст.) патрабуюць добраўпарадкаваньня. На праваслаўных могілках сытуацыя ўвогуле катастрафічная: пасьля праведзеных тут нядаўна будаўнічых работ яны амаль што разбураныя.

**Плябань** (на дарозе Менск—Маладэчна). Могілкі XVIII ст., месца пахаваньня паўстанцаў 1863 г. Могілкі моцна зарасьлі кустоўем.

**Вялікія Навасёлкі (пад Койданавым).** Закінутыя каталіцкія могілкі, дзе пахаваны мастак і пісьменьнік Карусь Каганец. На ўскрайку могілак — сьметнік.

**Станькава (пад Койданавым).** Маёнтак Чапскіх.

**16—17 красавіка культурна-краязнаўчыя арганізацыі Менску «Этна», «Дыярыюш», «Побач» арганізоўваюць прыбіраньне гістарычных мясьцін Ракава. Далучайцеся…**

**Павел Каралёў — «Этна» (8-029-776-24-35);**

**Цімох Акудовіч — «Дыярыюш» (8-029-557-11-24).**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail:nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на с. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.

За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб.

Аформленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 см² — 650 руб.

Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.

На зваротным баку бланка паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

Даведкі праз т. (017) 284-73-29

# «Нацыянал-камунізм грунтаваўся на пяску»

Што магло б уратаваць Беларусь ад сталінскага генацыду? Паўстаньне, аддзяленьне, абвяшчэньне незалежнасьці? Роўна 75 гадоў таму з працэсу «Саюзу вызваленьня Беларусі» пачаўся разгром нацыянальнае эліты сталіністамі. Паводле справы «СВБ» прайшло 108 чалавек. У позьнесавецкі пэрыяд дасьледчыкі выстаўлялі «СВБ» прыдумкай чэкістаў, а ягоных нібыта «кіраўнікоў» на чале з Усеваладам Ігнатоўскім — нявіннымі ахвярамі. Алесь Аркуш у артыкуле «Рызыкоўная барацьба намэнклятуры» («НН» №7, 18 лютага 2005) даказвае, што змова з мэтаю здабыцьця для Беларусі незалежнасьці ўсё ж існавала. Яму адказаў Анатоль Сідарэвіч у артыкуле «Трыюмвіры, або Помнік камісарам» (№12, 13): змовы не было, але белнацкамы сапраўды служылі свайму народу і Бацькаўшчыне. Дасьледчыца рэпрэсій, кандыдат гістарычных навук **Тацяна Процька** не падзяляе ацэнак Сідарэвіча й Аркуша. На яе думку, плён дзейнасьці нацыянал–камуністаў вельмі адносны. Бо нацыянальнае разьвіваецца толькі на падмурку прыватнай уласнасьці, яно патрэбна буржуазіі. Таму нацыянальная абалонка, створаная нацкамамі, хутка зьлядела.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Тацяна Процька:** «Нацыяналізацыя» (у нас — «беларусізацыя») і «каранізацыя» праходзілі ў 1920-я гады ва ўсіх савецкіх рэспубліках. Бальшавікі лічылі, што ўсё павінна быць нацыянальным па форме і камуністычным па зьмесьце, — гэта і ёсьць сутнасьць працэсу беларусізацыі. У выніку ўзьнікла такая спэцыфічная зьява, як нацыянал-камунізм. Справа «СВБ» — выкараненьне нацыянал-камунізму.

Яшчэ адным кірункам дзейнасьці нацыянал-камуністаў было фінасаваньне рэвалюцыйнай дзейнасьці ў Заходняй Беларусі, што стала падставай для абвінавачаньня Ігнатоўскага. На фінансаваньне (у тым ліку на разьвіцьцё беларускай школы) ішлі значныя грошы. Гэта таксама нацыянал-камунізм — экспансія бальшавізму ў нацыянальнай афарбоўцы.

Працэс «СВБ» быў першай справай супраць нацыянал-дэмакратаў. Рэпрэсіі ішлі хвалямі: першая — «СВБ» (выкрывалі нацыянал-дэмакратаў), потым большая хваля — 1933-ці год (выкрывалі шкоднікаў і шпіёнаў), потым яшчэ большая — 1937-мы (антысавецкае падпольле). І пасьля кожнай была адліга, калі садзілі выканаўцаў. Усе таталітарныя рэжымы працуюць паводле адной схемы — спачатку ты робіш беззаконьне, а потым цябе за беззаконьне зьнішчаюць. А чалавек, які стаіць на чале ўлады, нібы заўсёды ў белым адзеньні.

Справа «СВБ» — гэта працэс супраць нацыянальнай эліты. Што далі працэсы каранізацыі й нацыяналізацыі? Сталін пісаў: мы так зрабілі, што яны хочуць самастойнасьці. Яны ня хочуць бачыць старэйшага брата й кіроўнай ролі Масквы, а хочуць нейкай незалежнасьці.

**«НН»: Якія былі падставы для такога меркаваньня?**

**ТП:** У нас была Акадэмічная канфэрэнцыя 1926 г. — вельмі важны момант у гісторыі Беларусі. Каб нашы дзеячы давялі справу да канца, усё было б інакш. Купала ўзначальваў Лінгвістычную камісію пры Акадэміі навук. У 1926-м камісія паставіла пытаньне пра пераход з кірыліцы на лацінку. Каб гэта было — у нас бы ня толькі «Atlantica» была найлепшым гуртам!

**«НН»: Вы думаеце, у нацкамаў быў нейкі праект аддзяленьня ад Расеі, яны рабілі нейкія захады?**

**ТП:** Не, захадаў не было — ня трэба лішняе на іх казаць. У чым была нацыяналізацыя? Па-першае, яна ішла побач з каранізацыяй: гэта былі «нашы людзі». У чым выяўлялася, што яны «нашы людзі»? Найперш гэта мова, літаратура, культура. Вядома, яны былі проста нармальныя, разумныя людзі — яны бачылі, што такое калектывізацыя. Калі сталі забіраць зямлю, ствараць калгасы, рэпрэсіі ўжываць супраць людзей, вядома, ніякі чалавек ня мог гэтага прыняць. Прышчэпаў, які разьвіваў хутарскую гаспадарку, спачатку ішоў па справе «СВБ», а потым у асобную «вытворчасьць» былі вылучаныя ён, Гарэцкі…

Таталітарная дзяржава ня мае нацыянальнай афарбоўкі. Яна не расейская, а менавіта імпэрская — яна шкодная была і для расейскай нацыянальнай культуры, і для ўкраінскай… Яна бачыць ворагаў ва ўсім, што мае ўласны твар. Ва ўсім, што дае чалавеку адчуваць сябе асобай. Кожная таталітарная дзяржава — нямецкая, расейская, кітайская — заўсёды скіраваная супроць асобы, яна павінна перамагчы асобу. І таму яна пачала ваяваць з гэтымі асобамі. Ня важна нават, што гэта былі паплечнікі, якія падзялялі камуністычныя, калектывісцкія пераканаНьні, ідэі ўсеагульнай роўнасьці й разьмеркаваньня матэрыяльных дабротаў…

Як толькі вызначылі гэтых асоб — у палітыцы, навуцы, літаратуры, музыцы, — іх пачалі зьнішчаць. Працэс «СВБ» — першы, які выкараняў іншадумцаў. Вось цытата з паказаньняў Некрашэвіча: «Нацыянал-дэмакраты лічылі, што ў савецкай Беларусі ёсьць ня тая форма незалежнасьці, якая сапраўды неабходная для Беларусі. Што, такім чынам, стварэньне беларускага незалежнага дзяржаўнага арганізму — справа будучыні, да якой неабходна рыхтавацца». Але ў даносах Паўліны Мядзёлкі для ОГПУ пра вечарыны ў Купалы гаворыцца: «Ні ад Купалы, ні ад каго б там ні было я ня чула пра існаваньне якой-небудзь арганізацыі. Наадварот, часта чула размовы пра тое, што беларусы ня ўмеюць арганізавана выступаць у абароны сваіх нацыянальных інтарэсаў, што няма адзінства, кожны дзейнічае па-свойму». Яны не былі арганізацыяй.

**«НН»: Калі арганізацыі насамрэч не было, чаму органы яе «стварылі»?**

**ТП:** Каб была сыстэма адліку! Яна ўзьнікла ў Крымінальным кодэксе і была зафіксавана як злачынствы эканамічныя («шкодніцтва») і палітычныя («антысавецкая прапаганда й агітацыя») ды «ўдзел у контрарэвалюцыйнай арганізацыі»). Гэта трэба, каб адрозьніваць бабак, якія таксама клянуць уладу, ад людзей, якія могуць выступіць супраць яе.

Трэба было праз артыкулы КК надаць выгляд законнасьці гэтым дзеяньням. У Маскве ведалі, што нацыянал-камуністы не падзяляюць іх думак. Так сёньня і прэзыдэнт ведае, што БХК не падзяляе яго думак, і таму супраць БХК распачалі справу — за што? За падаткі. Мяне ня могуць прыцягнуць да адказнасьці за тое, што я ня так думаю! Ніхто ж ня можа гэтага даказаць. Калі ёсьць сьведкі, што я казала нешта, тады мяне змогуць прыцягнуць да адказнасьці за зьнявагу... Усім неправавым дзеяньням трэба надаць нейкі прававы выгляд.

**«НН»: У дакладзе Цэнтральнай кантрольнай камісіі ВКП(б), якая наведала Беларусь у 1929 г. («камісія Затонскага»), гаворыцца, што вярхі інтэлігенцыі ў Беларусі адыгрываюць непамерна вялікую ролю. Гэтая роля насамрэч была такой значнай?**

**ТП:** Я не магу так сказаць. Акрамя лацінкі і таго, што яны нелюбілі расейскі шавінізм… Нацыянал-камунізм — цікавая зьява, якая ў нашай гістарыяграфіі ацэньваецца станоўча. На жаль, ён грунтаваўся на пяску: нацыянальнае разьвіваецца толькі на падмурку прыватнай уласнасьці, яно патрэбна менавіта буржуазіі. Бальшавікі гэта вызначылі дакладна: ва ўсе савецкія гады «нацыянальнае» пісалася праз рыску з «буржуазным». Яны правільна разумелі, што справа ня ў нейкіх тэхнічных асаблівасьцях — мове ці строях нацыянальных, — а менавіта ў эканамічных адносінах, у дзяржаўных. І білі ў корань, вынішчалі беларускае. І гэтая нацыянальная абалонка хутка зьлядела, бо этнічнае доўга само па сабе існаваць ня можа. Людзі будуюць адносіны нават у самым прыватным жыцьці на эканамічным падмурку.

**Гутарыў Аркадзь Шанскі**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Краіна няскораных крыжоў

Адметная асаблівасьць беларускіх краявідаў — гэта мноства аброчных крыжоў. У XIX ст. замежныя госьці, якія наведвалі беларускія землі, дзівіліся, што крыжоў тут болей, чым у суседніх Расеі і Польшчы. Крыжы падзяляліся на памятна-засьцерагальныя, прыдарожныя, раскрэсавыя, прыкрынічныя, на прошчах і г.д. Іх ушаноўвалі, зь імі змагаліся.

Як вядома, у другой палове XIX ст. узмацінілася расейская імпэрская палітыка і каталіцтва на беларускіх землях адчувала моцны ціск. Праз удзел у вызвольным руху перасьледаваліся ксяндзы, зачыняліся касьцёлы ці перарабляліся пад праваслаўныя цэрквы касьцёлы ды кляштары. Спазналі перасьлед царскіх уладаў і крыжы, бо ў пераносным сэнсе бралі ўдзел у паўстаньні 1863—1864 г. «Литовские епархиальные ведомости», рупар самадзяржаўя на беларускіх землях, з трывогай пісалі: «Ля крыжоў зьдзяйсьняліся розныя палітычныя маніфэстацыі, вэрбаваліся паляўнічыя ў шайкі... ля крыжоў прымалася прысяга». Паўстаньне было задушана, інсургенты адпраўленыя ў Сібір, маёнткі канфіскаваныя, аднак заставалася народная памяць. Народ пачаў ставіць крыжы на месцах баёў паўстанцкіх атрадаў. У 1864 годзе генэрал-губэрнатар Мураўёў выдаў загад, які забараняў ставіць або рамантаваць гэткія помнікі ля дарог, у палях і лясах. Наступным крокам стаў імпэратарскі загад 1870 г., які непасрэдна рэглямэнтаваў узьвядзеньне крыжоў:

«1. Асаблівую ўвагу зьвяртаць на крыжы прыдарожныя і на плошчах, і калі крыжы зладжаны непаважна ці парасьлі мохам і зусім заняпалі, то папраўляць іх няма патрэбы, а ў выпадках, калі тыя крыжы нязграбныя, зьняць іх і дрэва ўжываць на пячэньне прасфор.

2. Зусім забараніць устанаўленьне новых крыжоў.

3. Дазволіць аднаўленьне толькі тых заняпалых крыжоў, якія маюць асаблівае гістарычнае значэньне ці да якіх народ адчувае асаблівую нявыдуманую глыбокую пашану.

4. Унушаць прыхаджанам замест пастаноўкі крыжоў лепш рабіць ахвяраваньні на патрэбы храмаў.

5. Сачыць, каб форма крыжоў была чыста праваслаўнай».

Каб ня дужа злаваць людзей, старым крыжам дазвалялі дастаяць свой век, але калі знак парахнеў, то новага на ягоным месцы ўжо не зьяўлялася. Нягледзячы на ўсе забароны, цягам дзесяцігодзьдзяў да ўлад ішлі хадатайніцтвы паспалітага люду аб дазволе на ўсталяваньне крыжа ў той ці іншай мясцовасьці. І людзі пераЖылі спачатку Мураўёва, потым — камуністаў, якія таксама вялі ўпартую — і часам больш жорсткую — барацьбу з крыжамі. На жаль, і ў нашыя дні ўлады, карыстаючы вопыт папярэднікаў, таксама бяруць на сябе сьмеласьць вырашаць, які крыж можа стаяць і дзе. Так было з крыжамі ў Курапатах і на месцах баёў слуцкіх ваяроў. Ды ўсё ж з Божай дапамогай і чалавечай непахіснасьцю беларусы дамогуцца свайго, і па ўсіх вартых гэтага месцах будуць стаяць няскораныя крыжы.

**Мікола Сьцебурака, Вялейка**

# Вайсковы тэлевізар,

## альбо Дванаццаць каналаў у хвіліну

**СЯМЁН ПЕЧАНКО**

**Працяг. Пачатак у нумарах 6, 9, 12, 13.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Вольны час у маладых салдат бывае штодзень па абедзе і ўвечары. І, безумоўна, у выхадныя, калі не надарыцца нарад. Па абедзе звычайна прыносяць пошту, і большасьць вайскоўцаў занятыя чытаньнем прэсы ці лістоў. Каму не хапіла газэт ці не давялося станцаваць на загад паштара, давядзецца шукаць іншы занятак. Напрыклад, глядзець тэлевізар.

Дзеля гэтага трэба мець моцныя нэрвы — аматараў пашчоўкаць пультам шмат. Перапынак па абедзе кароценькі і не дае магчымасьці разьлічваць на нейкі грунтоўны прагляд перадачы ці фільму, таму глядзяць салдаты ў такія моманты звычайна якія-небудзь музычныя праграмы. Пры гэтым кожны сяржант лічыць, што толькі ён ведае, якую праграму варта глядзець, але, пасядзеўшы перад «скрыняй» колькі хвілін, саступае месца другому знатаку. Той пераглядае за хвіліну ўсе каналы і, не знайшоўшы для сябе нічога цікавага, перадае пульт іншаму.

Ня лепшыя справы з тэлевізарам і ўвечары, хіба што фільм будзе вельмі цікавы ды ня будуць паралельна трансьляваць футбольны матч.

Але салдаты перадусім займаюцца падрыхтоўкай да наступнага дня — нехта рыхтуецца да нараду, нехта мые вопратку, нехта мусіць перарабіць падшыву (пільна за гэтым сочаць у вучэбцы). Яшчэ ў вучэбцы практыкавалася выкарыстаньне вольнага часу для вывучэньня вайсковага статуту ды тэкстаў песень.

Ня хочаш глядзець ТБ — пішы ліст. Вітаецца таксама чытаньне літаратуры, асабліва патрыятычна-выхаваўчай. Карыстаючыся момантам, можна перачытаць Быкава і Адамовіча.

Аматары спорту займаюцца ў спартыўным кутку, а ўлетку з дазволу дзяжурнага ідуць у спортгарадок. Гэта тыя, каму бракуе спартыўна-масавых мерапрыемстваў, падчас якіх салдаты выконваюць лёгкаатлетычныя практыкаваньні, бегаюць кросы ці гуляюць у спартыўныя гульні. Стрытбол у вайсковых ботах — вось гульня для сапраўдных мужчын! Зрэшты, хіба толькі гэтыя боты і нагадваюць час ад часу, калі захопішся гульнёй, што ты ў войску. Нагадвае пра войска і каманда падрыхтавацца да вячэрняй праверкі. Потым надыходзіць чарга адбою, а зь ім і найбольш любімы салдатамі від адпачынку — сон.

Апроч актыўнага адпачынку салдаты выяўляюць цікавасьць да «разумных» гульняў — сядзяць вечарамі за шахматнымі сталамі. Азартныя гульні забаронены. Нехта слухае музыку, хтосьці бавіць час за размовамі ці спажываньнем нейкіх прыпасаў. Што мяне заўсёды дабівала ў войску, дык гэта тое, што, нягледзячы на вольны час, нельга было прылегчы на ложак. Забарона дзейнічае ад пад'ёму да адбою. Першы час ложак прыцягваў да сябе нібы магнітам, асабліва раніцай. З часам салдаты робяцца сьмялейшыя і ў адсутнасьць камандзіраў дазваляюць сабе гэтую слабасьць.

Маючы вольны час, большасьць салдат займаюцца «парушэньнем формы адзеньня» — вырабляюць з вопраткай розныя забароненыя штукі, спрабуючы зрабіць яе трошкі прыгажэйшай. Напрыклад, галаўныя ўборы. І кепку, і аблавушку вайскоўцы ўшываюць, каб лепш сядзела, выпрасоўваюць, а зімовую шапку яшчэ ваксуюць і потым праз газэціну прасуюць — каб хораша выглядала. Пасьля такіх маніпуляцый аблавушку можна толькі паставіць на макаўку, але ніяк не нацягнуць на вушы. Вось і ходзяць потым здаволеныя фарсуны зь сінімі вушамі. Кепка адбіваецца такім чынам, што робіцца падобнай да цюбяцейкі. Але гэтае вырodства большасьці падабаецца — усе так робяць.

Гэтае ўсюдыснае малпаваньне ўсяго і ўсіх вельмі характэрнае для войска, і той, хто неяк вылучаецца з агульнага шэрагу, выклікае раздражненьне. Калі ты ня робіш на каўняры кіцеля стойкі, не заганяеш у насы ботаў абрэзаныя каробкі ад ваксы, не чапляеш на сябе заслужаныя і ня вельмі значкі, не «адбіваеш» кепку з аблавушкай — ты «няправільны» салдат.

Часам, імкнучыся зрабіць адзежыну цікавейшай, салдаты не адчуваюць меры. Шмат хто спрабуе, прыкладам, выбеліць «**пясчанку**» (форма жаўтаватага, пясочнага колеру) з дапамогай хлёркі. І вось пасьля няўдалага экспэрымэнту — ці хлёркі зашмат, ці занадта доўга вымочвалася — зеленаватая яшчэ ўчора форма на раніцу робіцца белай. Старшына, натуральна, «не пазнае» яе і аддае загад знайсьці «сваю». Але ўжо позна, бо мала таго што колер страчаны — яна яшчэ робіцца зусім нетрывалай і хутка зношваецца. Усе маніпуляцыі з вопраткай забаронены і пільна адсочваюцца камандзірамі, але вайскоўцы ўпарта робяць тое самае. Бо — прыгожа! Парушэньне формы адзеньня можа стаць нагодай для арышту на гаўптвахту, асабліва калі гэтае парушэньне выяўлена вайсковай камэндатурай.

У кожнага вайскоўца ёсьць нататнік, куды ён запісвае вайсковы фальклёр. У вольную хвіліну салдаты папаўняюць запасы вайсковай мудрасьці, перапісваючы нешта новенькае, знойдзенае ў кагосьці са «старых». Капіююцца розныя малюначкі й карыкатуры. Кожны аздабляе сваю кніжачку ў сілу ўласных мастацкіх здольнасьцяў і фантазіі, але сустракаюцца і сапраўдныя творы мастацтва. Нехта за паўгоду да звальненьня пачынае працу над дэмбельскім альбомам. Гэта вымагае пэўных высілкаў ды часу і часьцей за ўсё робіцца начамі ў нарадах. Мяне хапіла толькі на закрэсьліваньне адслужаных дзён у каляндарыку ды адзначэньне колькасьці памывак у ім жа.

У выхадныя, калі вы не ў нарадзе і не ў звальненьні, вольнага часу больш. У суботу пасьля ПГД тыя, хто ня меў запазычанасьцяў у вучобе, маглі адпачываць — спаць, глядзець ТБ, пісаць лісты. Большасьць выбірала здаровы салдацкі сон. У нядзелю да абеду наладжваецца якая-небудзь гутарка ў клюбе, прагляд фільму або спартыўнае сьвята, з традыцыйнымі забегамі і гульнямі.

Часам у выхадныя салдат водзяць на экскурсіі ці ў музэі. Неяк у наш горад прыяжджаў цырк. Адміністрацыя цырку зьвярнулася да камандзіра часьці, абяцаўшы бясплатны ўваход усім тым, каго дашлюць дапамагаць усталёўваць шацёр. Запрашэньне мы атрымалі на прэм'еру. Запомнілася некалькі момантаў: тое, як на нас глядзелі месьцічы (невядома, хто больш выклікаў у іх цікавасьць — мы ці ўдзельнікі трупы); тое, як адміністратарка зьвярнулася да нашага прапара: «Пачакайце, калі ласка, спачатку зойдуць людзі, а пасьля ўжо вы». Насуперак пашыранаму сярод салдат меркаваньню, маўляў, «хто ў войску служыў — у цырку не сьмяецца», можна было заўважыць шчасьлівыя ўсьмешкі на салдацкіх тварах падчас прагляду праграмы.

Пад сьвяты ладзяцца праграмы самадзейнасьці, нейкія конкурсы і віктарыны, часам — сумесна з гарадзкімі навучальнымі ўстановамі. Так, да нас рэгулярна наведваліся з канцэртамі навучэнцы мясцовага гандлёвага каледжу. У адказ нашы вайсковыя таленты рыхтавалі сваю праграму. Звычайна пасьля такіх канцэртаў ладзяцца дыскатэкі, якія папярэджваюцца інструктажам («...рук не распускаць, быць джэнтэльмэнамі і г.д.»).

Калі да вас завіталі госьці, а вы не ў нарадзе і не ў звальненьні, убачыцца са зь імі можна будзе ў пакоі сустрэч на КПП. Існуе свой графік наведаньняў у будныя і выхадныя дні, зь якім варта азнаёміцца наведвальнікам, каб не стаяць пад варотамі дарма. Асабліва гэта тычыцца іншагародніх. У маёй часьці у будныя час наведваньня быў назначаны пасьля вячэры. У выхадныя і сьвяточныя дні — з 10 да 18 гадзін.

Час ад часу вайскоўцы прыцягваюцца да пошукавых мерапрыемстваў, што праводзяць праваахоўныя органы. Зразумела, вельмі захапляльным пошук зьніклага бязь зьвестак чалавека ў мокрым восеньскім лесе не назавеш. Я браў удзел у такіх мерапрыемствах двойчы і з пэўнасьцю магу сказаць, што такое няхутка забудзеш.

Ды ўсё ж маладыя салдаты любяць розныя паездкі, якія даюць магчымасьць атрымаць новыя ўражаньні, урэшце, на нейкі момант трапіць у вольны сьвет. І неістотна — пошукі зьніклых гэта ці нейкая праца (прыкладам, нарыхтоўка бульбы ў калгасе).

Здараецца так, што вольная хвілінка выпадае зьнянацку ці надараецца нечаканы візыт гасьцей. Такія моманты найбольш каштоўныя і даўжэй трымаюцца ў памяці салдата. І я ўдзячны войску ўжо хоць бы таму, што яно прывучыла мяне цаніць свабоду, **кожную вольную хвіліну.**

**Працяг будзе.**

# «Белае» піва

## Баварскія і флямандзкія традыцыі

У сярэднявеччы пшанічнае піва лічылася прэрагатывай багатых. Дзейнічаў нават адмысловы закон, які вызначаў, што галоўнымі інгрэдыентамі мусяць быць ячмень, хмель і вада. Потым была зроблена саступка, і пшанічнае маглі пакаштаваць простыя сьмяротныя. Аднак зь цягам часу маштабы варэньня пшанічнага піва заняпалі, і да сярэдзіны XX ст. яно амаль зьнікла з рынку. Толькі дзенідзе ў Нямеччыне і Фляндрыі жменька піваварaў упарта яго варыла. І потым аўтаномна адзін ад аднаго зьявіліся два дзівакі — баварац Вэрнэр Бромбах і флямандзец П’ер Сэліс. Яны і кінулі выклік сусьветнай модзе.

Дзякуючы іх шматгадовым высілкам баварскае «Weissbier» і флямандзкае «Witbier» здолелі ня толькі вярнуць сабе былую славу, але і зрабіць някепскую кар’еру.

«Weissbier» мае шчыльнасьць 11—14% і мацунак 5,5% і варыцца з пшанічнага (ня менш за 50%), а таксама ячнага соладу. Праз перавагу пшаніцы і малую колькасьць хмелю яно саладзейшае за большасьць звыклых ячных гатункаў. Больш пашыраная назва стылю — «Hefeweizen» (дрожджы+пшаніца), і такое піва ў Баварыі сустрэнеш спрэс.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Флямандзкае «Witbier» — больш мудрагелістае. Вараць яго з сумесі ячнага соладу і несалоджанай пшаніцы, часам з дабаўленьнем невялікай колькасьці пшанічнага соладу і аўса. Хмелю таксама дадаецца зусім крыху, затое шчодра ўжываюцца розныя араматызатары — каляндра, імберац, духмяныя перцы і, як у лікёры «Кюрасао», сушаныя апэльсінавыя лупіны з Антыльскіх выспаў.

П’ер Сэліс, праўда, стаў ахвярай папулярнасьці ўласнага твору і ня вытрымаў канкурэнцыі з гігантамі індустрыі. Прадаўшы брэнд транснацыянальнай карпарацыі «Interbrew», зьехаў за акіян, дзе частуе традыцыйным флямандзкім тэхаскіх каўбоеў.

## Наш адказ Эўропе

У Рэчы Паспалітай пшанічнае піва складала добры адсотак. Яно наагул лепш пасавала ўлюбёнай смакавай гаме ліцьвінаў і палякаў.

Стацыя 1561 г., вызначаючы патрэбную колькасьць розных прыпасаў, якімі мусіў карыстацца Жыгімонт Аўгуст праездам зь Вільні на Мазоўша, абавязвала мець «да піўніцы: **піва пшанічнага** бочак 10; піва расходнага бочак 42».

Трактат па рацыянальным вядзеньні гаспадаркі «Oekonomika ziemianska generalna» Яна Гаўра, які ў XVII—XVIII ст. вытрымаў шмат перавыданьняў і быў настольным у кожнага гаспадара ва ўсёй Рэчы Паспалітай, таксама раіў дадаваць да ячнага соладу пшанічны ў прапорцыі ня менш як 1:2. Ведалі ў нас і традыцыйную эўрапейскую назву пшанічнага: «Устава новага і старога мыта, з скарбу выданая месту Магілёву» (1629) усталёўвала мытны збор за «белае піва» ў памеры 1 грош за бочку віленскую. Кнігі даходаў і расходаў магілёўскага магістрату ад 1689 г. данесьлі да нас і суадносіны ячнага і пшанічнага соладу ў традыцыйным магілёўскім піве — 4:1. Цяжка сказаць, чаму пшанічны солад складаў толькі 20% закладкі, бо каштаваў ён не нашмат даражэй, чым ячны, — 13 залатых за чвэрць, у параўнаньні з 11.

З часам сьляды «белага піва» губляюцца. Зрэшты, апошнім часам пшанічнае зноў можна пакаштаваць, не выяжджаючы зь Беларусі. «Белае» піва пачалі былі масава варыць расейскія бровары, але не навучыліся нашыя ўсходнія браты стварыць нешта людзкае. А вось украінцы выявіліся ласымі на «белае» піва. Чарнігаўскае «Біле» — самае смачнае з таго, што даступна ў Беларусі, але вараць яго і «Славутич», і «Оболонь», а малюсенькі радамышльскі бровар дык толькі пшанічным «Эталёнам» і жыве. Не дарма ўкраінцы так пнуцца ў Эўропу — прынамсі, іх «белае піва» ня горшае за баварскае.

У Беларусі свайго «белага» дагэтуль няма — калі не лічыць «Пшанічнага» «Ракаўскага бровару», але яно зьнікае — няма попыту.

**Алесь Белы**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**АЛЕСЬ БЕЛЫ** (нар. у 1968 у Менску) — дасьледчык гісторыі матэрыяльнай культуры. Сябар рэдкалегіі часопісу «Спадчына». Ляўрэат прэміі Беларускага ПЭН-цэнтру імя Ф.Багушэвіча 2001 г.

ТЭМА

# ...Што ляяльны бандыт

Працяг са старонкі 12.

Напрыклад, песьня «Дом узыходзячага сонца» , якую выканалі ў 1960-я гады «Энімалз». Гэта рокавая аранжыроўка адной зь «песьняў кандалоў», якія ў 1920-я сьпявалі скаваныя ў адзін ланцуг зэкі на прымусовых работах. Калі ўрад прызнае такую зьяву, як шансон, ён фактычна павінен будзе прызнаць і такую зьяву, як крымінальная субкультура. Лягічна запытаць: чаму ў краіне, дзе, паводле афіцыйных СМІ, няма мафіі і крыміналу, папулярны шансон? Акрамя таго, шансон заўсёды быў інстытутам сацыялізацыі моладзі. Ня веру, што тынэйджэр — аматар Круга марыць стаць будаўніком Аўгустоўскага каналу. Гэта тое самае, што стварыць тып ляяльнага бандыта. Таму беларускі афіцыйны шансон немагчымы. Ён ад пачатку будзе другараднай копіяй расейскага. Паводле роду прафэсіі я ведаю шмат беларускіх дальнабойшчыкаў, чыя карпаратыўная культура зьвязана з шансонам. Аднак ніколі ня бачыў у іх касэт беларускіх шансаньсе.

**«НН»: У сваіх творах — песьні «Хімія», «Аршанская зона», «Рэстаран «Бабруйск» — ты таксама намагаўся выпрацаваць канон беларускага крымінальнага шансону?**

**ЛЧ:** Так, аднак для мяне галоўным было выяўленьне асьпэктаў, характэрных для беларускай сытуацыі. Напрыклад, зьяўленьне на зонах палітзэкаў, моўныя акалічнасьці (сынтэз трасянкі і крымінальнага арго), тып злачынца, які дамінуе на зоне (крадзеж на бытавой глебе), ці проста ведданьне тапаграфіі злачынстваў (песьня «Рэстаран «Бабруйск»).

**«НН»: Чым у такім разе скончыцца экспэрымэнт зь беларускім «афіцыйным шансонам»?**

**ЛЧ:** Нічым. Шоў-бізнэс на Беларусі несапраўдны. Ніхто рэальна не зарабляе грошай за кошт канцэртаў, тураў і продажу альбомаў. Відавочна, што за кожнай з т.зв. беларускіх зорак стаіць нейкі спонсар. І пакуль ёсьць фінансавая падтрымка, гэта зорка зьзяе. Як толькі грошай няма, яна заходзіць. Тое самае і з шансонам.

**Гутарыў Лёлік Ушкін**

# Апытаньне «НН»: хто зь беларускіх поп-сьпевакоў вам падабаецца і чаму?

**Людка Сільнова**, паэтка:
Я рэдка слухаю музыку, а запісаў поп-выканаўцаў у сваёй калекцыі ня маю. Калі гучаць па радыё, то слухаю з прыемнасьцю Аляксея Хлястова і Натальлю Тамелу — у яе вельмі далікатны голас.

**Андрэй Вітушка**, мэдык:
Вайцюшкевіч, калі яго можна лічыць эстрадай. Гэта ўнікальны беларускі праект, разьлічаны на масавага слухача, — кабеты за сорак гадоў яго вельмі любяць. Ён не перастае зьдзіўляць сваімі праектамі: сьпярша былі «Крыві», потым «Цацачная крама» — улюбёны альбом майго дзіцяці. Зь іншых хіба што магу адзначыць Аляксея Хлястова за цікавы тэмбр голасу. Акрамя таго, як кажа мая жонка, яны з братам пачыналі як беларускамоўныя сьпевакі.

**Ігар Хляба**, інжынэр:
Мне падабаўся «Камэлот», калі іх можна назваць поп-сьпевакамі. А зь цяперашняга — Вольскі. У яго шмат іпастасяў, але калі браць папсовую, то трэба згадаць яго як прыкаліста, з трасянкавымі рэчамі.

**Міхась Шаваркін**, рэдактар часопісу «Роднае слова»:
Мяне больш цікавяць тыя, хто паўплываў на разьвіцьцё нашай культуры, як Ларыса Александроўская, якая падтрымлівала дух народный песьні. З ранейшых назаву Анатоля Падгайскага, Леаніда Івашкова, Данчыка.

**Валер Анісенка**, рэжысэр, мастацкі кіраўнік Тэатру беларускай драматургіі:
З старэйшага пакаленьня падабаюцца Ціхановіч-Паплаўская. З маладых — ніхто. Гэта копія расейскай папсы і іх ідала Кіркорава, на якога не магу глядзець пасьля таго, як ён біў па твары кветкамі жанчыну.

**Мікола Арцюхоў, юрысконсульт:**
Слухаю Аляксандру і Канстанціна — гэта блізкая мне, прыемная музыка. У нечым падабаецца «Atlantica». А так па Першым музычным канале мала пачуеш чаго цікавага.

**Апытваў Аркадзь Шанскі**

# Мой дарагі генэрал

Да саракавінаў па Карласу Шэрману

**ВАЛЯНЦІН ТАРАС**

Бог даў мне доўгае жыцьцё, я пахаваў амаль усіх сваіх блізкіх сяброў — гэта колькі ўжо разоў перажыў я самыя горкія першыя хвіліны страты сябра, калі прыходзіць вестка аб ягонай сьмерці, калі інстынктыўна, падсьвядома падыходзіш да кніжнай паліцы, каб узяць у рукі ягоную кнігу, калі празь сьлёзы ўглядаешся ў ягоныя фатаздымкі!.. З кніг маіх сяброў, якія пакінулі гэты сьвет, утварылася ўжо на маім кніжным стэляжы цэлая асобная паліца, і вочы, здавалася, выплакаліся да дна... І вось яшчэ адна страта — Карлас Шэрман.

4 сакавіка тэлефонным званком з далёкай Нарвэгіі ўдарыла па сэрцы вестка, што ён памёр, не перанёс апошняй, трынаццатай па ліку хірургічнай апэрацыі на лёгкіх. І хоць вестка тая была балючай, жорсткай, я адчуў і горкую палёгку: адмучыўся!.. Бо злавесная няўмольная хвароба тачыла, кусала, паядала яго некалькі гадоў. І падумалася з горыччу, чаму тая злавесная хвароба забівае не адно злыдняў, але і сьветлых, дастойных, якія, хоць і не анёлы, стараліся пры любых акалічнасьцях заставацца людзьмі, служыць дабру і праўдзе? Але ня буду тут спрачацца з Богам, дакараць лёс Карласа за жорсткі фінал.Таго, што наканавана, не пазьбегнеш. Важна тое, што Карлас да апошняй сваёй хвіліны заставаўся самім сабою, чалавекам высакароднай мэты, валантэрам нацыянальнага дэмакратычнага адраджэньня Беларусі, жыў тым, што дзеецца ў родным беларускім доме, памяцьцю пра дарогі, якія прывялі яго да Алеся Адамовіча і Васіля Быкава, да Рыгора Барадуліна, да ўсіх тых сумленных, яркіх, таленавітых людзей, цьвету нашай літаратуры, разам зь якімі ён стварае Беларускі ПЭН-цэнтар і стаў ягоным віцэ-прэзыдэнтам на многія, ужо гістарычныя па мерцы цяперашняга імклівага часу, гады.

Сёньня, у дзень саракавінаў па Карласу Шэрману, як і 4 сакавіка, калі прыйшла вестка аб ягонай сьмерці, углядаюся ў Карласаў твар на фатаграфіях — і знаёмы да апошняй рысачкі, і нейкі загадкава незнаёмы, нейк дзіўна адчужаны ад мяне. Твар чалавека, які ўжо т а м, які ўжо ведае тое, што ня дадзена ведаць жывым. І гэта робіць ягоны твар на здымку нейкім іншым, больш значным — хай цьвярозыя разумнікі ўсьміхнуцца, скажуць, што гэта адбываецца толькі ў маім уяўленьні. Я думаю, што ня толькі, нездарма ж тое самае заўважыла некалі Ганна Ахматава — напісала ў адным са сваіх эсэ, што на фатаздымках чалавека, які памёр, загадкавым чынам мяняецца ягонае аблічча. Зазначу, што падобнае адбываецца і з тэкстамі памерлага: гартаеш ягоную кнігу і раптам бачыш, што знаёмы тэкст зрабіўся нібы незнаёмым, нейкім новым, больш важкім. Вядома, гэта ня тычыцца бездараў, чые тэксты мёртванароджаныя, таму сьмерць аўтара нічога ў іх не мяняе, а вось таленавіты твор становіцца яшчэ больш жывым, больш праніклівым і пранізьлівым, прачытваецца нібы ўпершыню. А Карлас быў таленавіты чалавек — таленавіты перакладчык, таленавіты паэт, таленавіты публіцыст. На жаль, свайго ён напісаў мала, у асноўным перакладаў з гішпанскай на беларускую (вершы Гільена, лірыку Тэхада Гомэса, многіх іншых гішпанамоўных паэтаў), зь беларускай на гішпанскую пераклаў Куляшова, Танка, кнігу выбранай лірыкі Рыгора Барадуліна «Чорны вол маёй трывогі», Купалу й Коласа, прозу Быкава, «Плач перапёлкі» Івана Чыгрынава, аповесьць Івана Шамякіна «Шлюбная ноч». Сваё — перадусім паэма «Дождж у Караліштавічах», якую на беларускую мову з гішпанскай пераклаў Рыгор Барадулін, а на расейскую — Павал Грушко і я. Сёньня перачытваю тую паэму і ў Рыгоравым перакладзе, і ў сваім з Грушком, а чую голас Карласа, чую, як ён чытаў нам свой «Дождж» па-гішпанску, і хоць мы з Рыгорам ня ведалі гішпанскай, адчувалі моўную моц твору. Потым, прачытаўшы нашы пераклады, Карлас казаў, што пераклады добрыя, што мы змаглі перадаць на беларускай і расейскай гітарах мэлёдыю ягонай гішпанамоўнай гітары, мэлёдыю ягонай душы. А мэлёдыя тая — прызнаньне ў любові да Беларусі, да нашага народу.

«Восень патрыярха» выклікала прамыя асацыяцыі з савецкай рэчаіснасьцю — «патрыярх» увабраў у сябе ўсю змрочную прыроду і псыхалёгію таталітарнай улады.

Спадзяюся, цешуся думкай, як, ведаю, і Рыгор Барадулін, што пахвала Карласава была ня проста кампліментам.

А яшчэ я сёньня бяру з паліцы, перагортваю кнігу, якая назаўсёды зьвязала, паставіла побач маё і Карласава імя. Гэта — раман Габрыэля Гарсія Маркеса «Восень патрыярха», адзін з найвялікшых твораў XX ст.

У нашым перакладзе на расейскую мову раман быў надрукаваны ў далёкім 1977 годзе на старонках часопіса «Нёман», першае асобнае выданьне выйшла ў 1978-м у Маскве, у выдавецтве «Художественная литература». Ды памяць мая сягае яшчэ далей, у 1966 год, калі я пазнаёміўся з Карласам — у рэдакцыі «Нёману», дзе я працаваў загадчыкам аддзелу прозы.



СЯРГЕЙ ШАПРАН

Гэты наведнік рэдакцыі ўразіў мяне нязвыклым, экзатычным абліччам — у яго быў твар тыповага лацінаамэрыканца, мэтыса, белага чалавека з прымесьсю крыві індзейцаў. Значна пазьней я даведаўся, што па месцы нараджэньня ён уругваец, нарадзіўся у Мантавідэо, а школьныя і студэнцкія гады прайшлі ў Аргентыне, у Буэнас-Айрэсе, таму і быў ён абліччам тыповы лацінаамэрыканец, — яскравы прыклад, доказ таго, што пэўны народ, пэўны асяродак, у якім чалавек жыве змалку, накладваюць на яго аблічча свой нацыянальны адбітак. І ня толькі на аблічча, але і на мэнтальнасьць, на рысы характару, на сьветаўспрыманьне.

Таму Карласу, калі ён у 1954 г. перасяліўся ў Беларусь, на радзіму бацькоў (яны эміґравалі з Заходняй Беларусі ў Лацінскую Амэрыку ў 1920-я гады), няпроста было ўжывацца ў тутэйшае асяродзьдзе, няпроста было вывучыць мову, спачатку расейскую, а потым і беларускую. Дамагчыся, каб гішпанская, якая была першай ягонай роднай мовай, адышла на другі плян, зрабілася нібы замежнай, якую хоць і ведаеш дасканала, але яна ўжо другая родная, а першай становіцца мова гістарычнай тваёй радзімы. На якой ня толькі размаўляеш і пішаш, але і думаеш, якая зрабілася тваёй дамашняй, побытавай, сямейнай мовай. Ён гэтага дамогся, адно на ўсё жыцьцё захаваўся ў яго мяккі, прыемны гішпанскі акцэнт.

Але вярнуся ў той дзень, калі ён упершыню завітаў у рэдакцыю «Нёману» і прапанаваў пераклад на расейскую раману Мануэля Сапата Алівеі пра жыцьцё лацінаамэрыканскіх нэграў — батракоў на плянтацыях лятыфундыстаў. Зьмест раману быў цікавы, поўны нязвыклай экзотыкі, дэталяў абсалютна незнаёмага нам, тутэйшым, побыту простых людзей далёкай лацінаамэрыканскай краіны. Але пераклад быў слабы з боку мовы — Карлас у той час яшчэ кепска валодаў і расейскай, і беларускай. Аднак Карлас, калі я паказаў выпраўлены рукапіс, не пакрыўдзіўся, наадварот, быў удзячны і папрасіў, каб потым — калі рукапіс перадрукуюць — аддаць яму пакрэмзаны мною варыянт. Для вучобы. Ня памятаю, як той раман называўся ў арыгінале, як яго назву пераклаў Карлас, але назва мне не спадабалася, і я перахрысьціў яго ў «Чорны загон». Пад гэтай назвай раман і быў надрукаваны ў «Нёмане» ў 1967 г. З таго часу мы і пасябравалі.

Карлас зрабіўся сваім у рэдакцыі «Нёману», часьцяком заходзіў проста так, «на агеньчык», «патачыць лясы». А «лясы» тачыліся вальнадумныя, небясьпечныя, антысавецкія — набліжаліся, пачыналіся падзеі ў Чэхаславакіі, пырскі віна свабоды далячалі з Прагі і да нас, выклікалі прагу той жа свабоды. Карлас думаў, як і мы, нават больш радыкальна, казаў, што мала падзяляць, мала прагнуць ідэалаў свабоды — за іх трэба змагацца. У яго быў досьвед змаганьня: калі жыў у Буэнас-Айрэсе, прымаў удзел у дэмакратычным студэнцкім руху, выступаў з публіцыстыкай у дэмакратычным друку. Савецкая рэчаіснасьць дужа зьдзіўляла яго і пасьля дзесяці з гакам гадоў жыцьця ў «Краіне Саветаў» ён казаў, што ў СССР нават самых элементарных свабод меней, чым у Аргентыне ягонага юнацтва, пры Пэрону…

Для мяне тыя «лясы», што тачыліся ў «Нёмане», а яшчэ больш на кватэры пісьменьніцы Лідзіі Вакулоўскай, абярнуліся ў ліпені 1968 г. тым, што я змушаны быў звольніцца зь «Нёману» «паводле ўласнага жаданьня». Хоць гэта было жаданьне КДБ, жаданьне партыйных бонзаў з ЦК КПБ. Пра гэта я падрабязна расказаў у сваёй кнізе «На высьпе ўспамінаў», у разьдзеле «Справа Вакулоўскай», таму ня буду паўтарацца. Скажу толькі, што на доўгія гады старонкі «Нёману», як і ўсіх іншых часопісаў і газэт Беларусі, для мяне загарнуліся. Хто мог падумаць тады, што ў 1977 г. я вярнуся на старонкі «Нёману», і вярнуся з трыюмфам! Вярнуся дзякуючы Шэрману.

У 1970-я гады творчасьць Маркеса ўжо была вядома ў Савецкім Саюзе раманам «Сто гадоў адзіноты», які ў перакладзе Н.Бутырынай і В.Сталбова зрабіўся бэстсэлерам. І калі б раман «Восень патрыярха», надрукаваны ўпершыню ў 1975 г. у Гішпаніі, раней за нас з Карласам трапіў у іхнія рукі, не было б нашага перакладу. Але ў тым жа 1975 г., ці ў пачатку 1976-га, ня памятаю, Карлас паехаў у Гішпанію па запрашэньні, здаецца, сваёй роднай сястры, якая вымушана была зьехаць з Аргентыны. Там ён і набыў раман (цікава, што гэты самы антыдыктатарскі ва ўсёй сусьветнай літаратуры твор быў выдадзены ў Гішпаніі яшчэ пры жыцьці Франка, — можна ўявіць сабе такое ў нашай «самай дэмакратычнай у Эўропе краіне»?) і, як толькі вярнуўся ў Менск, прыйшоў да мяне, сказаў, што прывёз новы твор Маркеса. «Рэч найвыдатнейшая, нечуваная па сваёй фантастычнай мастацкай сіле! Трэба тэрмінова перакладаць, прапаноўваць «Нёману». Але аднаму мне не падняць та-

кую глыбу, не стае расейскамоўнай моцы. Давай разам!» І мы пайшлі да Макаёнка, тагачаснага рэдактара «Нёману», пераканалі яго, што публікацыя «Восені патрыярха» прынясе часопісу славу. І не памыліліся.

Публікацыя зрабілася велізарнай літаратурнай сэнсацыяй, на нумары «Нёману», у якіх друкаваўся раман, літаральна палявалі, людзі з камэрцыйнай жылкаю вырывалі з часопіса старонкі з «Восеньню патрыярха», пераплятлі іх і прадавалі гэтую самаробную кнігу, зарабляючы ў некалькі разоў болей, чым нам з Карласам «Нёман» заплаціў за пераклад.

Палявалі на раман ня толькі таму, што гэта сапраўды магутны мастацкі твор, але і таму, што «Восень патрыярха» выклікала прамыя асацыяцыі з савецкай рэчаіснасьцю — краінай кіравалі такія ж зласлівыя старцы, што і старац Маркеса, «патрыярх», які ўвабраў у сябе ўсю змрочную прыроду і псыхалёгію таталітарнай улады. Цэнзура, то бок Галоўліт, гэтага чамусьці не заўважыла, але імгненна заўважылі пільныя таварышы з ЦК КПБ: пасьля публікацыі першых разьдзелаў рамана далейшую публікацыю ледзь не забаранілі. Выратаваў справу Андрэй Макаёнак — пайшоў да самога Машэрава, сказаў, што ня надта разумныя таварышы з ЦК хочуць забараніць друкаваньне антыімпэрыялістычнага, антыфашысцкага, антыбуржуазнага твору, што Маркес — змагар з імпэрыялізмам. А Макаёнку Машэраў верыў. І скасаваў забарону.

Як гэта часьцяком бывае, чужы літаратурны посьпех, у дадзеным выпадку перакладчыцкі, некага раздражняе, псуе настрой, таму не абышлося без плявузганьняў наконт таго, хто сапраўдны перакладчык «Восені патрыярха» — Карлас Шэрман ці Валянцін Тарас? Адны казалі, што Шэрман зрабіў прымітыўны, буквалісцкі падрадкоўнік, а ўсё астатняе зрабіў Тарас, другія — што ўсё зрабіў Шэрман, Тарас жа «прысуседзіўся» да яго, а Шэрман з гэтым пагадзіўся адно таму, што Тарас — Макаёнкаў сябар і яму было лягчэй «прабіць» публікацыю. Ня ведалі і адны і другія, што гэты мой сябар Макаёнак не друкаваў мяне ў «Нёмане» амаль восем гадоў, выконваў загад «высокіх інстанцый»!..

Усе плявузганьні наконт таго, хто сапраўдны аўтар перакладу, — зласьлівая лухта. Наш пераклад — прыклад арганічнай садружнасьці двух перакладчыкаў, вынік цяжкай сумеснай працы. Так, Карлас зрабіў падрадкоўнік (я ж ня ведаю гішпанскай мовы), але падрадкоўнік не прымітыўны, а найпадрабязьнейшы, даў мне ўвесь будаўнічы матэрыял раману, да апошняга самага маленькага каменьчыка. А галоўнае — самае галоўнае! — Карлас ведаў рэаліі жыцьця Лацінскай Амэрыкі, фальклёр тамтэйшых народаў, паданьні, легенды, паэзію. Ведаў усё тое, пра што казаў сам Маркес у адным са сваіх інтэрвію маскоўскім журналістам: «Уяўляю, колькі складанасьцяў было ў перакладчыкаў «Восені патрыярха». Кніга насычана песьнямі карыбскіх народаў: там ёсьць кубінскія песьні, мэксыканскія і адна пуэртарыканская. Акрамя таго, яна ўся напоўнена паэзіяй нікарагуанца Рубэна Дарыё… «Восень патрыярха», па сутнасьці, абыгрывае мову Рубэна Дарыё, яна — музычны інструмэнт раману».

Карлас ведаў і паэзію Дарыё, выдатна ведаў. Таму безь ягоных падказак, ягонага веданьня рэальнай падасновы раману я ня здолеў бы на падставе аднаго падрадкоўніка дамагчыся амаль поўнай адэкватнасьці расейскага тэксту з гішпанскім. А такую адэкватнасьць пацьвердзілі ажно пяць літаратуразнаўцаў-гішпаністаў, калі пісалі закрытыя рэцэнзіі на раман для выдавецтва «Художественная литература». Пяць — таму, што маскоўскі клан перакладчыкаў з гішпанскай мовы вельмі хацеў, дамагаўся, каб наш з Карласам пераклад «зарэзалі».

Але ня толькі «Восень патрыярха» адэкватная арыгіналу дзякуючы садружнасьці перакладчыка з Карласам. Бліскучыя пераклады Рыгора Барадуліна вершаў Гарсія Лёркі, Пабла Нэруды, Нікаляса Гільена, Габрыэлы Містраль зроблены на падставе падрадкоўнікаў Карласа. І пры ягоным суўдзеле ў перакладах як тлумачальніка асаблівасьцяў мовы, манэры, сьветапогляду названых вышэй паэтаў. Гэта не адно барадулінскі ўклад у скарбніцу беларускага паэтычнага перакладу, але і ўклад Карласа Шэрмана.

…У «Восені патрыярха» амаль на кожнай старонцы гучыць зварот да галоўнага героя: «Мой генэрал!» Вось і мы з Карласам на працягу апошніх дваццаці з гакам гадоў жартаўліва зьвярталіся адзін да аднаго гэтак жа — мой генэрал! Добры дзень, мой генэрал! Як сябе пачуваеце, мой генэрал? Таму і сёньня я зьвяртаюся да яго гэтак жа…

Урна з прахам Карласа Шэрмана ўсё яшчэ знаходзіцца ў Нарвэгіі, — аказваецца, ёсьць безьліч розных бюракратычных фармальнасьцяў, празь якія ўдаве Карласа Тамары Шэрман трэба прайсьці, каб атрымаць дазвол на правоз урны на радзіму нябожчыка. Так, на радзіму, у Беларусь, хоць па месцы нараджэньня ён уругваец. Ды гістарычная радзіма стала для яго і радзімай ягонага сэрца. Родная зямля чакае цябе, мой дарагі генэрал, мой любы Карлас, і прах твой стане яе часьцінкай…

IN MEMORIAM

# Дзень пры дні — і ўсё жыцьцё

Сорак дзён таму, 10 сакавіка, на 95-м годзе жыцьця памёр заслужаны настаўнік Беларусі **Апанас Цыхун**.

Ён належаў да тых нямногіх старых інтэлігентаў зь беларусаў-заходнікаў, што назаўсёды засталіся часткаю Горадні. Пісьменьнік Аляксей Карпюк, акадэмік-мэдык Юры Астроўскі, кампазытар-песеньнік Аляксандар Шыдлоўскі, настаўнік Сяргей Дрозд... Іх лучыла па-сялянску ўпартая працавітасьць дзеля карысьці свайго краю ды людзей і гэткая ж беларускасьць.

Апанас Цыхун, не зважаючы на зьмены розных рэжымаў і адпаведныя ідэалягічныя зыгзагі, спакойна і ўпэўнена рабіў сваю справу жыцьця. Вучыў школьнікаў шанаваць роднае і па крупінках зьбіраў мясцовую спадчыну — дыялекты, тапонімы, фальклёр, зьвесткі пра мінулае розных этнасаў у рэгіёне, пра яго вядомых людзей. І яшчэ стварыў музэй Я.Карскага ў яго вёсцы Лаша, што непадалёк ад роднай Цыхуну Кунцаўшчыны (Гарадзенскі раён). Гэты школьны музэй праіснаваў з 1964 да 1977 году, пакуль не абязьлюдзела малая радзіма акадэміка-беларусазнаўца.

Ён меў добрае пачуцьцё гумару і моцны зарад жыцьцядзейнасьці. Зычліва ставіўся да людзей. У сваім доміку на драўлянай ускраіне Горадні шчыра радаваўся прыходу і маладога, і старэйшага. Любіў частаваць мёдам з уласных вульляў, пайграць на скрыпцы, выпіць з госьцем добрую чарку, засьпяваць беларускую песьню. Яго любілі.

Незадоўга да яго скону я зайшоў у добра вядомую хату. Прынёс нумары «Нашай Нівы» зь яго вершамі і здымкі зь яго апошняй вечарыны. Яму ўжо цяжка было гаварыць. Я па некалькі разоў прачытаў надрукаваныя вершы. Даў у рукі здымкі, у якія ён доўга-доўга ўзіраўся. Пра што думаў 94-гадовы мудрэц, якога ўзгадавала заходнебеларускае вяскова-гарадзкае сумежжа зь яго традыцыйнай народнай культурай? Мусіць, гледзячы на сяброў і паплечнікаў на здымку, разьвітваўся і азіраўся ў сваё, далёкае. Яно ж у кожнага асобнае. Аднак пры тым і супольнае зь людзьмі, блізкімі па духу. Бацькаўшчына ж — адна.

**Аляксей Пяткевіч,** прафэсар Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Я.Купалы, пісьменьнік.

# Патрыярх прынёманскага краю

Гэтым разам спадар Апанас патэлефанаваў сам.

— Зайдзіце, калі будзеце мець магчымасьць. Нешта нездаровіцца…

Раніцай 23 студзеня адчыняю брамку варот на падворышча хаты гаспадара. Сустрэчы дамагаўся я сам. На адным з круглых сталоў, прысьвечаных юбілею Зоські Верас, сп.Цыхун казаў пра свае краязнаўчыя здабыткі. Многія матэрыялы ўбачылі сьвет у розныя гады ў мясцовым друку. Іншыя чакалі сваёй апрацоўкі.

Вырашылі, што аддамо рукапіс у кампутарны набор, а гаспадар тым часам зоймецца апрацоўкай сваіх допісаў.

…І вось падрыхтаваны да вёрсткі тэксты дзьвюх кніг. Са зборнікам вершаў ніякіх праблем, а з краязнаўчым атрымалася не зусім так, як хацелася. Яўна напрошвалася кампаноўка па разьдзелах — уласна краязнаўчыя артыкулы, апаваданьні, артыкулы пра самога аўтара — рэцэнзіі і анатацыі на яго творы, інтэрвію зь ім, развагі навукоўцаў, допісы чытачоў. Яшчэ адзін блёк склалі пісьмы да сп.Апанаса. Яму дасылалі лісты Васіль Быкаў, Янка Брыль, Ніл Гілевіч, Барыс Кіт, Рыгор Барадулін… Таму я і прыйшоў.

Гаспадар быў бяз гальштука, у бабаўнянай кашулі. Звычайна «на людзі» ён выбіраўся толькі ў гарнітуры. Але можна зразумець — дома. Гаварылі, спадар Цыхун падбіраў фатаздымкі. Я разьвітаўся. Сп.Апанас стаяў ля акна і задуменна глядзеў на падворак амаль празрыстымі ад часу вачыма. Праз 45 дзён ён памёр.

**Антон Лабовіч**

# Сіні дызэль «Гомель—Гомель»

## ЮГАСЯ КАЛЯДА



### Палянэз Агінскага

Глядзі, глядзі, захоўвай у падкорцы,
зьбірай начных кашмараў плён:
сквэр у зялёнай пыльнай абалонцы
ды бруку штучнага палон,

трамвайны звон, машын гудзеньне,
дарожны знак — як знак бяды —
сталіцы сьціплае адзеньне
ў мазгох захоўвай назаўжды! —

каб апраўдаць свае пакуты
гадоў на сорак наперад:
як набярэш маўчаньнем скуты
чужынскай мовы поўны рот —

на ўласную сваю патрэбу;
калі вісецьмеш на крыжы —
каб вочы закасіць да неба
і патлумачыць: «Nostalgie»!

### Comment t'appelles-tu?*

Як дзяцел, пытаньне скроні дзяўбе,
і сон не нясе збаўленьня:
як магу я паклікаць цябе,
калі ты ня маеш найменьня?

Перапляценьні гукаў ды слоў,
марскія вузлы парафразаў...
Як зьменяцца шыфры тваіх адрасоў —
адкуль я чакацьму адказаў?

...Ляпілі, бы з гліны, далонямі
зь цемры
ляпілі гарачыя нашыя целы,
дзьве розныя мовы мы зблытвалі ў
роце,
каханьнем душылі, нібы на гароце,
мільёны разоў — хто там зараз
падлічыць?
Забылі спытацца: «А як цябе
клічуць?..»

Як гукаізаляцыйнае шкло —
варожая родная мова...
Нам кажуць: слова спачатку было.
Я ведаю: слова спачатку было!
Даруйце... Якое слова?

### Гомельскія абліччы

#### 1. Гомель

Гомель. Чорна-белы, голы —
нэгатыў фотавыявы —
існуе халодны горад
на памежжы сну і явы.

Напрадвесьні азалелы,
стыне Гомель апусьцелы,
і халодныя залевы
мыюць гарадзкое цела.

Твар падняў да неба Гомель,
дрэвы працягнуў у сінечу,
і празрыстая галеча
зачапілася за гольле.

Апраметная ці вырай?
Безуважны, гонкі, горды,
з-пад зямлі да неба вырас
чорна-белы голы горад.

Скрозь прадзьмуты ветрам Гомель
і паводкамі прамыты,
існуе бязьлюдны горад
на мяжы жыцьця й нябыту.

...Горад, як зьмяя, абгорне
сіні дызэль «Гомель—Гомель»...

* Як цябе клічуць? (фр.)

#### 2. Вольны горад

Ён гарадзкіх муроў пакінуў межы,
ён зьліўся зь вёскамі, заблытаўся
ў лясох,
набраў паветра, выхукнуўшы смог,
заводаў коміны ператварыў у вежы.

І, каб унікнуць гарадзкой тугі,
урбанізацыі, што ціснула да болю,
аўтамабіляў рух ён запаволіў,
аслабаніў чыгункі ланцугі.

Ён запусьціў на вуліцы кароў,
зарос травой — і ўсё яму замала!
Каб сон яго нішто не турбавала,
пачаў ён выштурхоўваць жыхароў.

...Калі пытаюць: «Гомель — гэта
дзе?» —
з пагардаю амаль непрыхаванай,
я ўзгадваю зьнянавідны, каханы —
свой родны горад, хворы на людзей.

#### 3. Шпацыр

Вулкі віюцца, кружацца,
брукаваныя, вузкія,
перацякаюць у вуліцы:
Маскоўская — у Беларускую,

Партовая — у Падгорную...
Вулка да вулкі туліцца...
Гомель цябе абгортвае
у павуціньне вуліцаў,

і пыл пад нагамі курыцца:
вулка, завулак, вуліца...

Слабада, Залінейны,
Прудок і Кагальны роў...
Выходзіш на плошчу Леніна
ад манастырскіх муроў

у гораду абдымманкі,
у гомельскіх вуліцаў вір,
і топча абцас брукаванку,
асфальт, ці то пыл, ці то жвір,

пакуль галава не закружыцца
ад водавароту вуліцаў,
бульвараў, праспэктаў, вулак...
Гомель — мурашнік, вулей...

А калі галава закружыцца —
спыніся пасярод вуліцы,
прыгадай, дзе стаіш:
гэта — *rue*[1], а ня вуліца!
Гэта ня Гомель — Парыж!

#### 4. Горад-агарод

Мой горад — гэта агарод.
Жыве ён зззаду наперад.
Вірує ўночы, сьпіць удзень.
Мой горад хворы на людзей.

Мой горад — гэта агарод.
Ў ім час цячэ наадварот.
За агароджаю — сьціяна.
На даляглядзе — даўніна.

Мой горад — гэта агарод.
Руйнуеш плот — і бачыш плот.

* * *

Калі у кола час замкне,
пасьпею крыкнуць: «Не мяне!»

[1] вуліца (фр.)

# Інтэлектуалка, даярка, пісьменьніца



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У лютым Беларусь наведала швэдзкая пісьменьніца **Катарына Масэці**. У менскім кінатэатры «Перамога» паказвалі экранізацыю ейнага раману «Хлопец з суседняй магілы». Сваю першую кнігу яна выдала ў 45 гадоў. І цяпер выпрабоўвае розныя жанры — казкі для дзяцей, мэлядрамы, дэтэктывы. Гарадзкая інтэлектуалка, Масэці падпрацоўвала даяркай на фэрме мужа, гадавала чацьвёра дзяцей і адначасова выкладала, пісала літрэцэнзіі, іграла на акардэоне ў ансамблі. У Швэцыі і Беларусі прыкладна роўная колькасьць насельніцтва, але яе кніга «Хлопец з суседняй магілы» — гісторыя каханьня простага фэрмера да гарадзкой інтэлектуалкі — выйшла недасягальным у нас накладам у 450 тысяч асобнікаў. Зь пісьменьніцай гутарыў карэспандэнт «НН» Андрэй Расінскі.

**«НН»: Вашы кнігі называюцца надзвычай правакацыйна: «Хлопец з суседняй магілы», «Заткніся, цябе ўжо забілі»…**

**Катарына Масэці:** Гандляр мусіць прадаць кніжку. Каб прывабіць чытача, трэба адпаведная назва.

**«НН»: Наколькі хутка акупаюцца швэдзкія кнігі?**

**КМ:** З аднаго боку стала лягчэй: швэды цяпер болей чытаюць. Болей друкуецца кніжак, зьявіліся электронныя выданьні. Таньней стала выдаваць. З другога боку, выдаўцы болей зацікаўленыя ў камэрцыйным посьпеху, скіраваныя на рынак.

Мае кнігі акупіліся, бо выдаваліся вялікімі накладамі. Іх хутка раскупілі. Але ўвогуле, пісаць — ня дужа прыбытковы занятак у Швэцыі. Пісьменьнікі жывуць на стыпэндыі. Добра акупляюцца толькі дэтэктывы.

**«НН»: Кіно й відэа не выцiскае мастацтва слова?**

**КМ:** Наадварот. Выходзіць эфэкт сьнегавога камяка. Спачатку я напісала кнігу — і чытачы ёй зацікавіліся. Потым кнігу экранізавалі — «камяк» папулярнасьці пабольшаў, большую ўвагу зьвярнулі на саму кнігу.

**«НН»: Што б Вы параілі пісьменьнікам, якія наважыліся на позьні дэбют?**

**КМ:** Я магу сказаць ім: у вас ёсьць вялікі досьвед, якога няма ў маладых пісьменьнікаў.

**«НН»: У беларускай літаратуры была папулярная тэма «сена на асфальце». Гэта пра людзей, якія прыехалі зь вёскі ў горад, але так і ня сталіся гараджанамі. А як з падобнай тэмай у швэдзкай літаратуры?**

**КМ:** Гэта тыпова й для швэдаў таксама. Наш клясык Мубэрг — сапраўднае «сена на асфальце». У маім «Хлопцу з суседняй магілы» сена сустракаецца з асфальтам. І ўтвараецца адзінае цела.

Швэдзкі інстытут зацікаўлены ў перакладах швэдзкае літаратуры на беларускую мову і перакладчыкаў падтрымлівае. Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на тэл. 226-59-48 ці на электронны адрас elena.kasko@sweden.by.

## НОВЫЯ КНІГІ

### А што мы ведаем пра масонаў?




**Вольныя муляры ў беларускай гісторыі. Канец XVIII – пачатак XX ст.** / Уклад. і нав. рэд. д.гіст.н. А.Смалянчук. — Вільня: Gudas, 2005. — 280 с. 500 ас.

Зборнік — адна зь першых гістарыяграфічных спробаў асьвятленьня дзейнасьці масонаў як у Беларусі, так і на Гарадзеншчыне. Сярод аўтараў як беларускія навукоўцы — Вячаслаў Швед, Алесь Смалянчук, Марына Сакалова, Сяргей Рыбчонак, такі і іх польскія калегі — Тадэвуш Цагельскі, Станіслаў Малахоўскі-Лэмпіцкі.

У кнізе ідзецца пра малавядомыя старонкі масонскіх лёжаў у Беларусі, разьвіцьцё руху «вольных муляраў» у Горадні, Менску, адраджэньне масонскага руху ў пачатку ХХ ст. Аўтары выданьня даказваюць, што масонства ў розныя пэрыяды беларускай гісторыі было значным фактарам грамадзка-палітычнага і культурнага жыцьця.

**Антон Лабовіч, Горадня**

### Новая кніга Юрэвіча




**Юрэвіч Л. Мэмуары на эміграцыі: крыніцазнаўчае дасьледаваньне.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2005. — 332 с. 200 ас.

Гэта ўжо чацьвёртая кніга ў сэрыі «Бібліятэка ЗБС «Бацькаўшчына», заснаванай мінулай вясной. Дасьледаваньне зьяўляецца працягам папярэдніх прац Лявона Юрэвіча, а перадусім «Беларускай мэмуарыстыкі на эміграцыі» (Нью-Ёрк, 1999). У «Мэмуарах на эміграцыі» друкуецца бібліяграфія нэкралёгаў і ўспамінаў, зьмешчаных у эміграцкіх газэтах «Бацькаўшчына» і «Беларус», поўныя ўспаміны Ўладзімера Дудзіцкага «Даруй, што плачу», шчымлівыя, поўныя болю лісты Вольгі Таполі да Юркі Віцьбіча. Прадмову да кнігі напісаў вядомы дасьледчык з Санкт-Пецярбургу Мікола Нікалаеў.

**АГ**

АДАМ ГЛЁБУС



# Сучасьнікі

### 2005. Памідораў і рок-н-рух

А.Памідораў уваліўся-ўкруціўся ў перапоўнены вагон мэтро, вывудзіў з кішэні маленькую каробачку з пігулкамі, вытрас адну, закінуў у рот і пачаў пасмактваць. Памідораў пасмоктваў пігулку, слухаў музон праз навушнікі, хітаў галавою, паторгваў плячыма, паляпваў далонькю па шыбе з надпісам «не прытуляцца» і пагрукваў нагою па вагоннай падлозе. Каб звацца рок-нрольшчыкам, трэба навучыцца пагрукваць, паляпваць, пахітваць, паторгваць, пасмоктваць, слухаць і адначасова імчацца ў бітма набітым вагоне праз безнадзейна-чорны тунэль жыцьця. Калі ты здатны на такое, дык спакойна выканаеш песьню пра зорачкі выгнаньніка Новіка-Пеюна, а ўсе слухачы зачаруюцца тваім няўрымсьлівым талентам.

*06.03.2005, 12:33.*

### 1965(?). Кажушок і ўзнагарода

Быў такі ў Койданаве дзівак — Толік Кажушок. Раскулачылі сям'ю Кажушкоў расейскія камуністы напярэдадні другой сусьветнай, недзе ў 1938. Усіх выслалі за Ўрал, а Толік застаўся ў мястэчку, бо замалы быў для высылкі, дый бяднейшыя, неабрабаваныя ўладамі сваякі забралі яго гадаваць. У школе Толіка прымусілі публічна адрачыся ад бацькоў-эксплюататараў: маўляў, так Анатоль ачысьціўся ад шкоднай спадчыны і стаў новым савецкім звышчалавекам. Ад бацькоўскай спадчыны Кажушок сапраўды адрокся і адчысьціўся, але захварэў на новую скваапнасьць, чым і праславіўся на ўсё Койданава і далей. Толік, кулацкі сын, добра вучыўся, скончыў школу і ўнівэрсытэт, дзе застаўся выкладаць гісторыю. Так бы Кажушок і выкладаў гісторыю савецкіх камуністаў да самай пэнсіі, каб ня прага да ўзнагарод. Пасьля заканчэньня ўнівэрсытэту паслалі Кажушка на пару гадоў папрацаваць ваенкомам у часьці, што стаяла паміж Койданавам і Стоўпцамі. Кажушок служыў старанна, але несумленна, бо скраў бляньі, запоўніў іх і тым самым узнагародзіў сам сябе ордэнам Чырвонай зоркі. Так што ва ўнівэрсытэт Толік Кажушок вярнуўся ардэнаносцам. Выехаў зь мястэчка як сыціплы вайсковец, а ў Менск прыехаў з крывавай зоркаю на грудзях. Гадоў зь дзесяць Толік Кажушок пахадзіў у героях, а потым падробка блянкаў нейкім чынам выкрылася. Кажушка арыштавалі і выслалі за Ўрал. Койданаўцы не вінавацілі Кажушка за падробку дакумантаў, а за адрачэньне ад бацькоў асуджалі. Казалі: не адрокся б ён ад сваіх крэўных, дык і з крадзеным ордэнам не зславілі б. Такая ў Койданава лёгіка.

*07.03.2005, 14:41*

### 2005. Дубавец і нязьдзейсьненае

Сяргей Дубавец прапанаваў выказацца на тэму нязьдзейсьненага. Я напісаў нататкі «Хацеў зрабіць і не зрабіў…» У тых зацемках пералічваліся добрыя намеры, але цалкам ігнараваліся кепскія. Не было там пра жаданьне зьнічтажаць, пра намеры зьняславіць і абразіць. А якраз гэта ня толькі самае цікавае, але і тое, чым сапраўды можна ганарыцца, бо не забіў, ня ўкраў, не зламаў, не пабіў… Меў жа намер, хацелася, карцела, а пераадолеў сябе, перамог.

*08.03.2005, 15:04*

АЛЯКСАНДАР ВОРВУЛЬ

# Слоўнік скептыка



**Чалавек** — адзіная істота, якая можа быць дурнем.

**Чалавек вялікі** — чалавек, які рэдка бывае жывым.

**Чалавек дрэнны** — чалавек, якога ўжо няма сіл апраўдваць.

**Чалавек здаровы** — дрэнна абсьледаваны хворы.

**Чалавеканенавісьніцтва** — разнавіднасьць самакрытыкі.

**Чарга** — месца, дзе людзі баяцца згубіць адзін аднаго.

**Чарга суседняя** — чарга, якая заўжды рухаецца хутчэй.

**Час** — настаўнік, які забівае сваіх вучняў.

**Час перадсьмяротны** — гэта калі хочацца яшчэ хоць крыху пажыць вечна.

**Час цяжкі** — тое, што пачынаецца адразу пасьля часовых цяжкасьцяў.

**Часова** — на адзін дзень меней, чым пастаянна.

**Чат** — кветка на магіле працоўнага часу.

**Чачотка** — танец, які нарадзіўся ў сям'і, дзе было семёра дзяцей і адзін начны гаршчок.

**Чутка** — інфармацыя, якая распаўсюджваецца хутчэй за гук.

**Чынгісхан** — чалавек, які любіў вандраваць, наведваць новыя гарады і краіны, знаёміцца зь людзьмі.

**Чыноўнік** — доказ магчымасьці размнажэньня непалавым шляхам.

# Шчарбатая перамога

Агляд падзей тыдня

У Беларусі пачаўся новы футбольны сэзон. У мінулы чацьвер завяршыліся чвэрцьфіналы Кубку Беларусі, а ўжо ў аўторак, 12 красавіка, былі згуляныя першыя паўфінальныя матчы. Менскі МТЗ-РІПА прымаў «Нёман» (Горадня), а жадновіцкая «Дарыда» — барысаўскі БАТЭ. Матчы ў адказ пройдуць праз месяц.

Аднак асноўная ўвага беларускіх заўзятараў была прыкаваная да хакейных пляцовак. Завяршыўся чэмпіянат Беларусі па хакеі з шайбай. Другі год запар залатыя мэдалі адкрытага першынства краіны заваявала менскае «Юнацтва». Праўда, перамога выхаванцаў Міхаіла Захарава ня бачыцца такой ужо бясспрэчнай. Перад фінальным матчам са сталічным «Керамінам» «Юнацтва» зрабіла дазаяўку, выклікаўшы ў клюб былых гадаванцаў, што цяпер гуляюць у расейскай супэрлізе, — Міхаіла Грабоўскага з «Нафтахіміка», Уладзімера Цыплакова з ЦСКА ды Андрэя Скабелку зь «Сібіры». Вось гэта ўдарная тройца і забясьпечыла «золата» першынства, фактычна ўтрох перайграўшы «Керамін». Такі крок «юнакоў» выклікаў шмат справядлівых нараканьняў у заўзятараў хакею. Так, на сайце www.pressbol.by у апытаньні «За каго вы будзеце хварэць у фінале», за «Юнацтва» прагаласавалі толькі восем адсоткаў наведнікаў. "За Керамін" — 30%, «не за «Керамін», але супраць «Юнацтва» — 32%.

Заўзятары наракалі на тое, што, аказваецца, можна цэлы рэгулярны чэмпіянат абыходзіцца безь легіянэраў, паклікаць іх толькі перад самым фіналам — і не пакінуць ніякіх шанцаў суперніку. Бо хакейнае першынство Беларусі куды слабейшае за расейскае, таму некалькім рэкрутам няцяжка правесьці «майстар-кляс» на лядовай пляцоўцы. Выклікала шмат заўваг і судзейства на фінальных матчах. Вось таму, відаць, сымпатыі заўзятараў і былі не на баку «Юнацтва».

Аднак несумненны плюс вынікаў беларускага чэмпіянату, дзе ўпершыню бралі ўдзел латвійскія і ўкраінскі клюб, у тым, што ўсе прызавыя месцы дасталіся беларусам. Бронзавыя мэдалі заваявала магілёўскае «Хімвалакно». Так што ня трэба




PHOTO.BYMEDIA.NET

зноў лезьці ў рэглямэнт чэмпіянату, каб прызнаваць чэмпіёнам беларускую каманду, што заняла вышэйшае месца ў стадыі плэй-оф. «Юнацтва» — чэмпіён, і яно будзе прадстаўляць Беларусь у Кантынэнтальным кубку.

Куды больш цікавай была сэрыя плэй-оф у расейскай супэрлізе. Як ужо пісалася, праз лакаўт у НХЛ у Расеі сабраліся наймацнейшыя хакеісты сьвету. Напрыклад, казанскі «Ак Барс», дзе выступаў абаронца зборнай Беларусі Руслан Салей, сабраў, не шкадуючы грошай, пад свае сьцягі амаль ня зборную сьвету. Ну вельмі манілася кіраўнікам Татарстану зрабіць сабе і народу падарунак да 1000-годзьдзя Казані. Але спатыкнуліся ў чвэрцьфінале на омскім «Авангардзе». Цяпер давядзецца сканцэнтравацца на футбольным «Рубіне» і баскетбольным «Уніксе»

А залатыя мэдалі заваявалі хакеісты маскоўскага «Дынама», якое ўзначальваў экс-трэнэр зборнай Беларусі Ўладзімер Крыкуноў, творца «беларускага цуду» ў Солт-Лэйк-Сіці. Цікава, што перад пачаткам сэзону шмат хто з гульцоў каманды быў нездаволены фізычнымі нагрузкамі, якія даваў ім новы трэнэр. Скардзіліся: толькі і робім, што трэніруемся, аж уваччу цёмна. Але беларускі спэцыяліст упарта гнуў сваю лінію. І нагрузкі далі плён. «Дынама» цэлы год упэўнена лідзіравала ў чэмпіянаце, дый у фінальнай сэрыі яму таксама не было роўных. У фінале яны не пакінулі шанцаў амбітнай «Ладзе», выйграўшы сэрыю зь лікам 3:0.

Як вынік, Крыкунову прапанавалі ўзначаліць зборную Расеі на чэмпіянаце сьвету, што пройдзе ў Аўстрыі ў траўні. Выкананьне абавязкаў ён і распачаў у панядзелак. А беларусы якраз гуляюць з расейцамі ў адной падгрупе. Так што 4 траўня ўсіх чакае цікавы паядынак: трэнэр Уладзімер Крыкуноў супраць сваёй былой зборнай. Дарэчы, адразу пасьля апошняга матчу фінальнай сэрыі «Дынама»—«Лада» Крыкуноў параўнаў свой посьпех у маскоўскім клюбе зь беларускім посьпехам на Зімовых гульнях-2002. Тады беларусы перамаглі ў чвэрцьфінале швэдаў і выйшлі ў паўфінал. Найлепшае дасягненьне беларускага хакею было пры Крыкунову. Цікава, чаго даб'ецца Глен Хэнлан?

Канец тыдня прынёс яшчэ адну прыемную хакейную вестку, гэтым разам са славенскага Марыбору. Юнацкая зборная Беларусі пад кіраўніцтвам Васіля Панкова вярнула сабе пуцёўку ў элітны дывізіён, адкуль выбыла год таму, на чэмпіянаце сьвету, што праходзіў у Менску.

Так што за хакейнымі паразамі ў лютым прыйшоў красавіцкі пазытыў. Цікава, якім выдасца хакейны травень.

**Алег Раявец**

## СЬЦІСЛА

### Гарадзенскім дзяўчатам роўных няма

«Алімпія» (Горадня) чацьвёрты раз запар выйграла жаночы чэмпіянат Беларусі па баскетболе. У фінальнай сэрыі да трох перамог каманда перамагла барысаўскую «Бярэзіну-БДАФК» — 3:0. Някепскія шанцы на чэмпіёнства маюць і гарадзенцы-мужчыны. 15 красавіка пачынаюцца паўфіналы ў нацыянальным першынстве. «Горадня-93» гуляе зь віцебскім «Лякаматывам-КіС», а менскі «Віталюр» — з асіповіцкім АЗАА. Сэрыя — таксама да трох перамог.

### Старт чэмпіянату

У найбліжэйшыя выхадныя стартуе чэмпіянат Беларусі па футболе. У суботу будуць згуляныя чатыры матчы: МТЗ-РІПА (Менск) — «Дынама» (Менск), «Шахцёр» (Салігорск) — БАТЭ (Барысаў), «Славія» (Мазыр) — «Тарпэда» (Жодзіна), «Дняпро-Трансмаш» — «Гомель». У нядзелю пройдуць тры астатнія паядынкі: «Дынама» (Берасьце) — «Дарыда» (Ждановічы), «Лякаматыў» (Менск) — «Зорка-ВА-БДУ» (Менск), «Нёман» (Горадня) — «Нафтан» (Наваполацак). Паводле рашэньня Беларускай фэдэрацыі футболу, туры беларускага чэмпіянату будуць праходзіць у выходныя, а тэлеканал «Лад» абяцае паказваць адзін з матчаў у жывым этэры.

### Каб усе так лаяліся

Расейскі футбольны саюз (РФС) можа накласьці штраф на паўабаронцу маскоўскага «Дынама» і найлепшага гульца зборнай Беларусі-2004 Максіма Рамашчанку. За дзесяць хвілін да заканчэньня матчу расейскай прэм'ер-лігі «Дынама» (Масква) — «Сатурн» (Раменскае) арбітар сустрэчы Сяргей Фурса выдаліў з поля беларуса, а таксама гульца «Сатурну» Валера Есіпава за тое, што нецэнзурна лаяліся адзін на аднаго. Рамашчанка пасьля матчу моцна зьдзівіўся: «Калі за мат кожнага выганяць з поля, то да канца сустрэчы ніхто не дагуляе». Футбалістам, паводле дысцыплінарнага рэглямэнту РФС, пагражае штраф у 100 тыс. расейскіх рублёў і дыскваліфікацыя на чатыры гульні.

### Мабільнік — найлепшы сябар трэнэра

Трэнэр лёнданскага футбольнага клюбу «Чэлсі» Жазэ Мурыньё быў дыскваліфікаваны на два матчы Лігі чэмпіёнаў — сустрэчы адной чацьвертай фіналу між «Чэлсі» і «Баварыяй» (6 і 12 красавіка). Першы матч, што прайшоў на мінулым тыдні, партугальскі спэцыяліст сумленна адседзеў у падтрыбунным памяшканьні. Але нямецкія журналісты — а «Баварыя» саступіла зь лікам 2:4 — падазраюць, што ня ўсё было чыста. Так, журналісты «Bild» кажуць, што трэнэр галкіпэраў лёнданскага клюбу Сільвіну Лоўру падчас другога тайму тройчы адыходзіў у падтрыбунныя памяшканьні, і пасьля кожнага зь ягоных вяртаньняў «Чэлсі» праводзіў замены. А трэнэр лёнданцаў па фізпадрыхтоўцы Руй Фарыя правёў увесь матч, нягледзячы на вельмі цёплае надвор'е, у шапцы. Журналісты намякаюць на тое, што ў партугальца на галаве было схаванае нейкае прыстасаваньне для сувязі з галоўным трэнэрам. Для Мурыньё гэта не ўпершыню. Два гады таму, калі ён быў трэнэрам «Порту», падчас паўфінальнага матчу Кубку УЭФА з рымскім «Лацыё» на яго таксама была накладзена дыскваліфікацыя. Але Мурыньё паслаў на лаву трэнэраў больш за трыццаць эсэмэсак. «Порту» тады пасьпяхова прайшла паўфінал і ўрэшце выйграла Кубак УЭФА.

### Кепкетэр сыдзе праз год

Знакаміты дацкі чарнаскуры бягун Уілсан Кепкетэр заявіў пра тое, што завершыць сваю спартовую кар'еру пасьля чэмпіянату Эўропы-2006, што мае прайсьці ў швэдзкім Гётэборгу. «У 1995 я выйграў у Гётэборгу першы тытул, там я маю намер і завяршыць выступленьні».
Уілсан нарадзіўся ў 1973 г. у Кеніі, але колькі год таму прыняў грамадзянства Даніі. «Кіпкетэр шмат даў як лёгкай атлетыцы наагул, так і дацкаму спорту ў прыватнасьці. Яго будзе не хапаць на лёгкаатлетычных пляцоўках сьвету», — з сумам зазначыў прадстаўнік Фэдэрацыі лёгкай атлетыкі Даніі.

**AP**

ІНФАРМАТАР

# Фітнэс-цэнтры Менску

«Alisa-star»
вул.Енісейская, 1
243-86-19

«Gala sport»
вул.Ташкенцкая, 2
210-20-99, 211-55-70

«Servik»
вул.Чарвякова, 8
268-68-19

«XXI стагодзьдзе»
пр.Ф.Скарыны, 169
228-71-71

«Авангард»
вул.Кульман, 5
205-62-98, 214-08-77

«Багіра»
вул.Карастаянавай, 41;
пр.Ф.Скарыны, 37
268-66-21, 284-70-84

«Біярытм»
вул.Фабрыцыюса, 30
227-49-82

«Гарызонт»
вул.Куйбышава, 41
239-48-59

«Гранд»
вул.Р.Люксэмбург, 82
256-50-52

«Даўгалецьце»
вул.Жудро, 40
255-39-82

«Дэвата»
вул.Сурганава, 28а
239-39-65

«Журавінка»
вул.Я.Купалы, 25
206-68-90

«Каліпса»
вул.Чарнышэўскага, 3
279-65-27, 231-84-86

«Ля фантану»
вул.Амуратарская, 4
223-51-71
www.ufontana.stalica.net

«Моцны арэшак»
пр.Машэрава, 93
254-88-01

«Нардзін»
вул.Сурганава, 47б
237-74-56

«Наташа»
вул.Ясеніна, 66
272-15-86

«Пасольства прыгажосьці»
вул.Альшэўскага, 20
256-50-52

«Усе зоркі»
пр.Машэрава, 89
250-53-96

«Фаварыт»
пр.Машэрава, 3а
228-86-48

«Фінэтык-цэнтар»
вул.Кальцова, 10
216-04-72

«Цэнтар Ірыны Маскалеўскай»
вул.Фабрыцыюса, 9
211-08-98

«Час спорту»
вул.Камсамольская, 15а
227-82-65

Шэйпінг-заля «Шэйплэнд»
вул.К.Лібкнэхта, 68
201-37-54

«Эдэм»
вул.Куйбышава, 41
284-80-84

«Эстэтык-цэнтар»
вул.Кульман, 13
234-96-12

ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ



Чорныя згулялі 13...Сс8-f5, зь лішкам абараніўшы адну пешку і пакінуўшы без нагляду другую (b7). Пасьля ходу гросмайстра 14. f2-f3 трэба ўжо думаць, як захаваць матэрыяльную раўнавагу — слон белых імкнецца на f3. Да гульні можна далучыцца на любым этапе. E-mail: nn@promedia.by, SMS: 754-04-53, bychess.narod.ru. Чакаем вашых варыянтаў да панядзелка, 19:00.

**З. Лыбін – чытачы «НН». Ход чорных.**

КАІСА

# Самавітая ўнівэрсіяда

7 красавіка ў шахклюбе Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту (БНТУ) не адзін наведнік спатыкнуўся аб чароды ўмела спакаваных торбаў. На апошні тур чэмпіянату краіны сярод ВНУ студэнты, магістранты й асьпіранты, што мусілі ехаць дахаты, як заведзена, прыхапілі свае транты.

У сёлетнім першынстве згуляла рэкордная колькасьць каманд (19), якія прадстаўлялі ўсе абласныя цэнтры, акрамя Віцебску. Затое сваю каманду — зь міжнародным майстрам Віталем Цэцеравым на чале — выставіў Полацкі ўнівэрсытэт. Летась на ўнівэрсіядзе дружныя палачане заваявалі «золата», сёлета — «серабро». Дык і склад турніру стаў мацнейшым; так, за ўнівэрсытэт фізкультуры выступілі Сяргей Азараў і Андрэй Жыгалка, за БНТУ — Мікіта Маёраў. У беларусцейшай на першай дошцы красавалася чэмпіёнка краіны Ганна Шарэвіч, на чые худзенькія плечы выпаў і капітанскі цяжар. Паводле агульнага правіла, студэнткі гулялі на апошняй дошцы.

Лёс першых месяцаў вырашыўся ў драматычнай партыі паміж лідэрам зборнай БДЭУ Міхаілам Гінзбургам і Сяргеем Азаравым з унівэрсытэту фізвыхаваньня. Гэтых сябрукоў-«вясьнянкаўцаў» абкружыла шчыльная сьцяна разявакаў. Хтосьці зь няўдалых гледачоў зьбіраўся ўжо бегчы па драбіны, калі Азараў здаўся — упершыню ў турніры. М.Гінзбург, не прайграўшы ні разу, узяў першае месца на першай дошцы, а каманда БДУФК адкацілася на трэцяе месца. Выйгралі першынство гаспадары пляцоўкі — зборная БНТУ, якую трэніруе Віталь Карніловіч. Нечаканкай стаўся посьпех навічкоў — каманды магілёўскага Беларуска-расейскага ўнівэрсытэту (4-е месца). Яўнымі аўтсайдэрамі выглядалі курсанты Вайсковай акадэміі, што прадулі ўсе матчы.

На асабістых чэмпіянатах краіны ў паветры заўжды адчуваецца напружаньне і «ажыятаж» (дзякуй за слоўца «Спартовай панараме»). Атмасфэра ў БНТУ, нягледзячы на цісканіну, была зусім іншай, разьняволенай. Мажліва, і таму, што прызы ў матэрыяльным вымярэньні цяжка назваць дужа каштоўнымі: кубак ды граматы ад фармальнага апекуна — Міністэрства адукацыі, усё тыя ж дарожныя сумкі ад непасрэдных арганізатараў. Ініцыятыва аднаўленьня штогадовых унівэрсіяд ішла ў другой палове 1990-х «зьнізу», ад трэнэраў зь менскіх ВНУ. Цяпер Анатоль Аліпаў — скарбнік Беларускай фэдэрацыі шахмат, галоўны судзьдзя турніру — шкадуе, што яго супольнасць мала ўвагі надае разьвіццю гульні ў навучэнскім асяродзьдзі. «Студэнты — эліта нашага грамадзтва, — кажа ён, — а шахматы — найлепшы пробны камень для мазгоў эліты, недарагі від спорту».

Налета арганізатарам карціць павялічыць лік гульцоў у кожнай камандзе з чатырох да шасьці, аддаўшы дзьве дошкі прыгожаму полу. Ідэя файная, адно што масавасьць пацягне зьніжэньне якасьці партый. Яшчэ важна, каб каманда-пераможца мела пэрспэктывы ўдзелу ў замежных спаборніцтвах. Аднак жа ніхто пакуль не гатовы фінансаваць ваяжы беларускіх шахматыстаў на сусьветную ці эўрапейскую ўнівэрсіяды.

**Вольф Рубінчык**

## Як бы вы згулялі?



**М. Гінзбург (кмс, БДЭУ) – С. Азараў (мг, БДУФК). Ход белых.**

**Адказ:**

1. Сd6+! Крf7 (1...Крd6 2. Фf6+ Крd7 3. Ке5+ Крс8 4. Сb5 Кb5 5. Фс6+ Кс7 6. d6) 2. Ке5+ Крg7 3. Сf8+! і белыя выйгралі.

ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

## Пятніца, 15 красавіка

**БТ, 13.20**

«Жаўнеры Італіі».

Беларусь, 2004, рэж. Анатоль Алай.

Дакумэнтальны фільм.

Рэжысэр Анатоль Алай — цікавы і ўдумлівы беларускі дакумэнталіст. Ягоны дэбют «Ня плачце па мне» пра мастака Аляксандра Ісачова адразу прыцягнуў да сябе ўвагу. Карціна «Салдаты Італіі» гэта гісторыя каханьня беларускі й італьянскага ваеннапалоннага ў акупаваным Менску.

**«Лад», 22.20**

«Лэдзі Макбэт Мцэнскага павету».

Расея, 1989, рэж. Раман Балаян.

Драма паводле нарыса клясыка расейскай літаратуры Мікалая Ляскова.

Жарсьць купчыхі Кацярыны Ізмайлавай (Натальля Андрэйчанка) да прыказчыка Сяргея (Аляксандар Абдулаў), якая прыводзіць да злачынстваў і сьмерці. Зьвярніце ўвагу на наймысныя зьмены танальнасьці ў карціне, на выбітную апэратарскую працу Паўла Лебешава, на атмасфэру, інтанацыі і акторскую гульню.

## Субота, 16 красавіка

**НТВ, 19.50**

«Варашылаўскі стралок».

Расея, 1999, рэж. Станіслаў Гаварухін.

Крымінальна-публіцыстычная драма.

Пэнсіянэр Іван Фёдаравіч (Міхаіл Ульянаў) страціў надзею на закон і дзяржаву ды самастойна помсьціць нягоднікам, якія зґвалтавалі ягоную ўнучку. У руках кілішняга варашылаўскага стралка снайпэрская вінтоўка — страшная зброя.

Карціна цікавая не рэжысурай дэпутата расейскай Дзярждумы Станіслава Гаварухіна (чые творчыя дасягненьні засталіся ў далёкім мінулым), не ігрою Міхаіла Ўльянава (прафэсійнай, але стомленай) — але настроем разгубленасьці й рэваншу. Беларусь тут была першай — адпаведны фільм «Сын за бацьку» (1995) маніфэставаў новы-стары палітычны рэжым. Помста пэнсіянэра прывечаная прызамі і на постсавецкіх фэстывалях.

**БТ, 23.10**

«Сапраўднае каханьне».

ЗША, 1993, рэж. Тоні Скот.

Крымінальны баявік, мэлядрама, камэдыя.

Гандляр коміксамі Кларэнс (Крысьціян Слэйтэр) і прастытутка Алабама (Патрыцыя Аркет) кахаюць адно аднаго. Яны жэняцца і ўцякаюць на мядовы месяц у Каліфорнію, прыхапіўшы ў дэтройцкіх гангстэраў наркотыкаў на пяць мільёнаў даляраў. Але крутым гаспадарам тавару такі «вясельны падарунак» далёка не даспадобы.

Сцэнар фільму напісаў Квэнцін Таранціна, так што постмадэрніцкія жартачкі й празьмерная колькасьць трупаў карціне гарантаваныя. У фільме здымаліся знакавыя акторы Дэніс Хопэр, Вэл Кілмэр, Гэры Олдмэн, Брэд Піт, Сэмюэл Джэксан.

Але Тоні Скот саступае Дэвіду Лінчу, карціну якога «Дзікія сэрцам» і нагадвае «Сапраўднае каханьне».

**СТВ, 23.40**

«Джэніс і Джон».

Францыя—Гішпанія, 2003, рэж. Сэмюэль Бэншэтры.

Камэдыя.

У страхавога агента Пабла (Сэржы Лопэс) сур'ёзныя фінансавыя праблемы. Грошы ёсьць у кузэна Леона (Крыстафэр Ламбэрт), але ён зьехаў з глузду на рок-музыцы шасьцідзясятых. Тады Пабла падгаворвае жонку Брыжыту (Мары Трэнціньян) сыграць ролю Джэніс Джоплін, а беспрацоўны актор Уолтэр (Франсуа Клузэ) становіцца Джонам Ленанам.

Уваскрэслым рок-зоркам тэрмінова патрабуюцца грошы на новы альбом. Вось толькі зоркі гэтыя выходзяць з-пад кантролю.

Кіно прадстаўленае ў рубрыцы «Арт-хаўс».

## Нядзеля, 17 красавіка

**СТВ, 15.35**

«Восеньскі марафон».

Расея, 1979, рэж. Георгі Данэлія.

Трагікамэдыя, мэлядрама.

Стомлены й сымпатычны эгаіст Бузыкін (Алег Басілашвілі) ня здольны абраць ані жонку (Натальля Гундарава), ані палюбоўніцу (Марына Няёлава). Жыцьцё — гэта лірычны восеньскі марафон, спачуваньне, сьмех і сьлёзы гледачоў — і глыбінная чалавечнасьць і такт Георгія Данэліі.

**СТВ, 22.10**

«Дзявятая брама».



ЗША—Францыя—Гішпанія, 1999, рэж. Раман Паланскі.

Містычны трылер паводле раману Артура Пэрэз-Рэвэрты «Клюб Дзюма».

Знаўца кніжных рарытэтаў і пірат падпольнага рынку Дзін Корса (Джоні Дэп) наняты заўзятарам сатанізму Борысам Болканам (Фрэнк Лангела), каб правярыць сапраўднасьць старажытнага фаліянту. Па легендзе кніга «Дзевяць брамаў у царства прывідаў» складзена з удзелам самога д'ябла і Корса, які спачатку верыць толькі ў рахунак на чэкавай кніжцы, сутыкаецца зь містычнымі зьявамі — а колькасьць трупаў вакол яго імкліва расьце.

Паланскі з выключным майстэрствам творыць атмасфэру загадкавага й містычнага, так што й непатушаная цыгарэта становіцца маніфэстацыяй інфэрнальных сілаў. Джоні Дэп — маргінальна-інтэлектуальны, Лена Олін (у ролі сатаністкі Тэфлер) арыгінальная й калярытная, а зеленавокая Эмануэль Сэнье — дэманіца-ахоўнік — небясьпечная, таямнічая і бязьвінна-разбэшчаная.

Нельга не адзначыць і найвыдатнейшай музыкі Война Кілара.

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

### Беларускія Атлянтыды

У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны. 47) **да 21 красавіка** дзейнічае выстава жывапісу «Беларускія Атлянтыды». Квіткі: 2 000 руб.

### Рэха-арт

У мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) **да 24 красавіка** — выстава «Рэха-арт». Удзельнікі выстаўкі — маладыя мастакі, аб'яднаныя ў творчую суполку «Reha-art», якая ўзьнікла спачатку ў віртуальнай прасторы — на сайце «Rehaart.narod.ru». Сёньня яна налічвае пад дваццаць аўтараў, што працуюць у розных стылях і тэхніках, нават займаюцца музыкай. На выставе прадстаўлены жывапіс, акварэль, саломапляценьне, кераміка, графіка.

### Бістро

**Да 15 красавіка** ў павільёне НВЦ «Белэкспа» (пр-т Машэрава, 14) дзейнічае выстава «Бістро», дзе можна наведаць салёны «Летняя кавярня» і «Сучасная крама».

### Піва ўсім ня хопіць

Тамсама (пр-т Машэрава, 14) **15 красавіка —** апошні дзень Міжнароднай спэцыялізаванай выставы «Піва, віны і напоі». Культурная праграма складаецца з конкурсу-дэгустацыі піва, він і лікёра-гарэлачных вырабаў.

### Адпачынак-2005

**З 14** да **17 красавіка** ў павільёне НВЦ «Белэкспа» (вул.Я.Купалы, 27) пройдзе VIII Кірмаш турыстычных паслуг «Адпачынак-2005».

### Будаўніцтва і рамонт

**З 19 да 22 красавіка** ў выстаўным павільёне на Машэрава, 14 — XIII Спэцыялізаваная выстава «Будаўніцтва і рамонт», а таксама выставы «Добраўпарадкаваньне» і «Вада і цяпло».

### Утульнасьць дому

**З 15 красавіка да 29 траўня** ў Менскім абласным цэнтры народнай творчасьці (вул.Гікалы, 4) працуе выстава лозапляценьня «Ўтульнасьць вашага дому». На выставе прадстаўлены працы з Наваполацку, Браслава, Гомелю.

### Chinese Musical Instruments

**Да 22 красавіка** ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры (вул. К.Маркса, 12) можна чарговы раз наведаць выставу кітайскіх музычных інструмэнтаў. Квіткі: 2 000 руб.

## ІМПРЭЗЫ

### «Kriwi»

**21 красавіка** ў Доме літаратара (ст.м.«Пл.Перамогі», вул.Фрунзэ, 5) адбудзецца вялікі канцэрт легендарнага беларускага гурту «Kriwi» (Менск), прадстаўніка моднай плыні *world music*. Праграма будзе складацца з найлепшых песень яго эпахальных рэлізаў «Гэй лёлі!», «За туманам», «Людзям», «Менск—Бэрлін». Пачатак а 19-й. Квіткі: 9 000 — 12 000.

### Бардаўскі фэстываль

I Міжрэгіянальны (VII Гарадзкі) гомельскі фэстываль аўтарскай песьні пройдзе **15—17 красавіка** ў Гарадзкім цэнтры культуры Гомелю (вул. Ірынінская, 16). **15 красавіка** а 19-й адбудзецца адкрыцьцё фэстывалю, а **17 красавіка** а 16-й гадзіне пачнецца заключны гала-канцэрт.

### Фатакрос

**23 красавіка** — фатакрос. Старт аб 11-й у Аляксандраўскім сквэры (Панікоўка), фініш а 17-й у клюбе «Step» (Прытыцкага, 62). Рэгістрацыя камандаў сканчаецца 22 красавіка а 18-й на сайце http://www.photocross.by.

### Фэстываль старадаўняй культуры

**23—24 красавіка** ў памяшканьні Моладзевага тэатру эстрады (вул.Маскоўская, 18а) адбудзецца фэстываль старадаўняй культуры. У праграме майстар-клясы па навучаньні эўрапейскім сярэднявечным танцам XV—XVI ст. ад школы старадаўняга танцу «Bassdance» (Менск) і прыдворнага балету «Ardente sole» (Кракаў, Польшча). Кульмінацыяй стане выступ групы гістарычных танцаў «Ardente sole» (Кракаў) — «Легенда пра каралеву Ядвігу» і «Маскарад каралевы Боны».

## ТЭАТРЫ

### Опэра

**14** (чц) — «Царская нявеста».
**21** (чц) — «Трубадур».
**23** (сб) — «Мадам Батэрфляй».
**24** (ндз) — «Кармэн».

### Купалаўскі тэатар

**14** (чц) — «Каханьне ў стылі барока».
**15** (пт) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**16** (сб) — «Падступства і каханьне».
**17** (ндз) — «Ромул Вялікі».
**18** (пн) — «Таполевая завея».
**20** (ср), **21** (чц) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**22** (пт) — «Памінальная малітва».
**23** (сб) — «Чалавек».
**24** (ндз) — «СВ».

**Ранішнія спэктаклі**
**17** (ндз) — «Паўлінка».
**24** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».

**Малая сцэна**
**15** (пт) — «Адчыніце кантралёру!».
**16** (сб) — «Баляда пра каханьне».
**18** (пн) — «Налу».
**24** (ндз) — «Дом, дзе сьпяць прыгажуні».

### Тэатар беларускай драматургіі

**14** (чц) — «Песьні ваўка».
**15** (пт) — «Адэль».
**16** (сб) — «Палёты з анёлам».
**17** (ндз) — «Толькі дурні сумуюць».
**19** (аўт) — «Парадоксы жарсьці».
**20** (ср) — «Містэр розыгрыш».
**21** (чц) — «Валянціна».
**22** (пт) — «Кабала сьвятош».
**23** (сб) — «Жанчыны Бэргмана».
**24** (ндз) — «Чарнобыльская малітва».

### Тэатар імя Горкага

**14** (чц) — «Ваўкі і авечкі».
**15** (пт) — «Сон дзядзькі».
**16** (сб) — «Анджэла і іншыя».
**17** (ндз) — «Перад заходам сонца».

### Музычны тэатар

**14** (чц) — «Капялюш Напалеона».
**15** (пт) — «Ноч у Вэнэцыі».
**16** (сб) — «Дарагая Памэла».
**17** (ндз) — «Марыца».

### Моладзевы тэатар

**14** (чц) — «Банкрут».
**15** (пт) — «На вачах у жаночай берагавой аховы».
**16** (сб) — «Акадэмія сьмеху».
**17** (ндз) — «Пігмаліён».

### Тэатар-студыя кінаактора

**14** (чц), **15** (пт) — «Выкраданьне Алены».
**16** (сб), **17** (ндз) — «Мы ідзём глядзець Чапаева».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

### Bronx (288–10–61, gsm velcom: 103 і 105)

**14** (чц), 22.00 — dj Sunshine (Санкт-Пецярбург).
**15** (пт), 22.00 — «Madera Hard Blues»; dj Dust.
**17** (ндз), 17.00 — нядзельны кінасэанс.

### Белая вежа (284–69–22, 239–16–00)

**14** (чц), 23.00 — «White Tower Party»: dj Oleg Ojo (Масква), dj Grizzly, dj Top.
**15** (пт), 23.00 — dj Mihel, dj Alex.
**16** (сб), 22.00 — жывая музыка: «Acoustic Band»; dj Mihel, dj Dee.
**17** (ндз), 23.00 — «Gold Party»: dj Alex, гіты 1960—1990-х.

### Ізюм (206–66–18)

**14** (чц), 23.00 — dj Induss, «R`N`B Dance Couples».
**15** (пт), 23.00 — «Love party»: dj Mitya, dj Lexa.
**16** (сб), 23.00 — «Fusion dance»: dj Grizzly, dj Lexa.
**17** (ндз), 10.00 — «Pretty Sunday».

### Акварыюм (671–58–65)

**15** (пт), 18.00 — Другі рэгі-фэстываль.

### Графіці (8–029–6937416, 280–01–54)

**20** (ср), 20.00 — вечар джазавай музыкі.
**21** (чц), 20.00 — вечар аўтарскай песьні.

### Рэактар (228–61–60, 268–61–07)

**22** (пт), 19.00 — «Garadzkija». З удзелам гуртоў «Pete Paff» і «Krok».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**МАСТАЦТВА ЎКЛАДАЦЬ ГРОШЫ. 24 красавіка а 15-й у памяшканьні Тэатру Беларускай драматургіі (вул.Крапоткіна, 44) пройдзе аўкцыён-продаж твораў сучаснага мастацтва. Сэнс гэткіх імпрэзаў — навучыць тых, хто ўжо мае грошы, траціць іх з карысьцю для айчыннага мастацтва. Такое даецца цяжка: прэстыжныя аўто пакуль каштуюць даражэй за творы беларускіх мастакоў. На фота — перадаўкцыённая выстава.**

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Званок-2»***: **15** (пт) 21.10; **16, 17** (сб, ндз) 14.00, 21.10.
«Правілы здыманьня: Хітчаў мэтад»: **15** (пт) 16.20, 18.40; **16, 17** (сб, ндз) 11.40 (іл), 16.20, 20.40.
«Сахара» (прэм'ера, 2с): **15** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Жаніх напракат»: **15** (пт) 18.50 (іл); **16, 17** (сб, ндз) 14.00 (іл), 18.50.
«Званок-2»***: **15** (пт) 21.10; **16, 17** (сб, ндз) 16.30, 21.10.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Турэцкі гамбіт» (2с): **15—17** (пт—ндз) 16.00 (іл), 18.30, 21.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Сахара» (прэм'ера, 2с): **15** (пт) 16.10, 18.40, 21.10; **16, 17** (сб, ндз) 13.40 (іл), 16.10, 18.40, 21.10.

**«Масква»** (203-14-48)
«Сахара» (прэм'ера, 2с): **15—17** (пт—ндз) 14.00( іл), 18.40, 21.10.

**«Мір»** (288-22-33)
«Турэцкі гамбіт» (2с): **15—17** (пт—ндз) 16.00, 18.20, 20.40.
«Званок-2»***: **15—17** (пт—ндз) 19.00.
«Жаніх напракат»: **15** (пт) 17.00 (іл), 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 17.00, 21.00.

**«Перамога»** (203-77-66)
«Правілы здыманьня: Хітчаў мэтад»: **15** (пт) 13.50, 18.40; **16, 17** (сб, ндз) 13.50 (іл), 18.40.
«Бой зь ценем»***: **15—17** (пт—ндз) 16.10, 21.00.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Блэйд: тройца»***: **15—17** (пт—ндз) 17.00, 21.00.
«Трое ў каноэ»: **15—17** (пт—ндз) 15.00, 19.10.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Турэцкі гамбіт» (2с): **15** (пт) 11.00, 13.20, 15.50, 18.30, 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.30, 16.00, 21.00.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

### Тэатар юнага гледача

**14** (чц), **20** (ср), **23** (сб) — «Апошняя дуэль».
**14** (чц) — «Рыцар Ордэну Сонца» (экспэрымэнтальная сцэна).
**15** (пт) — «Маленькія трагедыі».
**15** (пт) — «Каліф-шавец» (экспэрымэнтальная сцэна).
**16** (сб) — «Сястра мая Русалачка».
**17** (ндз) — «Шлях на Бэтлеем».
**22** (пт) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі».
**24** (ндз) — «Паліяна».

### Опэра

**24** (ндз) — «Кот у ботах».

### Тэатар беларускай драматургіі

**16** (сб) — «Воўк-мараплавец».
**17** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**24** (ндз) — «Хрустальны туфлік».

### Музычны тэатар

**16** (сб) — «Залатое кураня».

### Кіно для дзяцей

**«Аўрора»**
«Гарэзы»: **15** (сб) 14.30; **16, 17** (сб, ндз) 11.30.

**«Берасьце»**
«Вам — заданьне»: **15** (пт) 15.00.
«Шрэк»: **16, 17** (сб, ндз) 11.50.

**«Дружба»**
«Супэрсямейка»: **15** (пт) 14.00; **16, 17** (сб, ндз) 13.00.
«Самсон і Салі»: **15** (пт) 12.00; **16, 17** (сб, ндз) 11.00.

**«Масква»**
«Пінокіё-3000» («Выхадны — усёй сям'ёй!»): **17** (ндз) 12.00.

**«Мір»**
«Маленькія ўцекачы»: **15—17** (пт—ндз) 14.30.
«Чатыры таксісты і сабака»: **15—17** (пт—ндз) 15.00.

**«Перамога»**
«Гарфілд»: **16, 17** (сб, ндз) 12.00.

**«Піянер»**
«Кевін у Краіне драконаў»: **15—17** (пт—ндз) 11.25.
«Прадвесьнікі буры»: **15—17** (пт—ндз) 13.10.
«Маленькая чараўніца» і іншыя мультфільмы: **16, 17** (сб, ндз) 10.00.

## КІНО НА DVD

MASTER RECORDS

### «Вечнае каханьне»

Драма, Вялікабрытанія, 2004, рэж**. Роджэр Мічэл.**
У ролях: **Дэніэл Крэйг, Саманта Мортан, Рыс Айфанс.**
Пасьля трагічнага выпадку Джо перасьледуе чалавек, які бачыць у падзеях тайны сэнс…

### «Брунатны трус»

Драма, ЗША—Японія—Францыя, 2003, рэж. **Вінсэнт Гало.**
У ролях: **Вінсэнт Гало, Хлоя Сэвіны, Шэрыл Цігс.**
Матагоншчык ня здольны забыць сваю каханую. Але вярнуць яе ўжо немагчыма… Фільм — намінант Канскага фэстывалю. Прыз «Фіпрэсі» Вінсэнту Гало.
**Менск, Кісялёва, 12, т. 643-21-08.**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Кашмарныя працягі страшных фільмаў

Страшная карціна «Званок» Хідэа Накаты пра праклён відэакасэты прыцягнула ўвагу да японскай містыкі, спарадзіўшы масу перайманьняў і працягаў. Сам Наката паставіў на радзіме і «Званок-2» — годны й жудасны фільм-працяг.

Але фільм, які сёньня дэманструецца ў нашым пракаце, іншы, хоць яго рэжысэр сп.Наката. Гэта амэрыканская вэрсія містычных падзей з амэрыканскімі акторамі ды амэрыканскімі пэйзажамі — і да таго ж працяг амэрыканскага «Званка» Гора Вэрбінскі.

Перанос японскіх духаў на амэрыканскую глебу атрымаўся спрошчаным, хаця й страшным.

У фільме помсьлівы дух Самары імкнецца засяліцца ў сына Рэйчэл (Наомі Ўотс) — так што герояў чакае яшчэ адно выпрабаваньне і апошні (?) бой з прывідам.

Найлепшыя моманты карціны пазычаны ў японскага арыгіналу — цёмныя й халодныя воды, здань, як малпа, паўзе па студні, цёмныя валасы. Ёсьць і мясцовыя рэаліі — атака аленяў на аўтамабіль (прывітаньне «Твін Піксу» і «Омэну»), цела ў мяшку для трупаў — раптоўнае ажыўленьне выклікае ў аўдыторыі жуду й сьмех.

У эпізадычнай ролі зьнялася Сісі Спэйсэк — калярытная зорка фільму «Керы».

«Званок-2» («The Ring Two»)
ЗША, 2005, каляровы, 111 хв.
**Жанр:** містычны фільм жахаў
**Адзнака:** 5,5 (з 10)



WWW.MOVIWEB.COM

Але збольшага сёньняшні «Званок-2» — гэта старанная амэрыканская халтурка таленавітага рэжысэра. Праўда, і гэтае рамесьніцтва здольнае напалохаць.

«Блэйд: тройца» («Blade: Trinity»)
ЗША, 2004, каляровы, 113 хв.
**Жанр:** вампірскі баявік-комікс
**Адзнака:** 4 (з 10)

Вампіры, на якіх палюе супэргерой Блэйд (Уэсьлі Снайпс), ніяк не супакояцца. У сырыйскай пустэльні крывасмокі выкапалі найпершага вампіра — Дрэйка — і зь ягонай дапамогай мараць жыць і ўначы, і днём (і пазбавіцца Блэйда). Акрамя таго, Блэйд выпадкова забівае чалавека — і цяпер за ім ганяецца паліцыя.

Кампанію Блэйду ў гэтай карціне складаюць Начныя Сталкеры з арбалетамі і вірусам супраць вампіраў.

Фільм — дынамічны й пусты баевічок, дзе выніковай зброяй становіцца капсула зь вірусам. Паганыя зяпы з другой часткі фільму перавандравалі ў «Тройцу» — як сківіцы свойскіх сабачак і Дракулы; меч (не зусім і патрэбны), плашч і прычоска — з часткі першай і саміх коміксаў.

Скаргі аднаго Сталкера на вампірыху з зубастай вагінай і задушэўныя сваркі са старой сяброўкай амаль парадыйныя. Але напад вампіраў на сьляпую — страшнаваценькі.

«Блэйд» выдыхаецца, але фінал фільму прадугледжвае працяг.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Мне гэта падабаецца!

На 50-годзьдзе стварэньня кампаніі «Макдональдс» і да праблемы інвэстыцыйнай прывабнасьці краіны. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Прыблізна дзесяць гадоў таму на Захадзе зьявіўся пазнавальны талмуд Джорджа Рытцэра «Макданальдызацыя грамадства». Аўтар даводзіў, што «Макдональдс» — гэта ня проста банальная тавэрна-паб, а новая працоўная мадэль накшталт фардызму, пабудаваная на максымальнай рацыяналізацыі вытворчасьці (напрыклад, працоўная культура ў «Макдаку» ўключае ў сябе татальны перавод супрацоўнікаў на кантракты, патагонную сыстэму і фактычную забарону прафсаюзнай дзейнасьці).

Больш за тое, гэтая этыка эксплюатацыі паступова выходзіць за межы чыста гастранамічна-кулінарнай індустрыі. Рытцэр маркуе, што «макданальдызацыя» — гэта працэс, у выніку якога прынцыпы арганізацыі працы рэстарану хуткага харчаваньня пачынаюць дамінаваць ва ўсіх сфэрах амэрыканскага грамадзтва, а затым і ва ўсім сьвеце. Напрыклад, за акіянам існуюць нават газэты-«макдональдсы» накшталт «USA Today».

З часам самі нацыянальныя дзяржавы ператвараюцца ў гештальт забягайлавак, якія канкуруюць на міжнародным рынку паслуг. З той розьніцай, што іх спажыўцамі-наведвальнікамі становяцца не замбаваныя рэклямай кіндэры, а інвэстары. Апошнія выбіраюць, куды пайсьці, каб аддаць (інвэставаць) грошы таньней, каб задаволіць нейкія свае забабоны.

Рытцэрава тэорыя вельмі прыкольная, але, на маю думку, мае значны прабел. Яна не разглядае функцыянальнай ролі блазна Роналда ў маркетынгавай палітыцы кампаніі. Хто такі прыдуркаваты Роналд? Усім вядома, што Роналд — сымбаль кампаніі, які сваім выглядам і паводзінамі павінен выклікаць станоўчы вобраз брэнду, забясьпечваючы прыток кансумэраў.

Гэтай мэты Роналд дасягае, вонкава пазыцыянуючы сябе як нейкі напаўдэбіл. Але пры гэтым ён чамусьці стварае падмурак прывабнасьці фірмы. Чаму? Таму што ў спажыўцоў пры позірку на рыжавалосага клоўна ў ботах складаецца ўяўленьне: «Макдональдс» — тусоўка лахоў, якія ня здольныя цябе кінуць. Але насамрэч кідаюць.

Ці не з паяца Роналда мы павінны ляпіць шаблён палітыкаў наступнай генэрацыі? Прымітывізацыя палітычнай дыскусіі — гэта тое, чаго вымагае сусьветная эканамічная каньюнктура. І тысячу разоў маюць рацыю нашы ўлады, не дазваляючы, каб сымбалямі нацыі сталі прафэсары Шушкевіч, Багданкевіч або яйцагаловыя інтэлектуалы накшталт Манаева, Раманчука і Коласа.

Беларусі патрэбны Роналды! Нам патрэбен імідж краіны, які забясьпечыць сталы прыток інвэстыцый. Яго гарантуюць палісімэйкеры, якія на ўсе імпульсы звонку будуць рэагаваць адной фразай: «Мне гэта падабаецца!» І кропка.

Краіна чакае свайго Роналда. Ці ён ужо прыйшоў?

**Лёлік Ушкін**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Белпоп нон-стоп. Старонка 12.**

**Запрашаем у падарожжа**

**17 красавіка** (нядзеля)
па маршруце: **Менск—Лагойск—Жардзяжжа—Амнішава—Ваўкалата—Параф'янава—Сітцы—Порплішча—Будслаў—Даўгінава—Каменa—Менск**. 20000

**24 красавіка** (нядзеля):
**Сялец—Быцень—Бяроза—Закозень—Бусяш—Альба—Белавічы—Новыя Пескі—Сігневічы—Стрыгінь**. 23000

**8—9 траўня**:
**Вільня—Трокі—Меднікі**. 35 эўра

**13—16 траўня**:
**Львоў і замкі**. 35 эўра

Т.: 379-05-85, 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

## Удакладненьне

У «НН» №13 на старонцы 3 у паведамленьні «Шэсьць год без Карпенкі» апошнюю фразу трэба чытаць: «Затрымалі Марыну Багдановіч, якая ўзяла адказнасьць за акцыю на сябе».

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Бацьку Сямёна** і **дзядзьку Аляксандра** віншуем з народзінамі. Зычым добрага настрою, моцнага здароўя і аптымізму. Сям'я Печанкоў

### КАНТАКТЫ

**МГА «Гісторыка» запрашае:** у сераду 20 красавіка а 18-й у рамках адзначэньня Міжнароднага дня помнікаў і памятных мясьцін на гістфаку БДУ (вул.Чырвонаармейская, 6, аўд. №44) адбудзецца выступ Уладзімера Папругі, галоўнага інспэктара Менгарвыканкаму па ахове гісторыка-культурнае спадчыны, на тэму **«Захаваньне гісторыка-культурнае спадчыны Менску»**.

**Прашу парады ў знаўцаў** і аматараў паэзіі — калі лепш было б праводзіць **сьвята вольнай беларускай паэзіі** сёлета ў Ляўках: з 25 на 26 чэрвеня ці з 9 на 10 ліпеня? buongiorno@tut.by, Віктар

**Куплю ўзнагароды** БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай, фота ваенных (Беларускія нацыянальныя фармаваньні часоў 2-й сусьветнай вайны). zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай, — набуду. zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

### КНІГІ

**Шукаю даваенную** шахматна-шашачную літаратуру, у тым ліку пэрыёдыку. Чытач з Расеі. kirill_urusov@mail.ru

**Буду ўдзячны таму**, хто прадасьць 4-ты том «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі». Т.: 288-14-52, 328-56-78. Аляксей

**Прадам кнігі**: Ю.Туронак, «Беларусь пад нямецкай акупацыяй»; К.Акула, «Змагарныя дарогі»; Я.Чачот, «Навагрудзкі замак»; «К.Каліноўскі» з сэрыі «Беларускі кнігазбор», «Я.Карскі», «Беларускі арнамэнт», багаты выбар кніг па гісторыі, архітэктуры, мовазнаўстве, этнаграфіі. Т.: 753-70-05

**Прадам кнігі**: Я.Сямашка, «Армія Краёва»; А.Вініцкі, «Матэрыялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне»; В.Грыцкевіч, «Гісторыя і міты»; Я.Запруднік, «Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях»; Л.Геніюш, «Ад родных ніў», факс. 1942 г., Прага, ды інш. Т.: 753-70-05

**«Дуліна ад Барадуліна»**, кнігі «Беларускага кнігазбору», «Вялікалітоўска-расейскі слоўнік» Яна Станкевіча, «Беларуска-расейская вайна» Зянона, іншыя кнігі, слоўнікі, відэа, аўдыё, CD, значкі на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (13:00—19:00). Т.: 707-40-01

### ПАКОЙ

**Студэнтка** здыме пакой у Менску на час іспытаў (канец траўня — першая палова чэрвеня). Т.: 616-96-29

**Два браты** (першы — студэнт БДУ, другі — інжынэр) здымуць адна-двухпакаёвую кватэру ў р-не Паўднёвы Захад ці вул.Маякоўскага (Зьміцер, т.: 755-03-70)

### ПРАЦА

**Для вясельля**, канец красавіка, патрэбныя адзін—тры музыкі, якія граюць старадаўнюю беларускую музыку XV—XIX ст. Т.: 342-12-97 (Тацяна)

Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Аўтарцы «Цэнзуры inside».** Задума праалізаваць, якая літаратура знаходзіць сабе месца на старонках «НН», а якая не, — вартая. Пачніце з статыстычнага аналізу: колькі аўтараў, колькі беларускіх, колькі замежных, колькі жанчын, колькі мужчынаў, геаграфія аўтараў, у якіх жанрах яны пішуць. Гэта дасьць матэрыял для аналізу. Тады перайдзіце да меркаваньняў літаратараў, аднак стаўцеся крытычна да іхных словаў і апытайце творцаў розных плыняў. (Вось Вы апыталі толькі аднаго рэспандэнта, і ў Вас і выйшла, што Маркес і Арлоў пішуць «нізкапробныя» творы.) Урэшце Вам змалюецца суцэльная карціна, і напросяцца высновы зь яе. Аналіз нашанiўскае літаратуры падвядзе Вас да высноваў аб літаратурным працэсе ўвогуле. Спору ў працы.

Цытуючы Ластоўскага, не забывайцеся, што Ластоўскі сыходзіў ня толькі з эстэтычных, але і з ідэалягічных, палітычных меркаваньняў. Ігнараваньне гэтага вядзе да памылковых інтэрпрэтацый.

**Зьмітру П. з Кастрыцы.** Не паддавайцеся на спакусу рабіць матэрыялы паводле даступных усім крыніцаў. Лепей скарыстайцеся становішчам: наведайце блізкі Барысаў, сустрэньцеся з гульцамі ці трэнэрамі БАТЭ і пагутарце зь імі пра чэмпіянат. Такі артыкул надрукуем з прыемнасьцю.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3457. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 20.00 13.04.2005.
Замова № 2083.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а